ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №1 (89) (студзень)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс

ЮБІЛЕЙ

ТАЛЕНТ І МУЖНАСЦЬ КРЫТЫКА

ДЗМІТРЫЮ БУГАЁВУ — 85!

Калі глядзець на ўнушальны шматтомнік «Беларускія пісьменнікі», паволі гартаць яго, учытваючыся ў велізарную бібліяграфію на кожнае прозвішча, не-не ды і скажаш сабе: вось жа, рабілі людзі літаратуру — планамерна, штодзённа і без выходных. Разам з тым, і прозвішчы літаратараў, складзеныя ў роўныя алфавітныя заканамернасці, штурхаюць да таго, каб спрацідць усё і сказаць: нічога вартага ў гэтай савецкай літаратуры не было — адны штампоўшчыкі, «паглынальнікі пустотаў», якімі і запоўненыя, пад выглядам мігатлівых спасылак, тамы даведнікаў.



Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў, чыё 85-годдзе адзначалася 12 студзеня, — сведка некалькіх эпох. Пасталеўшы ў сталіншчыне і вайне, ён пераўжыў надзеі «адлігі» і безнадзейнасць «застою», дэмакратычна-адраджэнскі час і апынуўся разам з усімі намі ў новым застойным перыядзе, які, трэба думаць, таксама не бясконцы.

Ва ўсе часы была ў яго магчымасць выбару, і тое, што сёлета мы гаворым пра Бугаёва з павагай і ўшаноўваем ягоную спадчыну, сведчыць пра слушнасць таго выбару, які рабіўся цягам застойна-надзейнай «цераспалосіцы» і які, урэшце, дапамог апраўдацца і пасляваеннаму беларускаму літаратуразнаўству і крытыцы.

Якое б тысячагоддзе не стаяла за вакном, Дзмітрый Бугаёў рабіў стаўку на шчырую працу, даследаванне лепшага ў бягучым літпрацэсе і актуалізацыю спадчыны. Сёння, як гэта ні абсурдна, даволі лёгка можна ўявіць, якой смеласцю было — займацца ў 1950-я і 1960-я гады творчасцю пісьменнікаў даваеннай пары, творчасцю былых палітзняволеных, па сутнасці. Далёка не кожны літаратуразнаўца наважваўся на гэта: сталінскія кадры працягвалі працаваць і ў апараце кампартыі, і ў кіраўніцтве акадэмічнай навукай, ды і ў асяроддзі самога Саюза пісьменнікаў. Тым не менш, для Дзмітрыя Якаўлевіча, чый бацька ў 1936-м не вярнуўся пасля чарговага арышту, падобны выбар быў натуральны. Ён ведаў вартасць таго часу і не меў наконт яго ніякіх ілюзій. Але ў адкрытую гаварыць праўду пра сталінскія зверствы ён не мог. Сёй-той сказаў бы сёння: дык навошта тады было ісці на кампрамісы, пісаць пра «асобныя недахопы», «пэўныя памылкі» і г.д.? Можна адказаць з усёй пэўнасцю: таму што іначай гаварыць пра рэпрэсаваных пісьменнікаў было нельга. Так, абстрактна-апісальны стыль, агульныя словы, і ў той жа час — зерне біяграфічных дадзеных, аналіз твораў, ачышчэнне іх ад вульгарна-сацыялагічных наносаў і, у выніку, — выданне манаграфій і збораў твораў, пад афіцыйным акадэмічным грыфам, што імгненна, лепш за ўсякую даведку, рэабілітоўвала пісьменніка, уключала яго творчасць у фундаментальныя распрацоўкі, універсітэцкія праграмы і г.д. Так, пакрысе паўставала новая, непрыгладжаная пастановамі ЦК карціна літаратуры.

Дзмітрый Бугаёў быў адным з тых падзвіжнікаў, якія паступова, год за годам, праводзілі рэабілітацыю літаратуры 1920-х гадоў, уключалі яе шматгранную палітру ў афіцыйную акадэмічную гісторыю літаратуры. Ягоныя манаграфіі пра Уладзіміра Дубоўку (1965) і Максіма Гарэцкага (1968) і сёння чытаюцца з цікавасцю. Аналізуючы раннія апавяданні Міхася Лынькова (1963) і «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы (1971), прозу Барыса Мікуліча і Васіля Каваля (1959-1960), творчасць Платона Галавача (1973), Бугаёў перш за ўсё падкрэсліваў той нязломны пісьменніцкі характар, маральную прынцыповасць, якія, можа, не заўсёды і не ўсім нашым літаратарам былі ўласцівыя, аднак для гісторыі (і гісторыі пісьменства ў тым ліку) надзвычай важныя.

Гэтая павага і ўвага да пісьменніка з магутным унутраным стрыжнем арганічна прывялі Дзмітрыя Бугаёва да аналізу творчасці Івана Мележа і Васіля Быкава, якім крытык прысвяціў не адну кнігу і не адзін дзясятак артыкулаў. Гаворачы пра гэта, нельга забываць, што падобны выбар, асабліва ў дачыненні Быкава, быў у 1960-я гады для маладога дацэнта БДУ дужа небяспечным. Яшчэ нельга забываць, што функцыя і важкасць крытыкі ў той час была зусім інакшай, як цяпер: крытык мог паспрыяць выхаду кнігі, мог і наадварот — выштурхнуць яе разам з аўтарам на маргінэс літаратурнага жыцця. Ад кніжнага ж ганарару многія пісьменнікі залежалі наўпрост, таму звязку гэтую пакінуць і абмінуць не маглі. Добрая ці дрэнная крытыка, атрыманая кнігай, уплывала не на продажы і прэміі, як у заходніх краінах, але на агульную ацэнку кіраўнікоў выдавецтваў і, перш за ўсё, кантрольных органаў — ЦК партыі. Дзмітрый Бугаёў некалькі дзесяцігоддзяў быў часткай гэтай сістэмы, і калі пагартаць ягоныя публікацыі 1960–1980-х гадоў, можна ўбачыць, што дапамагаў ён сапраўды таленавітым і вартым аўтарам: Генадзю Бураўкіну, Анатолю Вярцінскаму, Яўгеніі Янішчыц. Ягонае добрае слова не раз было супрацьвагай чарговаму пагромніцкаму артыкулу, у якім бэсціўся Васіль Быкаў.


Перабудова і гады незалежнасці адкрылі зусім іншага Бугаёва: бескампраміснага крытыка таталітарнай сістэмы, камуністычнай утопіі, абаронцу нацыянальнага праекту Беларусі. Адкінуўшы былыя забароны, па-новаму глянуў ён на прозу Васіля Быкава ў кнізе «Праўда і мужнасць таленту», па-новаму ацаніў беларускую і расійскую літаратуру пра калектывізацыю. Крытычны погляд Бугаёва часта быў скіраваны не на паэтыку твора, а на адлюстраванне літаратурай жыцця. І наколькі вастрэйшай была праўда, выказаная пісьменнікам; наколькі меў ён адвагі назваць рэчы сваімі імёнамі, настолькі быў ён Дзмітрыю Бугаёву цікавы. Жыццё як найвышэйшая каштоўнасць — для ўсіх, не толькі для літаратара — і крутыя павароты гісторыі вабілі яго. Таму нездарма ў апошнія гады кнігі Дзмітрыя Бугаёва чытаеш як гістарычны дакумент, і нярэдка тую інфармацыю, якая ў іх змешчана, болей нідзе не знойдзеш — па той простай прычыне, што Бугаёў аказаўся адзіным сведкам і фіксатарам тых падзей і той фактуры.

«Цяпер увогуле лёгка крычаць, бо ўсё дазволена. І нічым не трэба рызыкаваць. А тады нам усім многае давалася з вялікімі пакутамі, кожная пераацэнка давалася з боем», — успамінаў у 1992 годзе Дзмітрый Бугаёў у адным з інтэрв'ю. Успомнім пра гэта і мы ў дні юбілею патрыярха нацыянальнай крытыкі, прафесара, лаўрэата... Чалавека, чыя праўда перамагла.

Ціхан Чарнякевіч

ПАЛІЦА

ОСКАР УАЙЛД. «САЛАМЕЯ»



У бібліятэцы часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum» і бібліятэцы Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка» выйшаў пераклад п'есы Оскара Ўайлда «Саламея». На беларускую мову з французскай яе пераклала Кацярына Мацiеўская. Дызайнер вокладкі — Марыя Мухіна.

Кніга апроч уласна п'есы змяшчае прадмову ад перакладчыцы, стылістычна блізкія да яе вершы прозай Оскара Ўайлда, артыкул сябра і паверніка пісьменніка, мастацтвазнаўцы Роберта Роса, які разабраў усе акалічнасці выхаду ў свет «Саламеі» і абверг звязаныя з ёй міфы, а таксама каментары і бібліяграфію ранейшых перакладаў з Оскара Ўайлда на беларускую мову. Змешчаныя ў кнізе і самыя знакамітыя ілюстрацыі да п'есы, выкананыя яшчэ адным творцам з кола Оскара Ўайлда — Обры Бёрдслі.

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ. «ЧАС SECOND-HAND»




Кніга Святланы Алексіевіч, якая была перакладзеная на многія еўрапейскія мовы і атрымала некалькі прэстыжных літаратурных прэмій, цяпер даступная па-беларуску. Твор пабачыў свет у серыі «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў.

У прадмове аўтарка піша: «За семдзесят з лішкам гадоў у лабараторыі марксізму-ленінізму выгадавалі адмысловы чалавечы тып — homo soveticus. Адны лічаць, што гэта трагічны персанаж, іншыя называюць яго «саўком». Мне здаецца, я ведаю гэтага чалавека, ён мне добра знаёмы, я побач з ім, поплеч, пражыла шмат гадоў. Ён — гэта я. Гэта мае знаёмыя, сябры, бацькі. Некалькі гадоў я ездзіла па ўсім былым Савецкім Саюзе, бо homo soveticus — гэта не толькі руская, але і беларусы, туркмены, украінцы, казахі... Цяпер мы жывем у розных дзяржавах, размаўляем на розных мовах, але нас ні з кім не пераблытаеш... »

Кніга «Час second-hand (Канец чырвонага чалавека)» закранае маштабныя гістарычныя тэмы: Вялікую Айчынную вайну, Афганістан, Чарнобыль, час «перабудовы» і развал сацыялістычнай імперыі. У творы даследуецца феномен мыслення савецкага чалавека, феномен сацыялізму і выкладаецца аўтарская канцэпцыя найноўшага часу, які пісьменніца называе «часам сэканд-хэнд».

УЛАДЗЬ ЛЯНКЕВІЧ. «70% ВАДЫ»



Філолаг, выкладчык, перакладчык, рок-музыкант... Уладзь Лянкевіч нарэшце парадаваў сваіх прыхільнікаў кнігай вершаў «70% вады». Зборнік выйшаў у серыі «Пункт адліку» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Як лаканічна пазначана ў анатацыі, кніга «ўключае адзін скразны і некалькі дзясяткаў сваіх вершаў з музыкай і без».


Уладзь Лянкевіч, несумненна, адзін з самых перспектыўных аўтараў свайго пакалення, які адначасна працуе ў некалькіх відах мастацтва і розных літаратурных жанрах.

Некаторыя з вершаў, змешчаных у зборніку, пазначаныя не традыцыйнымі «зорачкамі», а нотным знакам: гэтыя тэксты сталіся песнямі, якія ўваходзяць у рэпертуар арт-рок і псіхадэлік гурта TonqiXod [ТонкіХод], у якім Уладзь Лянкевіч з'яўляецца вакалістам і гітарыстам.

Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

ЛЮТАЎСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:



04.02.1934 — Арсень Сяргеевіч Ліс
09.02.1959 — Віктар Антонавіч Шалкевіч
12.02.1969 — Сяргей Леанідавіч Мінскевіч
15.02.1959 — Пятро Васільевіч Васючэнка
17.02.1939 — Анатоль Іосіфавіч Валахановіч
17.02.1964 — Алена Уладзіміраўна Бабоўка
Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

ВОДГУК

ГАВОРКАЙ РОДНАЮ ЗАЛІВАЎ ТУГУ

Дастаю з паліцы кнігу «Беларуская Беласточчына» (Мінск, 1973), і на старонцы 49 чытаю: «Бела. Бела. Бела і пуста. Вялізная спакуса. Дзе ж мае фарбікі? А ну, мазнем чырвонай. Гу!..». Гэта пісаў сорак гадоў таму Юрка Геніюш. Слаўны, таленавіты, мужны Юрка Геніюш — адзіны сын у бацькоў. Але ў якіх бацькоў! Маці Ларыса Геніюш — найвялікшая паэтка Беларусі, патрыётка, змагарка, вязень сталінскіх ГУЛАГаў. Бацька Янка Геніюш — доктар, выпускнік Пражскага ўніверсітэта, беларускі патрыёт, бібліяфіл, вязень сталінскіх лагераў.


Ларыса Геніюш і яе сын Юрка

Мужнасці ён вучыўся ў мамы і таты, прафесію выбраў бацькаву, а творчы талент пісаць узяў ад маці. Георгій Валкавыцкі ў сваіх «Вірах» (Беласток, 1991), прыгадваючы 1973 год, піша: «Пасля Новага года аднавіў я шыльду сваёй рубрыкі (Задрыпанка ў сонечных праменнях) і, запрыкмецўшы ў Юркі Геніюша шчадрынаўскі дух, угаварыў доктара на арэнду суседняй дзялянкі. Канкурэнт пачаў назірань «З маёй званіцы» пад фірмай «Ларс». І тут ажыў праўдзівы Гарадок (Працаваў Юрка ў Гарадку)».

Ажывалі і сябры, калі з'яўляўся Юрка Геніюш, ажывалі выданні, дзе ён друкаваўся, ажываў і беларускі Беласток. Хаця лёс Юркі Геніюша быў далёка не белым. І маюць рацыю Уладзімір Арлоў (кніга «Імёны свабоды») і Міра Лукша ў вершы «Юрка Геніюш», калі прыгадалі яго радкі: «Чаму я чорны, чаму я чорны, мамо — Хоць белы маю твар? Чаму мне вецер заўсёды ў вочы дзьме?».

Чорны вецер і вецер халодны часта дзьмулі ў твары Геніюшаў. Але яны выстаялі, не скарыліся, не паддаліся, не здаліся. Хаця ўсё ж скразной лініяй праз усю творчасць Юркі Геніюша праходзіць белы колер. Давайце прачытаем яго творы:

Зацвіла калінай родная зямля.
Белай, белай, белай — сувой палатна…

(Верш «Зацвіла калінай родная зямля…»)

Белай плямай вабіць-вабіць
Картка на стале.

(Верш «Да свету»)

Здаецца, сёння белае ўсё. Па белым свеце белыя дарогі… Белы-белы настане дзень… Ды толькі словам бела-бела беларускім прагна чакаеш, каб адгукнуўся хто…

(Абразок «Чорным па белым»)

І абразок «Запавет» таксама пачынаецца з белага колеру: «І падаў снег. І белым вершам астры ўпісалі памяць жывых над прахам небыцця…». Здаецца, і тут пра белы колер, але ён вельмі самотны, тужлівы, балючы.

Усе гэтыя разважанні прыйшлі да мяне, калі я чытаў новую кнігу ў чорнай вокладцы «Смыком па сэрцы» Юркі Геніюша. Кніга выйшла з друку дзякуючы прыватным фінансавым ахвяраванням і беларускай Інтэрнэт-Бібліятэцы Kamunikat.org. Зборнік добра ўклала і напісала сціплую прадмову Міра Лукша, а рэдагаваў выданне Віталь Луба.

Гэта найболыш поўнае выданне разнастайных па жанру твораў. Тут і проза, і паэзія, і драматургія, а таксама шмат цікавых і рэдкіх фотаздымкаў.

У першым раздзеле «У Гарадку і наваколлі» кнігі Юркі Геніюша распавядаецца якраз пра тое, аб чым некалі прасіў пісаць Юрку Геніюша Георгій Валкавыцкі. Міра Лукша выразна пачаць выданне менавіта з культурнага і працоўнага жыцця Гарадка і вёсак вакол яго, якія апісваў аўтар. Цікава чытаецца тое, аб чым аўтар паведамляў некалькі дзясяткаў гадоў таму. З кнігі мы даведваемся пра трыкатажны завод (1959–1995), пра дзяржаўнае агенцтва «Эстрада», пра фарміроўшчыка Гогаля, млынара Лапіча, пра крамы Гарадка, куды нават па тавары прыязджалі гараджане з Беластока, і шмат пра што іншае. Аўтар апісваў усё даволі цікава, шчыра, нават з нейкім светлым гумарам. Калі б і сёння падобныя нататкі з глыбінкі Беласточчыны хтосьці дасылаў, то рэдактар «Нівы» Яўген Вапа іх абавязкова друкаваў бы. Яны чытэльныя, лёгкія і невялікіх памераў. А сённяшнія чытачы не вельмі любяць чытаць вялікія тэксты, асабліва калі яны яшчэ і без фотаздымкаў…

Чытачы кнігі Юркі Геніюша «Смыком па сэрцы» даведаюцца, як жылі і чым жылі беластоцкія вёскі 30–70 гадоў мінулага стагоддзя. Аўтар у свой час пісаў пра дзеда Няўдалага з вёскі Скупавічы, які некалі пырнуў віламі нямецкага жаўнера. З кнігі мы даведаемся і пра тое, што некалі ў вёсцы Случанка вельмі дружна жылі вяскоўцы, а ў Меляшках раней смачны пяклі каравай, а ў Падазеры пачаў курсіраваць аўтобус…

Мне падабаецца, што ў кнігу Юркі Геніюша Міра Лукша ўключыла і пяць ягоных п'ес. Гэта п'есы «Хто — каго?», «Прыгоды Белага Грыба», «Зямля», «Вываражыла», «Дзіўны горад». Некалі пад адной вокладкай выходзілі п'есы Сакрата Яновіча і Юркі Геніюша. Кніга мела назву «Зборнік сцэнічных твораў» (Беласток, 1976). Я пытаўся пры жыцці ў Сакрата Яновіча, чаму ён не працягвае пісаць п'есы. На тое ён адказаў, што ніколі не збіраўся быць драматургам, а на напісанне п'ес яго натхніў і накіраваў Юрка Геніюш, таму і напісалася іх некалькі.

Друкавалася п'еса Юркі Геніюша і ў «Зборніку сцэнічных твораў» (Беласток, 1969). Гэта была бытавая камедыя «Вываражыла», якая тады нават атрымала ўзнагароду ў конкурсе БГКТ.

Што датычыць паэзіі Юркі Геніюша, дык яна своеасаблівая, не падобная на паэзію яго маці. Але сын вучыўся і спрабаваў, як пісаў Ян Чыквін, удыхнуць дух аптымізму, творчую энэргію, прывіць імунітэт непадатлівасці на чужыя вірусы, папярэджваў аб устойлівай палітыцы дэнацыяналізацыі розных «дабрадзеяў» з усходу і захаду:

Пасля ночы будзе-будзе калісь
дзень.
Мы не можам жыць без свету…

Юрка Геніюш быў чалавек кампанейскі, меў шмат сяброў, у яго хапала энэргіі і сіл на знаёмствы і сустрэчы. Ён меў добрую памяць, шмат ведаў вершаў, анекдотаў, любіў іх распавядаць. Ён быў казачнік-выдумшчык і літаратар з гумарам. Мне вельмі падабаецца яго аповед «Як чэрці свіней у балота зацягнулі». Нагадаю сюжэт. Прасілі дзеці дзядзьку Рыгора расказаць пра здарэнне. Аднойчы ён пасвіў у пана свіней, але пан мала плаціў, а малады Рыгор некалі задумаў жаніцца на прыгожай дзяўчыне. Тады ён выгашыў прадаць свіней пана гандлярам, але паадрэзваў у свіней хвасты. А потым гэтыя хвасты пазасоўваў у балота. А пану сказаў, што чэрці свіней пазацягвалі ў балота, толькі хвасты відаць. Пабег пан глядзець, схапіў за хвасты і «адарваў» іх. А Рыгора выгнаў з працы. Але за грошы Рыгор хутка жаніўся на прыгожай Алесі… Цікавейшая рэч. Вельмі добра чытаецца, проста не адарвацца. І такіх твораў у Юркі Геніюша шмат. Па іх можна нават вясёлыя мультфільмы і фільмы здымаць.

А цяпер пра ліст да Віктара Шведа… Я думаю, што вядомы беларускі паэт з Беластока Віктар Швед заўсёды памятаў і памятае тое, што некалі яму пісаў і казаў Юрка Геніюш. А казаў ён вось што: «І памятай, што хай цябе там нават клічуць Шведам — для нас ты быў і будзеш беларус».

І апошняе з нагоды выхаду кнігі «Смыком па сэрцы». Ці ведаеце вы, шаноўныя сябры, чым пры жыцці Юрка Геніюш заліваў тугу? А заліваў ён яе — гаворкай роднаю. Дык давайце і мы далучымся да Юркі Геніюша і будзем яшчэ мацней любіць наша беларускае Слова. Памятаеце, ён пісаў: «Бойцеся Слова! Прад ім трапячыце. У ім Ваша смерць, нягодні ды злыдні…». Няхай ворагі баяцца нашага Слова, а мы будзем жыць доўга: «Бела. Бела. Бела і пуста. Вялізная спакуса. Дзе ж мае фарбікі? А ну, мазнем чырвонай…».

Сяргей Чыгрын

ЗНАКІ

СЛЯДЫ, ЯКІЯ ЗНІКАЮЦЬ

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ



Не надта пашанцавала ў Беларусі 2013-му. Тут часам нейкі год абвяшчаюць у гонар знанае Асобы. Так, пазамінулы меў трох вялікіх паэтаў: Янку Купалу, Якуба Коласа і Максіма Танка. 2011-ы — Максіма Багдановіча. Для 2013 годнага імя, як палічылі тыя, хто абвяшчае, не знайшлося.

Мяркую, для тых, хто жыве ў Беларусі, Асобаў, вартых стаць «тварам» 2013-га, не бракавала. Для кагосьці ён быў годам Кастуся Каліноўскага, для іншых — Максіма Гарэцкага, Вацлава Ластоўскага, Францішка Аляхновіча, Масея Сяднёва. Для кагосьці годам «Вянка». Для мяне ён стаўся годам Наталлі Арсенневай. Сама яго і абвясціла на першай гарадзенскай паэтычна-мастацкай імпрэзе яшчэ 3 студзеня ў галерэі «Крыга». На яго прыпала 110-я гадавіна з дня нараджэння паэткі. Кнігу да гэтага года «Наталля Арсеннева: Шлях да Беларусі» падрыхтавала і выдала, і вечарыну правяла. У той жа «Крызе». Для сваіх даўніх студэнтаў, якія памятаюць мае лекцыі пра творчасць паэткі.

Але шырокаю грамадою гэтая гадавіна была замаўчана. І не дзіўна. Бо да шырокай грамады даходзіць тое, што рэкламуюць дзяржаўныя СМІ, найперш тэлебачанне, на якім добрага слова пра паэтку чакаць не даводзіцца. Ды хіба і ніякага не даводзіцца.

Усяго некалькі артыкулаў нагадалі пра яе верасень. Артыкул гісторыка Наталлі Гардзіенка «Пантэон Беларусі. Наталля Арсеннева» на партале naviny.by. Яго пачатак з назвай «Сваячка Лермантава?» адразу ставіць пытанне. Аўтарка дзеліцца сваімі сумневамі: «У асяроддзі беларускай эміграцыі нараджалася багата міфаў. Адзін з іх, створаны даўнім прыхільнікам творчасці паэткі Антонам Адамовічам, сцвярджае, што яна мела далёкае сваяцтва з класікам рускай літаратуры Міхаілам Лермантавым. Аднак сама Наталля Арсеннева нідзе ніколі пра гэта не згадвала, і ніякіх пісьмовых пацвярджэнняў гэткага цікавага факту не знойдзена». Але ж разам з тым нідзе і ніколі паэтка не абвяргала гэтага факту. Нельга ўявіць, што Адамовіч сам прыдумаў гэта. І паэтка пагадзілася? Многія сустракаліся з ёю, ні ў кога не ўзнікала думка перапытаць. А мо хто пытаўся? Што да пісьмовых пацверджанняў, то як і дзе іх шукаць, калі столькі пажараў вынішчала на нашых землях усё, што гарыць, і нават тое, што не гарыць. Ды і хто іх шукаў, калі нават на такое простае пытанне: як звалі маці паэткі? — адказ знайсці было цяжка, хоць пыталася ва ўсіх, хто ведаў яе асабіста або мае сувязі з сям'ёй Кушаляў. І друкуецца здымак маці без імя…

Мела вялікую надзею на сп. Уладзіміра Кушаля, сына паэткі. Але да яго пры ўсіх маіх намаганнях так і не дайшла: між намі акіян. Недаверу, стомленасці, а мо і абыякавасці. Маю на ўвазе не сына паэткі. Разумею, ён пражыў жыццё, дзе было столькі ўсялякіх людзей і падзеяў, што, магчыма, і не жадае, каб іх стала яшчэ болей.

І раптам, ужо нават не чакаючы нейкіх вынікаў, атрымоўваю весткі ад спадара Янкі Запрудніка, які перадае ад Уладзіміра Кушаля, што маці звалі Клаўдзія, поўнае імя бацькі — Аляксей Аляксандравіч. Значыць, знайшлося яшчэ і імя дзеда паэткі. Што да быццам бы «міту», прыдуманага Адамовічам, то сын паэткі пацвярджае, што гэта праўда. І я цалкам пагаджаюся з лістом спадара Запрудніка: «Думаю, што гэта «патрыятычная» выдумка аб несваяцтве Арсеньневай з Арсеньневымі»…

У гэтым годзе прайшла з паэткаю ці не ўсе яе сцежкі-дарогі. Не ў рэальнасці, зразумела. Часам слухала, як нараджаліся яе вершы. Не магу пэўна сцвярджаць, ці была паэтка ў нашай Гародні. Бо чаму б і не: зусім недалёка ад Слоніма. Але звестак не захавалася. То іду ўслед за ёю па слонімскай вуліцы. Уяўляю, як быў напісаны верш «Мэта жыцця», пад якім чытаем: Слонім, 1922 г. Нагадаю: у гэтым горадзе паэтка з сям'ёю пражыла паўтары гады (1922–1924). Гадавала першынца Яраслава, чакала Уладзіміра.

Яна ціха ішла па вуліцы, кожучы перад сабою лёгкі вазок і думала:

— Вось ён, маё дзіцятка, мой сыночак. Хіба ж гэта не ёсць мэтаю майго жыцця? Майго жыцця. А ў іншых людзей, напэўна, інакш. Ва ўсіх людзей інакш. Як у тых, моцных, змагароў? Што для іх мэтай? Мэта жыцця…

І раптам узнік рытм, які адпавядаў яе крокам. Рытм станавіўся выразным, дакладным. Пачаў гучаць верш, узніклі словы:

— Вось яны, людзі моцныя. Але ж ёсць і іншыя, слабыя. Людзі, у якіх няма сілаў змагацца. Такіх таксама многа. Мэта жыцця, кажуць людзі без сілы… Што для іх мэта? Проста ісці, дайсці да канца. А канец — гэта магіла. Мэта жыцця — дачакацца магілы. Самотна, але, напэўна, і так ёсць. Лёс зводзіць слабога з моцным. Бо што было, калі б інакш? Няпроста было б.

А што ж для мяне важней? А для мяне важней само жыццё. Вось гэты мой сынок у вазку. Ён маё жыццё зараз. Ён працяг майго жыцця. І ягоная мэта.

Сёння я павінна сказаць Францу, Францішку пра тое, што яшчэ адно жыццё зарадзілася пад маім сэрцам, пачало расці ўва мне. Сёння ўжо ведаю тое напэўна. Што ён скажа, мой муж, мой Франц? Чалавек моцны. Мэта ягонага жыцця — змагацца. Як ён успрыме гэтую навіну? Спадзяюся, абрадуецца…

Дайшла да дому, паклікала няньку, папрасіўшы: «Вазьміце дзіцятка. Ён яшчэ спіць. Мне трэба крыху часу, каб запісаць…»

Асадка хутка бегала па паперы, бо радкі ўжо ўпэўнена гучалі ў яе душы. Спяшалася, каб запісаць. Бо страціцца. І не вернеш. Як тое ўжо было неадночы. Дапісвала апошнюю страфу, як пачула плач Ярослава. «Нешта тут не зусім. Але нічога, пазней спраўлю…» Кінула на стол асадку і пабегла да свайго Сонейка…

Пазней, значна пазней яна і сапраўды адшліфуе некаторыя свае вершы. Як мне, то тыя, першыя рэдакцыі гучаць неяк больш пяшчотна. Калі нават яны і не выверяныя, калі часам зрываецца рытм…

«29. І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым, мяккім пыла дарогі сляды.

30. Але гора Вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі Вы іх».

Гэты фінал апавядання «Апокрыф» Максіма Багдановіча згадваю, калі думаю пра Наталлю Арсенневу. Бо яны, Асобы, надзеленыя Небам не абы-якім талентам, Ягоныя пасланцы, носьбіты красы і светласці, таксама пакінулі сляды. Замоўчванне, а яшчэ горай ганьбаванне імя паэткі — гэта і ёсць знішчэнне яе слядоў.

КРАЙ ВЯСЁЛКАВЫХ ДАРОГ ТОДАРА ЛЕБЯДЫ

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

6 студзеня споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Тодара Лебяды, паэта, драматурга, публіцыста, аднаго з самых пакутных беларускіх песняроў, вязня сталінскага ГУЛАГа, які прайшоў праз усе нягоды смутнага часу.

Тодар Лебяда — псеўданім Пятра Фёдаравіча Шырокава. Ён з ліку тых дванаццаці студэнтаў Мінскага педінстытута, якія былі арыштаваныя ў 1936 годзе па абвінавачванні ў буржуазным нацыяналізме. Яго блізкімі сябрамі, якія раздзялілі лёс выгнанніка, былі вядомыя паэты-эмігранты Масей Сяднёў і Уладзімір Клішэвіч.

Тодар Лебяда зведаў шмат пакутаў: сталінскія турмы і лагеры, жыццё ў акупаванай Беларусі, эміграцыю ў канцы вайны, невыносную тугу па Радзіме, якая стала адной з прычынаў вяртання ў Беларусь. Тут яго зноў чакаў арышт і самы страшны прысуд — расстрэл. Можна толькі здагадвацца, якія пакуты вынес паэт у той жахлівай камеры-адзіночцы для смертнікаў. «Часта мне здавалася, што са мною размаўляюць сваякі, якіх ужо не было на гэтым свеце. Ва ўяўленнях я бачыў іх. Відаць, вар'яцеў паціху...», — успамінаў ён. Праз два тыдні смяротнае пакаранне было заменена на 25 гадоў зняволення.

Ізноў тое ж невыносное пекла, праз якое прайшоў у трыццатых. А на Радзіме, куды Тодар Лебяда вярнуўся толькі ў 1960-ым, ён не знайшоў прытулку з-за таго, што многае тут змянілася. І ў ягонай сям'і таксама. Апошнія гады пражыў на чужыне, на Разаншчыне, дзе і памёр у 1970 годзе, перанёсшы два інфаркты.

Самым значным дасягненнем творчасці Тодара Лебяды з'яўляецца яго «Песні выгнання», што выйшлі ў Менску ў 1944 годзе. У 1991-ым іх перавыдала кааперацыйнае таварыства «Адраджэнне» (наклад, праўда, усяго 500 асобнікаў).

Тодар Лебяда — адзін з тых Гусляроў, якому ўдалося выжыць ва ўмовах бальшавіцкага пекла з яго адмысловым сатанізмам, каб расказаць пра гэта. Як многім творцам, паэту дадзена было прадказаць свой лёс, сваё шчасце вярнуцца з выгнання. Нібы прароцтва, гучаць радкі з верша-прысвячэння «Уладзіміру Хадыку»:

Прыйдзе час, і хтосьці, мо' адзіны,
Застанецца ўсё такі гусляр!

Ён тады у сонечным прадвесьні
Пойдзе ў край вясёлкавых дарог, —
Ён тады з выгнаньня нашы песьні
Разьнясе па родных берагох.

Паэт выжыў у той цемры таму, што ўмеў лётаць услед за сваімі думкамі, якім няма «Сібіру, суровае кары» ў «край вясёлкавых дарог», каб адагрэцца там душою, набрацца моцы. Хоць на нейкі час пазбавіцца пякельнай пакуты, пабываць на Радзіме: «Ляці ж, мая думка, ляці ж, мая радасць, на родны, далёкі курган». Думкі, услед за якімі імкне герой, досыць розныя: аб родных загонах, аб маленькай дачушцы, аб ягоным каханні. Каханая становіцца ўсяго толькі рэхам уласнага ўспаміну...

Лірычны герой Тодара Лебяды пачынае адчуваць сябе ў «кагорце мерцвякоў», і гэта адчуванне ўвесь час узмацняецца, нягледзячы на моц духу паэта. Нават у адзін з самых лірычных вершаў «Развітанне з маленькай дачушкай» паэт уводзіць трагічны настрой, адчуванне смерці, калі вырастае пачуццё халоднага магільнага жаху:

Я еду ў край
Такі, што ты й ня сьніла,
Дзе многа, многа
Страшных мерцьвякоў,
Дзе кожны дзень
Капаюцца магілы
Дзеля замучаных,
Зьняволеных бацькоў.

Беларусь як «край вясёлкавых дарог» — гэта мроя паэта, якой (а ён тое добра ведаў) супрацьпастаўлены жорсткія рэаліі сталінскіх часоў. У вершы «Цяжка, цяжка беларусу...» Тодар Лебяда перапрацоўвае фальклорны матыў — зварот да вольных птушак, дзікіх гусей, што лятуць на яго Радзіму. Узнікае вобраз забранага краю, дзе нішчаца спрадвечныя духоўныя скарбы, дзе пануюць чорныя сілы зла

Жахлівая адзінота, беспрытульнасць чалавека-выгнанца, адчай, безвыходнасць гучаць у «Лістах да сябра». «Сібірская глуш», «дзікі ўсход — людская дамавіна», «дзікая тайга» — такім бачыцца паэту край ягонага зняволення. У гэтых вершах асабліва выразна вымалёўваецца характэрны беларускай паэзіі матыў «тут — там». Там — шырокі бэз у квецені, тут — «пад кожнай шпалай... замучаны ў выгнаньні беларус», там — «шасьцяць калосьсем нівы», тут — «мёрзлая зямля».

Мысленне паэта ў выніку становіцца вельмі парадаксальным, калі святло і цемра ўяўляюць сабой адзіны непадзельны комплекс узаемазвязаных з'яў, дзе адбываецца рэзкае і імгненнае мяжаванне аптымізму і песімізму. З аднаго боку, нязгасная сіла веры ў «раньняе прадвесьне» Беларусі, з другога — разуменне рэальнага становішча на Радзіме, адсюль — шчымлівы адчай паэта. Грамадзянская асабістасць Тодара Лебяды нібы становіцца ў апазіцыю да яго душы. І калі з аднаго боку мы бачым найвялікшую веру, дык з другога — абсалютны адчай:

Дагару душою
Нават на прадвесьні,
Бо укралі сэрца
Цесныя муры.
Дагару — завяну,
Не прапеўшы песьні,
Разгубляўшы песьні
Рана на зары.

Але, насуперак усяму, да нас прыйшло адчайна-светлае паэтычнае слова Тодара Лебяды, прыйшло, як пасланне з таго жахлівага свету, дзе давялося пабываць паэту з сонечнай душой.


…У гады вайны Тодар Лебяда напісаў п'есу «Загубленае жыццё» (першы антыбальшавіцкі твор у беларускай драматургіі), якая мела поспех на сцэнах тэатраў у акупаванай Беларусі. Ягонае жыццё, як і жыццё героя, таксама было загубленым.

ЮБІЛЕЙ

ПА-САПРАЎДНАМУ ТАЛЕНАВІТЫ

Лада АЛЕЙНІК

Творчую індывідуальнасць Андрэя Федарэнкі ахарактарызаваць складана. Калі паспрабаваць скласці «псіхалагічны партрэт» пісьменніка паводле яго твораў, то вобраз атрымаецца надзвычай супярэчлівы. Эпік і лірык, іронік і сатырык, рамантык і рэаліст. Сціплы і амбітны. Надзвычай далікатны, чуйны, дакладны… І выключна жорсткі. Шчыры, як дзіця, і хітраванец, якіх свет не бачыў. Ён шматаблічны і непрадказальны. Бясспрэчна адно: Федарэнка па-сапраўднаму таленавіты.



Фота Алены Казловай

Яго талент быў заўважаны адразу. Пасля першых яе публікацый у часопісе «Маладосць» (у 1987 г.) пра А. Федарэнку імгненна «загаварылі». Спачатку «кулуарна» — у рэдакцыйных кабінетах ды прыватных літаратурных кампаніях. А крыху пазней, пасля выхаду кнігі «Гісторыя хваробы» (1989), яго творчасць прыцягнула ўвагу крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Гэта натуральна, бо ўжо ў дэбютнай кніжцы малады пісьменнік красамоўна «заявіў» пра свой эпічны талент, прадэманстраваў здольнасць да глыбокага псіхалагічнага аналізу і мастацкай тыпізацыі характараў. У артыкуле «Агрэсія формы. Стылёвыя пошукі маладой прозы» (1991) літаратуразнаўца Людміла Корань слушна заўважыла: «Спосаб апавядання А. Федарэнкі, як і ўсе, здаецца, вядомыя спосабы апавядання ў свеце, з абсурдысцкімі ўключна, сто разоў апісаны лепшымі даследчыкамі класічнай псіхалагічнай прозы як рускай, так і замежнай. Гэта тая манера апавядання, калі пісьменнік паказвае адносна аўтаномную, асінхронную да праяў знешняга свету плынь унутранага жыцця чалавека, з абавязковым у той жа час паказам гэтага самага аб'ектыўнага пачатку — знешняга жыцця. Сам прынцып, такім чынам, не новы. Штука ў тым, каб адкрываць кожны раз нанова ў рэальным жыцці гэтыя сутнасныя «счапленні» розных з'яў і знаходзіць сродкі адэкватнага перакладу адкрытага на паперу. Выяўленчыя сродкі А. Федарэнкі якраз і даюць магчымасць убачыць, як, з чаго склалася тое, што спраўдзілася, што маеш як факт, як падзею, як вынік, — тое, чаго ніхто не чакаў».

Сёння, праз чвэрць стагоддзя пасля выхаду дэбютнай кніжкі, думаецца, ужо ні ў кога не засталося сумневу, што А. Федарэнка спраўдзіўся і з'яўляецца адным з найвыбітных майстроў у беларускім прыгожым пісьменстве.

…Кажуць, пра што б ні пісаў пісьменнік, ён заўсёды піша пра сябе. У адносінах да А. Федарэнкі гэтую крылатую фразу можна ўспрымаць амаль літаральна, бо шмат якія з яго твораў маюць аўтабіяграфічны характар. Да іх ліку належаць аповесці «Гісторыя хваробы», «Вёска», «Пра аднаго пісьменніка», эсэ «З кошыкам, або Гісторыя ненапісанай аповесці», раман «Рэвізія», шматлікія апавяданні. У той жа час ніводзін з названых твораў не з'яўляецца літаральным жыццяпісам аўтара, фактычна ў кожным з іх пераважае мастацкі вымысел. Інакш кажучы, аўтабіяграфічны элемент прысутнічае, але ён падпарадкуецца творчай задуме, выступае матэрыялам пабудовы мастацкага сюжэта. Нават пра раман-эсэ «Мяжа» нельга сказаць, што ён з'яўляецца абсалютным адлюстраваннем рэальнага жыцця аўтара, хаця ў гэтым творы непасрэдны аўтабіяграфізм дамінуе над мастацкім фактам. Тут пісьменнік робіць спробу «разабрацца ў сабе», зафіксаваць нараджэнне і рэалізацыю (з усёй непаслядоўнасцю, супярэчлівасцю, забяганнямі наперад і вяртаннямі назад) уласных задум. Тут адлюстраваны і працэс выспявання ідэй, і вырашальныя ўплывы знешняга жыцця, і само з'яўленне тэксту, — з памкненнямі адрэфлексаваць, зрабіць відавочным «патаемнае» ў творчым працэсе. Менавіта «Мяжа» дазваляе найбольш аб'ектыўна зразумець саму сутнасць асобы аўтара, манеру яго пісьма і лад мыслення.

У рамане «Рэвізія», які зрабіўся сапраўднай з'явай у беларускай літаратуры пачатку XXI стагоддзя і дзе ў вобразе галоўнага героя Алеся Трухана/Трухановіча яўна пазнаецца аўтар, А. Федарэнка выступіў у трыадзінай іпастасі «аўтар — герой — рэвізор». Яго рэвізія ў пэўнай ступені была прысвечана дзейнасці літаратурнага аб'яднання «Тутэйшыя», але, безумоўна, не абмяжоўвалася адно падсумаваннем творчых набыткаў Таварыства. Па сутнасці, пісьменнік зрабіў спробу мастацкага асэнсавання агульных заканамернасцей у працэсе развіцця айчыннай літаратуры, агляду яе тэматычных і вобразна-выяўленчых абсягаў, а паралельна з гэтым паспрабаваў адказаць на самыя актуальныя для мастака пытанні: у чым сэнс і мэта мастацкай творчасці; ці варта ўвагі (а галоўнае – духоўных высілкаў) тое, што мы (я) робім; як і пра што трэба пісаць?.. Інакш кажучы, пісьменнік выступіў у творы ў ролі гісторыка літаратуры і яе крытыка.

І яшчэ адзін прыклад — аповесць «Повесць». (Пад такой назвай твор быў надрукаваны ў часопісе «Полымя» № 5 у 2006 г. Пазней А. Федарэнка перапрацаваў гэтую аповесць, змяніў яе кампазіцыю і ўзбуйніў сюжэт. У кнігу «Ланцуг» аповесць увайшла пад назвай «Пра аднаго пісьменніка»). Сюжэт пабудаваны на «канфлікце» вопытнага рэдактара літаратурна-мастацкага часопіса і аўтара-пачаткоўца — жанчыны, якая працуе «дыспетчарам пуці на невялікай станцыі-раз'ездзе» і ў даволі спелым узросце вырашае «паспрабаваць сваё пяро». Паводле кампазіцыі твор уяўляе сабой «завочны» дыялог рэдактара і аўтара — цытаванне арыгінальнага твора суправаджаецца каментарамі спрактыкаванага літаратара. Пазіцыя рэдактара акрэслена адназначна: у дэбютанткі няма шанцаў на поспех. «Пахвальна, што Вы нарадзілі і выхоўваеце дваіх дзяцей, што Вас не засмактала жыццёвая багна, у душы захавалася прага самарэалізацыі і ўсё такое. Але дазвольце спытаць: што перашкаджае Вам самарэалізоўвацца непасрэдна па сваёй дыспетчарска-чыгуначнай лініі? У якой Вы напэўна разбіраецеся не горш, чым у літаратуры?». Такім чынам, фактычна ў пачатку твора заяўлена катэгарычнае сцвярджэнне, што твору дэбютанткі наканавана параза. Але на працягу разгортвання сюжэта даказваецца адваротнае. Рэдактар палемізуе з нявопытнай пісьменніцай хутчэй па інерцыі — крытыкуе яе за стылёвыя хібы, моўныя штампы, неістотныя фактычныя памылкі і іншыя дробныя агрэхі, але на самой справе ён перажывае неймаверны шквал эмоцый. Незаўважна для самога сябе ён пачынае згадваць свае юнацкія гады, сяброў, каханую, па вялікім рахунку — герой нанава перажывае ўсё сваё жыццё. І гэтым самым А. Федарэнка даказвае неправамернасць тэзы, заяўленай у пачатку твора.

Вось гэткую ж мастацкую стратэгію пісьменнік выкарыстаў у рамане-эсэ «Мяжа». Тыя чытачы, якія былі больш-менш абазнаны ў творчай манеры А. Федарэнкі, цудоўна разумелі, што гаворку ён вядзе зусім не пра «падвядзенне рахункаў»... Асноўнай праблемай рамана-эсэ, думаецца, зрабіўся пошук адказу на самае важнае для пісьменніка пытанне: «Як я стаў тым, кім стаў?» А. Федарэнка фармулюе яго такім чынам: «У меру сіл мы хацелі прасачыць на адной канкрэтна ўзятай біяграфіі, на гэтых зведзеных у адно выпадках, гісторыях, сітуацыях зародак творчасці. Як у народзе кажуць — адкуль што бярэцца? Чалавек дзякуючы такой біяграфіі абавязкова рана ці позна павінен быў бы пісаць, ці ён ужо нарадзіўся «дзвінутым»?..». Менавіта адказ на гэтае пытанне запатрабаваў звароту і да самых першых жыццёвых уражанняў, і згадак пра тое, як пазней нараджаўся той ці іншы твор.

Складваецца ўражанне, што А. Федарэнка не пакінуў без увагі ўвогуле ніводную праблему, уласцівую творцу. Ён вытлумачвае, адкуль браліся сюжэты і вобразы, якія кнігі і пісьменнікі паўплывалі на яго светабачанне і мысленне, як працаваў над стылем, якія эмоцыі перажываў з-за крытыкі, якія пачуцці выклікалі публікацыі новых твораў. Ён даводзіць, што прайшоў праз многія жыццёвыя выпрабаванні, а па вялікім рахунку — проста выжыў, дзякуючы творчасці. І асноўнае перакананне, да якога прыйшоў шляхам спробаў і памылак, фармулюецца так: «Не важна, колькі разоў ты ўпаў, важна, колькі падняўся. <...> Пішы. Рабі тое, да чаго ляжыць душа, што ў цябе, як ты лічыш, лепш за іншае атрымліваецца, у чым ты бачыш сваё прызванне — а там як карта ляжа, там аддацца на волю закону: пашэнціла — не пашэнціла».

У эпілогу заключнай часткі А. Федарэнка падводзіць своеасаблівае рэзюме, дзе, нарэшце, прызнаецца, што ў тыя «падсумаванне» і «падвядзенне вынікаў», пра якія ішла гаворка ў пачатку твора, ён сам не надта верыць. Пісьменнік ізноў падкрэслівае, што пры ўсіх выдатках і пакутах літаратурная творчасць з'яўляецца магутнай матывацыяй для самога існавання мастака, яна адначасова — і лад жыцця, і яго сэнс.

А зараз варта спраўдзіць, якія творчыя набыткі займеў А. Федарэнка за гэтыя пяць гадоў, што прайшлі з моманту друкавання «Мяжы». Інакш кажучы, ці ж з'явілася ў яго «другое дыханне»...

Мяркуйце самі.

У 2012 г. пісьменнік выдаў кнігу прозы «Ланцуг» (у якую ўвайшлі шэсць аповесцей) і зборнік літаратурных эсэ «Сечка». Пераклаў на рускую мову кнігу «Афганская шкатулка». У 2013 г. выдаў зборнік выбраных твораў «Вёска» і надрукаваў шэраг твораў у літаратурна-мастацкіх часопісах. Пры гэтым можна без перабольшвання сказаць, што фактычна кожная публікацыя рабілася літаратурнай падзеяй. Аповесць «Ціша», напрыклад, якая выйшла ў «Маладосці» (№ 7), адразу ж выклікала рэзананс у літаратурных колах. Гэта аповесць «двухадрасная», яна з аднолькавай цікавасцю чытаецца і падлеткамі, і дарослымі. Кожны чытач, натуральна, знаходзіць тут свае сэнсы, бо твор шматмерны і шматузроўневы, надзвычай канцэнтраваны паводле зместу. У ім выключна глыбока распрацаваны характары, арыгінальна выбудаваны сюжэт — складаныя падзеі «дарослага» жыцця і нават пытанні аксіялагічнага кшталту выяўлены праз свядомасць дзіцяці...

Альбо аповесць «Дзядзька Адольф», надрукаваная напрыканцы 2013 г. у «Дзеяслове» (№ 67), у якой вобраз галоўнага героя атрымаўся настолькі неадназначным, што яго «ідэнтыфікацыі» палягаюць у дыяметральна супрацьлеглых маральна-этычных каардынатах. Некаторыя чытачы, напрыклад, лічаць героя шараговым правінцыйным няўдачнікам — наіўным, крыху абмежаваным, не надта шчаслівым, які заслугоўвае адно спачування ды шкадавання. Іншыя схільны бачыць у ім «маленькага фюрэра» — беспадстаўна амбітнага, эгаістычнага і эгацэнтрычнага, жорсткага, няздольнага не толькі да любові, але нават да элементарнага спачування... Ізноў усё ў стылі Федарэнкі — шчыра і проста, шматзначна і складана. Віртуозна, адным словам.

Такім чынам, ёсць усе падставы сцвярджаць, што сваё пяцідзесяцігоддзе А. Федарэнка сустракае ў творчым росквіце. У яго ёсць фактычна ўсё, пра што можа марыць пісьменнік — талент, плён, запатрабаванасць, прызнанне крытыкаў і літаратуразнаўцаў, чытацкая ўвага і павага. Чаго ж можна пажадаць такому пісьменніку з нагоды слаўнага юбілея? ...Згадваецца, як цёпла напісаў Федарэнка ў заключным раздзеле «Сечкі» пра Янку Брыля, які «здолеў усё, што трапляла ў поле яго зроку, падпарадкаваць любімай справе». Вось і самому Федарэнку хочацца пажадаць таго, пра што ён з белай зайздрасцю пісаў у дачыненні да жыцця і творчасці Брыля: «...Пахадзіць па свежай пакошы, папіць у спёку халоднага малака нагбом з паліванай гладышкі, паслухаць рып маладога снегу пад падэшвамі, пасумаваць разам з жоўтым восеньскім лістом, памацаць у пальцах клейкую пахкую веснавую пупышку, пачытаць любімую кнігу, няспешна, роўным прыгожым почыркам запісаць усё гэта...».

Цалкам артыкул будзе апублікаваны ў № 68 часопіса «Дзеяслоў»

ЗАПІСЫ ДЛЯ СЯБЕ

НА ХВАЛІ БРАЦКАГА ДАВЕРУ

Ніл ГІЛЕВІЧ

8.IV.1963

Быкаў прыслаў ліст. Дзякуе за «спачуванне» ў яго кіно-непрыемнасцях. Але: «Толькі на фільм гэты я ўжо даўно плюнуў... Не па-мойму ён зроблен, шмат што не так, дрэнна, слаба — чорт з ім, з фільмам. Гэта балаган, а не мастацтва, — кіно. У літаратуры, не гледзячы на ўсё, усё ж больш тваёго, аўтарскага, а кіно — дрэнь».

Цалкам згодзен. Але — ці трэба дзівіцца? Хто робіць у Беларусі кіно? Беспардонныя халтуршчыкі.

18.V.1964

Васіль зноў напамінае мне ў лісце, каб я пісаў. «Пішы вершы (і замовы!!), друкуй. Заўсёды з вялікай цікавасцю чытаю цябе ў газетах і часопісах. Жадаю табе поспехаў у прафесарскіх справах». Вось-вось! «Прафесарскія» справы і паглынаюць галоўным чынам мой час. Чытаць курс лекцый у БДУ — гэта не жартачкі.

1.IX.1964

Быкаў абяцае надрукаваць мае пераклады ў «Гродз. пр.» да 9 верасня, але не ўсе: адзін верш (Вапцарава) не пойдзе, «бо там — туга, сум, а гэта, сам ведаеш, супроцьпаказальна савецкаму чытачу. Таму начальства яго начыста забракавала. Хоць ён напісаны даўно і ў братняй Балгарыі — але!».

Не толькі даўно, але і напісаны паэтам, якога фашысты ў 1942 годзе расстралялі. Божа, што робіцца, які нялюдскі страх сядзіць у касцях у чыноўнікаў ад ідэалогіі! Харошы, светлы верш! Ну вядома ж, сумны, бо напісаны ў перадсмяротную гадзіну, перад расстрэлам. І што гэта рабіць з гэтым дубаўём?

«Чакаю пленуму, — піша Васіль, — хачу паслухаць нашых разумнікаў, пра новыя дасягненні беларускай раманістыкі. Патроху выдаюся-друкуюся — з неверагоднымі цяжкасцямі — у Мінску, трохі лягчэй — у Маскве. Лягчэй, бо Масква перарабляе толькі канцоўкі, а [выдавецтва] «Беларусь» наогул выкідвае мае кніжкі з планаў без ніякіх тлумачэнняў (напр., з плана 1965 года)».

У працяг гэтага Васіль паведамляе, што піша новую аповесць. «Але ўжо загадзя прадбачу пераробкі, памячаю ў рукапісу, што дзе не пойдзе, трэба ж яшчэ прадумаць, чым і як замяніць».

Вось так жывуць і твораць у Савецкім Саюзе таленавітыя і сумленныя пісьменнікі. Якая ганьба! Божа прасветлы, ці бачыш ты? Яшчэ піша, а ўжо думае, прыкідвае, што давядзецца выкрасліць і чым замяніць — каб упадабалі ў Галоўліце!.. Вось гэта рэалізм!..

Васіль пытаецца, як мае справы пісьменніцкія. «Нешта ты змоўк. Дзе твае замовы і закіды супраць усякае гідоты? Заўсёды з вялікай цікавасцю кідаюся на твае радкі ў часопісах — бо праўдзіва і сумленна».

Дзякую, браток! Мне вельмі-вельмі дорага чуць ад цябе гэтыя слоўцы.

3.IV.1965

Устрывожыў ліст Быкава наконт яго новай аповесці. «З аповесцю ў мяне, відаць, справа будзе доўгая і наўрад ці закончыцца аўтарскай перамогай. Аповесць атрымалася крутаватая па нораву, і кажуць рэдактары, што не ў час. (Час то юбілейны!) Але ў гэты раз я рашыў не ўступаць і не паддавацца — хапіла мне ўступаць з папярэднімі рэчамі, цяпер гэтыя ўступкі вылазяць папрокамі ў крытычных артыкулах (гл. напр. «Знамя»), і я не крыўдую, бо вінаваты сам — не трэба было паддавацца, хай бы лепш яны ляжалі недрукаваныя. А з новай рэччу рашыў быць нязломным».

Ну, памажы табе Бог, браток! Трымацца трэба да канца. Сапраўды, хай лепш не друкуюць. Гэты раз на юбілей (Перамозе — 20) спасылаюцца. Пісаць праўду, як далася нам Перамога, — нельга. Давайце і далей закідваць ворага шапкамі.



Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч і Ніл Гілевіч

14.IV.1966

Апошні лісток Васіля — горкі. «Дзякаваць Богу, ёсць яшчэ на свеце сяброўства. Хлопцы падбадзёрваюць — гэта ўмацоўвае мае сілы. А ўвогуле кепска. Не артыкул, артыкул — глупства. Па ўсіх іншых каналах. Дайшло нават да школ і дзяцей. У школах даводзяць, што Быкаў — гэта гродзенскі Сіняўскі, вораг. І хто? Вядома, кадравыя работнікі КГБ. Пайшлі на прадпрыемствы з «разъяснениями». З дня на дзень усё горш. Як ваўка ў аблаву.

Але — вытрымаем!

І падтрымка сяброў абавязвае. Дзякуй!»

Так, гэта вельмі добра, што Вярцінскі і Бураўкін задумалі сабраць подпісы ў абарону Быкава і што я ім на самым важным этапе дапамог (узяць подпісы ў Лынькова і Куляшова — маіх нарачанскіх суседзяў. Гэта — цяжкая артылерыя).

Добра то добра, але што будзе, чым закончыцца? Гэта ж можна затравіць чалавека канчаткова. Ды якога чалавека! Пісьменніка, якім павінна ганарыцца не толькі беларуская літаратура, але і ўся савецкая.

О-о, дык жа нашы справы куды горшыя, чым я думаў. Нашмат горшыя.

15.IV.1976

Вельмі добры ліст прыйшоў ад Васіля — узрадаваў мяне надзвычай.

«Дарагі дружа Ніл!

Быў хворы, трохі падпаў духам і чытаў твой блакноцік, твае «Актавы». Скажу табе адразу: кранулі яны мяне да самай глыбіні душы, засмуцілі сваімі сумам, — харошым чалавечым сумам і смуткам. Вялікі ты малайчына, што неяк неўзаметку, спакваля напісаў столькі маленькіх цудаў — так усё проста і так шчыра, глыбока па думцы і кранае. Дай табе Бог і надалей! І мусіць даць».

Далей Быкаў расказвае, што ў сне бачыў тры мае вялікія, як Біблія, тамы. «Яшчэ падумаў: глядзі ты, як выдалі Ніла — нібы Броўку. Прачнуўшыся, падумаў: а што? Не цяпер, дык, можа, некалі выдадуць... Але не блага і ў такім маленькім блакноціку. Выдатны, браце, блакноцік! (...) Дай Бог табе здароўя, настрою і трошачкі вершаў. Такіх, як актавы».

Не ведаю, што напішуць пра мае «Актавы» крытыкі, але што б ні напісалі — пасля сказанага Быкавым ужо не будзе мець для мяне асаблівага значэння.

10.IX.1988

Быкаў адпачывае ў Нідзе, у Доме творчасці СП Літвы. Прыслаў лісток. Радуюся, што ён лічыць неабходным менавіта са мной падзяліцца ўражаннямі ад сённяшняй сітуацыі ў братоў-літоўцаў. Васіль піша: «Атрымаў твой ліст з «ЛіМам», дзякую за ўвагу. Здаецца мне, «ЛіМ», які ён ні ёсць, — адзіная ў нас газета, якая нешта робіць у сэнсе перабудовы. А вось літоўцы не чакаюць, яны на прадпрыемствах, ва ўстановах ствараюць камітэты, якія даволі актыўнічаюць. Гэта відаць па газетах. Пасылаю табе выразку з дыскусіі. Цікава!»

У мяне з Васілём па-ранейшаму поўнае ўзаемаразуменне, самая шчырая сяброўская еднасць. І што я рабіў бы, як чуўся і за што трымаўся б, калі б не наш узаемны брацкі давер? Што рабіў бы, атрымліваючы неспадзяваны нож у спіну ад сяброў? Надзеі мае — перш за ўсё на цябе. 25 гадоў (нават з гакам!) вернага, хочацца сказаць — салдацкага, брацтва, — о, Васіль! Зберажэм яго ў самых жахлівых абставінах! Калі не дзеля вялікіх перамог Беларусі, дык хоць бы дзеля таго, каб паважаць саміх сябе. Каб элементарна паважаць сябе.

Верш Васіля Быкава, прысланы мне на каляднай паштоўцы:

Шчодры вечар, шчаслівы вечар,
Самотны вечар, шаноўны пан!
Гарыць на куце паўтузін свечак,
Хрыстос нам свеціць і гоніць зман.

Хрыстосу слава і кволым слава,
Цярплівцам моцы ў цярпенні дам,
Галодным хлеба, убогім веры, —
Жыцця і шчасця усім людзям!

В. Быкаў, 5.1.1991

23-ТАМОВЫ ЗБОР ТВОРАЎ НАРОДНАГА ПАЭТА

Выйшла апошняя кніга з 23-тамовага збору твораў Ніла Гілевіча, які народны паэт Беларусі выдаваў 10 гадоў за свой уласны кошт. У збор увайшлі рэчы, напісаныя больш як за 60 гадоў.



Укладаючы збор твораў, Ніл Гілевіч патрабавальна выбіраў найлепшае з напісанага. На жаль, кнігі выходзілі зусім невялікім накладам — некаторыя тамы толькі па 50–100 асобнікаў. Большую частку аўтар раздаваў родным, сябрам і знаёмым. Паэт сціпла адмовіўся гаварыць пра значнасць завяршэння працы над 23-тамовікам, палічыўшы, што пра вынік ягонай 10-гадовай працы найлепш распавядуць бліжэйшыя сябры і чытачы. Ніл Гілевіч адзначыў, што ўсе выдадзеныя кнігі надрукаваў за свае сродкі:

«Я гэты збор выдаў за сваю дохлую пенсію. Ніводнага рубля ніякі спонсар мне не даваў. Я ж чытаю навіны і ведаю, як паэты на 20, 30, 40 гадоў за мяне маладзейшыя ездзяць па Еўропе, атрымліваюць ад спонсараў дапамогу. Вялікую дапамогу. А я — ні капейкі... У мяне тры тамы выйшлі па 50 экзэмпляраў. Некалькі тамоў — па 70, некалькі — па 100... Хто і дзе пачытае гэты збор? Толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы. Бо астатняе я ўсё раздаў сваім родным і сябрам».

Літаратуразнаўца Лідзія Савік у 2003 годзе прысутнічала на прэзентацыі праекту выдання. Распавядаючы пра жанравую разнастайнасць збора, яна адзначыла, што праца, прароблена Нілам Гілевічам падчас стварэння 23-тамовіка, пад сілу хіба што цэламу літаратурнаму інстытуту: «Найперш Ніл Гілевіч — паэт. Таму паэзія займае ажно шэсць тамоў збора. Гэта вершы, вершаваны раман «Родныя дзеці», паэмы, сатыра і гумар, літаратурныя містыфікацыі, цыкл гістарычных паэм, казкі і загадкі для дзяцей. Тры тамы займаюць пераклады са славянскіх моваў: балгарскай, расійскай, украінскай, польскай, славенскай, сербскай, харвацкай, лужыцкай, македонскай, чэшскай — усяго больш за 400 паэтаў... У публіцыстычных творах Ніл Сымонавіч вельмі смела і адкрыта гаворыць пра самыя надзённыя і балючыя праблемы грамадства, называючы імёны, агучваючы тое, што іншыя баяцца сказаць услых. Таксама шмат ёсць твораў празаічных, сярод якіх раман «Перажыўшы вайну»... У зборы — літаратуразнаўчыя і крытычныя працы, сабраны аўтарам фальклёр, запісы са сшыткаў, занатоўкі, рэплікі, моўныя жывінкі, прадмовы, выбраныя старонкі з дзённіка паэта».

Паэт Анатоль Вярцінскі назіраў, з якім пачуццём Ніл Гілевіч узяў у рукі завяршальны том сваёй працы:

«29 снежня Ніл Гілевіч пабачыў наяве апошні том распачатага 10 гадоў таму выдання 23-томнага збору твораў. Пабачыў, патрымаў у руках і паставіў на сваё, адпаведна нумарацыі, месца, побач з падобнымі цёмна-сіняга колеру томікамі... Нягледзячы на ўсе неспрыяльныя абставіны, смела задуманы і рупліва падрыхтаваны маштабны выдавецкі праект канчаткова рэалізаваўся. Збор твораў у 23 тамах стаў фактам. І, трэба думаць, фактам не толькі творчай біяграфіі аўтара, але і ўсёй беларускай літаратуры, фактам грамадска-культурнага жыцця краіны.

Значэнне падзеі — не столькі ў вонкавых параметрах, колькі ў змесце, у танальнасці і сэнсававыяўленчай сутнасці, у маральным крэда аўтара. У дадзеным выпадку гэта крэда вельмі цэльнае, вытрыманае, паслядоўнае з твору ў твор, з аднаго тома ў другі.

Прывяду ў якасці прыкладу ледзь не скразны лейтматыў. У свой час Віктар Каваленка сказаў пра паэтычную творчасць Ніла Гілевіча: «Паэзія глыбокай веры». Сам Ніл Гілевіч адну са сваіх кніг прозы, старонкі якой увайшлі ў 16-ты том, назваў «У гэта веру». А верш, прысвечаны памяці Максіма Гарэцкага, заканчваецца сцверджаннем: «Тая вера не памерла, не сканала. Тая вера, тая вера ў нас жыве». Вера — у што, у каго? Менавіта гэтым пытаннем прасякнутыя і адказваюць на яго шматлікія вершаваныя і празаічныя радкі збора твораў. Гэта вера ў несмяротнае матчына слова, што гэтаму слову жыць вечна, вера ў нашую нацыянальную годнасць, у шчаслівую будучыню свабоднай незалежнай Беларусі, і паэтычна-песенная вера ў тое, што «ўсё ж мы дойдзем, дойдзем мы да Беларусі». 23 тамы — як 23 верставыя знакі на шляху да запаветнай мэты».

Радыё Свабода

БЫЛІЦА

ТУШКА

Павел ЛЯХНОВІЧ



Аўтаномка пераваліла за палову. Гэта значыць: з трох месяцаў, што экіпаж мусіць не ўсплываючы буравіць падводным ракетаносцам недры акіянаў, засталося меней за паўтара.

Чым увогуле займаюцца падводнікі? Увогуле — яны абараняюць Радзіму. У нашым экіпажы сто пяцьдзясят чалавек. З іх большасць — расейцы. Яны абараняюць Расею. Ёсць чатыры беларусы, яны, натуральна, абараняюць Беларусь. Татары, азербайджанцы, башкіры — адпаведна. Бо калі мы самім фактам знаходжання ў аўтаномцы абараняем Радзіму, то нельга ж дапусціць, што я абараняю Башкірыю! Я нават вельмі цьмяна ўяўляю, дзе яна размешчана. Так што я Беларусь абараняю, бо толькі яе адчуваю Радзімай.

Цікава — а што абараняюць яўрэі? Іх таксама ёсць у нас — насуперак распаўсюджанаму перакананню, што яўрэй і падводны човен несумяшчальныя. Яшчэ як файна сумяшчальныя!

Яны, мабыць, абараняюць Ізраіль. Ці, можа — Бірабіджан? (Думаю — мае калегі па экіпажы, «асобы сяміцкай нацыянальнасці», уяўляюць Бірабіджан — як і я Башкірыю).

Зампаліт сцвярджае, што ўсе мы (і ён у тым ліку!) абараняем Савецкі Саюз. Бо ён — СССР — і ёсць Радзіма. А розныя там «рэспублікі», «вокругі» з пункту зору зама — ну… таксама, натуральна, Радзіма, але не тая… «Малая»! А мы ў аўтаномцы абараняем «вялікую».

Сам зампаліт называе сябе «беларусам Варонежскага разліву», але прыкамандыраваны на аўтаномку контрвыведчык з асобага аддзелу КГБ разведаў і пусціў у экіпажы чутку, што наш замуля — яўрэй. Ён, асабіст, абсалютна дакладна гэта вызначыў шляхам таемнага абнюхвання. Ад зампаліта ўвесь час пахне куркай. А куры — улюбёная ежа яўрэяў. Так што ніякіх сумневаў. Крыміналістыка плюс дэдукцыя!

Курыцай пахне і ад доктара, але той карэец з вузкімі вачыма, смуглявай скурай, і там ніякага сіянізму быць не можа. Наш прыкамандыраваны чэкіст марыць выкрыць сіяніцкую арганізацыю. Ён абараняе Радзіму вось гэтак — хоча выкрыць.

Насамрэч зам наш штодзень «правярае» правізіёнку, і заўсёды вяртаецца адтуль з сіняватай курынай тушкай, якую потым яны з доктарам таемна вараць у лазарэце. Выкарыстоўваючы не па прызначэнні стэрылізатар. Гэтак яны таксама абараняюць СССР. У кожнага свая функцыя… Увесь экіпаж, апрача контрвыведчыка, ведае пра штодзённыя харчовыя «вакханаліі» ў лазарэце…

…Падводны човен прыняў на борт шаснаццаць балістычных ракет, кожная з якіх можа зруйнаваць некалькі Хірасімаў-Нагасакаў, потым таемна пракраўся ў «раён агнявых пазіцыяў» у Паўночнай Атлантыцы, а цяпер гэтак жа таемна швэндаецца туды-сюды ў гэтым раёне. Кожныя суткі ў пэўны час ад чаўна аддзяляецца апарат і падымае да паверхні акіяна антэну. Праз яе на човен павінен прыйсці загад Радзімы запусціць тыя ракеты. Гэта будзе апафеоз абароны Радзімы. То бок мы яе, Радзіму, абараняем і зараз, але калі запусцім ракеты, то — ого-го!

Куды паляцяць тыя ракеты — нам невядома. Не нашага розуму справа. Гэта ведае сама Радзіма. Яна з самага пачатку аўтаномкі ўжо нацэліла іх куды трэба, каго мы павінны «замачыць» і «сцерці».

Тыя, каго мы трымаем пад прыцэлам, ведаюць гэта. Мы не ведаем — каго, а тыя ведаюць — хто іх… І на самым выхадзе з Кольскай затокі, амаль што ад Кільдзінскай плёсы нас ужо чакаюць. І потым увесь час за намі таемна сочаць, падлы. Каб у выпадку, калі Радзіма загадае яе бараніць, не даць нам гэтага зрабіць. Утапіць раней, чым мы запусцім ракеты.

Таму мы ўвесь час правяраемся — а ці не сочаць за намі, ці няма па карме варожага падводнага чаўна? І калі аказваецца, што сочаць — уцякаем з усіх сілаў. Пятляем, як заяц пад ганчаком — мяняючы кірункі і глыбіні, хаваючыся пад надводнымі суднамі і за падводнымі гукавымі бар'ерамі.

…У той дзень (ці ноч, бо для падводнікаў гэтыя паняцці ўмоўныя) вахценны акустык замест абыякава-соннага «…акустычны далягляд чысты…» крыху ўзбуджана праціўкаў: «Цэнтральны, штурман-гідраакустык! Пасылка гідралакатара па пеленгу сто дваццаць!» Гэта азначала, што нехта «мацае» санарам, вызначае нашы каардынаты. Сочка!

Камандзір тэрмінова сабраў карабельны баявы разлік, і з гэтага моманту звычайна спакойныя, паўсонныя вахты ператварыліся ў бадзёрыя і напружаныя. Штурман перадаў гідраакустыкам скрутак паперы-мілімятроўкі, і тыя рэгістравалі выпадкі работы санара на графіку — для наступнага аналізу. Падводны ракетаносец адрываўся ад сочкі «хвалевым зігзагам» — кожныя чвэрць гадзіны мяняючы курс і глыбіню пагружэння. Усталявалі рэжым «Цішыня». Марна! Не-не, ды і здараліся адна-дзве пасылкі варожага гідралакатара. Праціўнік учэпіста трымаў нас у полі зору.

На чарговай нарадзе карабельнага баявога разліку камандзір давёў, што паводле яго аналізу графіку, што вядуць акустыкі, найбольш эпізодаў работы санара адбываецца кожныя чатыры гадзіны. З гэтага ён зрабіў выснову, што на падводным чаўне, які ажыццяўляе сочку, вахта змяняецца гэтак жа, як і ў нас — праз чатыры гадзіны. Перад зменай удакладняюць нашыя каардынаты і перадаюць вахту.

Розныя тактычныя прыёмы адрыву ад сочкі, рэкамендаваныя сакрэтнымі і зусім сакрэтнымі «кіруючымі дакументамі», плёну не давалі. Камандзір быў на мяжы істэрыкі, а экіпаж таемна радаваўся — аўтаномку маглі спыніць і загадаць вярнуцца дадому. Штурман употай падабраў і адклаў патрэбныя мапы.

Напрыканцы таго напружанага тыдня зампаліт сабраў у кают-кампаніі партыйна-камсамольскі актыў (апроч задзейнічаных на вахце), і заклікаў «…ва ўмовах жорсткага процідзеяння супрацьлодачных сілаў і сродкаў верагоднага праціўніка… узмацніць палітычную пільнасць, пільнасць нясення вахтаў, дзеля чаго правесці сходы партыйных і камсамольскіх ячэйкаў, выпусціць на гэтую тэму баявыя лісткі…» і г.д. Пасля імпрэзы ён традыцыйна «праверыў» правізіёнку і знік за дзвярыма лазарэту…

…Апушчаная ў кіпень стэрылізатара замарожаная курыца пачала мякчэць. Доктар заварушыў ноздрамі і запытальна паглядзеў на зампаліта:

— Барыс Аляксеевіч, Вам не здаецца, што курка гэта… ну…, крыху смярдзіць?

Зам сунуў нос у стэрылізатар, з шумам уцягнуў паветра:

— Ды не… Але ў мяне нешта нос закладзены. Відаць, у правізіёнцы падстудзіў, там такая халадэча, а я разагрэты. Бегаеш-бегаеш па караблі! Ні хвіліны спакою! Кажаш — смярдзіць? Можа, як зварым — перастане?

Курыцу зварылі, але доктараў нос усё роўна злавіў небяспечны пах. Якраз гэтым часам паўз лазарэцкія дзверы ішоў падвахценны гідраакустык, матрос Ярошык, і доктар уручыў тушку яму — загадаў занесці ў скрынку з харчовымі адкідамі.

Па дарозе Ярошык нічога кепскага не ўнюхаў, і ў скрынку трапілі толькі чыста абсмактаныя курыныя костачкі…

…– Штосьці ў мяне жывот круціць! — Трэці раз за вахту паскардзіўся камандзіру групы Ярошык. — Дазвольце?

— Ідзі, што з табою зробіш… — Незадаволена прабурчэў старлей. — Толькі хуценька. Краіне патрэбны героі, а прысылаюць выключна засранцаў…

Хуценька не атрымалася. Бліжэйшы гальюн быў заняты. Жывот Ярошыка бунтаваў і патрабаваў неадкладнага вырашэння праблемы.

Другі па адлегасці — праз адзін адсек — быў гальюн першага. Праўда, перавышаючы службовыя паўнамоцтвы, яго заангажаваў камандзір крэйсера. Павесіў на дзвярах вісячы замок. Ключ хаваў побач, у закутку. Думаў — ён адзіны ведае месца схованкі… Ха! Праз тыдзень гэта ведалі нават у дзясятым!

Матрос заляцеў у першы адсек, падскочыў да дзвярэй гальюна, прытанцоўваючы, сунуў руку ў схованку. Фартуна павярнулася да гідраакустыка тварам, злёгку ўсміхаючыся. Ключ быў на месцы! І — уфф! Як мала часам трэба чалавеку для шчасця!...

…У стане сатысфакцыі Ярошык націснуў на педаль змыву. Ён не падазраваў яшчэ, што Фартуна ўсміхнулася шырэй. Можна сказаць нават — яна вышчарылася на ўсе трыццаць два зубы. Педаль унітаза адказала тоненькім скрыгатам. Вельмі чамусьці знаёмым.

Заходзячы ў гідраакустычную рубку, Ярошык пачуў канец дакладу: «…пасылка гідралакатара па пеленгу…», і яму як стрэліла ў галаву — той скрыгат педалі вельмі падобны на гук у слухаўках, калі тракт вызначэння гідраакустычных сігналаў рэгіструе чарговую пасылку варожага санара!

— Вось я зараз яшчэ дзве пасылкі зраблю, — сказаў Ярошык. — Ці тры… Колькі трэба? Зараз, ташш стршы цьнат, праз хвіліну — будзе тры пасылкі запар!

— Зрабі-зрабі. — Іранічна прапеў старлей, адзначаючы ў графіку чарговую работу санара. — Хутка камандзір радыё дасць, што ад сочкі адарвацца не можам, і тады дадому пойдзем! Да-до-му! Бэчэ-чатыры ўжо гэтае радыё падрыхта-ва-ла!

Ярошык вярнуўся ў гальюн першага, і тры разы націснуў на педаль. Педаль у адказ тры разы прапішчала тоненькім рыпеннем. А як вярнуўся ў рубку, камандзір гідраакустыкаў дакладваў Цэнтральнаму Пасту і штурману пра тры пасылкі гідралакатара.

Аказваецца — цэлы тыдзень адрываліся ад уласнай прыбіральні! Поўная аналогія спробаў ката ўцячы ад бляшанкі, прывязанай піянерамі да хваста!

Мінны афіцэр, ён жа камандзір першага, асабіста разбіраў унітаз і змазваў педаль, а камадзір карабля і зампаліт на працягу года тыцкалі яго туды носам — фігуральна. На ўсіх сходах узгадвалі той выпадак.

Ярошык — нечакана! — атрымаў заахвочванне. Дзесяць сутак адпачынку з выездам на Радзіму. «Малую». А што? Лічы — паўаўтаномкі для «вялікай» Радзімы збярог.

А той графік, што акустыкі вялі, аказаўся графікам наведвання гальюна першага адсеку! Цяпер недзе ў сакрэтных архівах захоўваецца.



ВЕРШЫ

УЧОРА — ЯК ЗАЎТРА

СТОМЛЕНЫЯ ЭКСПРОМТЫ

Данута БІЧЭЛЬ


Фота Радыё Свабода

Дожджык

Дожджык стаіць на парозе і плача —
вымак да ніткі, такая няўдача…
Хмаркі растрос, сам сябе паліваў,
дробнай дажджынкай зямлю прабіваў.

Стомлены дожджык, павалены плот,
пад частаколінай спіць сабе крот.
Некалі нехта спяваў:
— Сікані,
кроціка ў норку хутчэй прагані!
Дзетак на белым кані пракаці!
Грому з маланкай дай падрасці!

Белая хмарка, чырвоная кроў —
гэтак у дожджыкаў, як у звяроў…
Ды калі дзеці не дражняць дажджу,
нейкая вільгаць праймае душу…

Так ён стаяў на парозе і плакаў —
ніўку паліў, і такая няўдзяка?!
Дожджык грыбны — падарунак ад Бога.
Ў хаце чакалі кагосьці другога…

Грому чакалі ці стрэлу ў акно?
Хату пакінулі людзі даўно…
Дзе гаспадар, гаспадыня, суседзі?
Ўнучак з чужыны таксама не едзе…

Дожджык стаіць на каменнай прыступцы,
топчацца, нібы таўкачык у ступцы.
Можа, праз крэйку вылезлі з дому
сустрач дажджу, ці Духу Святому?

Дожджык самотна ходзіць па крэйцы,
ключ ад замка шукае ў паветцы.
Сплакаўся дожджык, стаміўся і сціх…
— Ідзі пад бярозкі, там знойдзеш сваіх…

Там і зязюля кукуе ў галлі,
быццам бы людзі жывуць, як жылі.
Грыб там расце незямной смакаты,
нібы хто вырве той грыб, сапраўды…

1. 04. 2013

Паміж

Выйдзі, мастачка, за рамку,
адчыні кляновую брамку,
пераскоч праз сваю пералазку,
намалюй жыццё свайго казку.

Маладзічок мае вобад,
маладзічок мае клопат:
бо трэба ж па небе хадзіць
ды яшчэ гэты вобад круціць…

Цямрэча межаў не мае,
здаецца, маўчыць, нямая,
кроў не цячэ з яе ран.
А можа, гэта падман?

А недзе на цёмных хмарках
душы сяброў усміхаюцца:
боль не ўтрымаў іх у рамках,
няхай сабе пакалыхаюцца…

Паміж расахатых вербаў
гайданку месячык выбраў,
хвастом зачапіўся за крук,
не мае месячык рук…

І я не маю прытулку,
выходжу з хаты на вулку.
Хата мая занята —
сядзіць там адна вар'ятка.

1. 04. 2013

Адна

Адна ў беспрытульнай цямрэчы…
Дзе Твае мужчынскія плечы?
Дзе Айцоўская воля здалечы?
Спіхнеш маё сумнае ложа
да супакою падножжа,
і скончыцца падарожжа,
Духу Святы, Мой Божа!

І прыйдзе новае ранне,
і сэрца балець перастане,
і сонейка не загляне…
Духу Святы, Мой Пане!

І хто ж падасць мне кілішак
у мой халодны зацішак, –
хто, як не ты, мой сябра святы,
паэта святы Францішак?

1.04. 2013

Сон

Лясная дарога заліта асфальтам.
Ехала я ў машыне з нейкім ветлівым франтам.
Ці багатыя франты ў снах выдаюць гранты?
Ці багатыя франты усе цяпер эмігранты?

Не было ў тым аўто ні руля, ні экрана…
Нібы гэта пачатак маладога рамана…
Высокія дрэвы і чыстыя кветкі —
усё, як у вершах адной забытай паэткі.

А паэтка, з мінулых дзён апанентка, —
амбітная, не маладая какетка,
на сядзенні сядзіць ды са мной размаўляе
і камень у сне за душой не трымае.

Такую мне ночка прыдумала рандку!
Няхай бы той сон не канчаўся да ранку!
Так ехаць — ад могілкаў аж да Бурносаў…
Вядома, паззія — гэта не проза…

А душачка мамы, як сонечны лісцік,
над роднай дарожкай ляцела кудысьці…
А душачка таты глядзела здалёку —
у добрага Божанькі навідавоку.

2. 04. 2013

Тата

Заходзіць у сон апаўночы
ў здзірванелы садочак цётчын.

Так часта здараецца ў стомленым сне:
палохае цётчына хата мяне,
так страшна было калісьці, даўно,
як немец пастукаў да цёткі ў акно…
А неба ў тым сне, нібы чорная сажа.
А тата глядзіць на мяне ды і кажа:
— Дануся, аддай мне нашага хлопца!
Яму ж, як жораву, палётаць шчэ хочацца.
А тут, дзе лётаюць душы цяпер,
анёлы лётаюць — без крыл, без прапелера…
Дзе вы жывеце — там морак, балота…
Сажалка высахла, жораў не лётае.

Кажу я тату:
— Ты нас не чапай!
Няхай наш хлапчына, як чапля, чапае,
нібы ў чарадзейным, прыдуманым сне…
Няхай пакутуе каля мяне.

А ты вяртайся, адкуль прыйшоў, —
да продкаў, да зімародкаў, вужоў!
Ты мяне цётчынай хатай не страш!
Час для палётаў пакуль што не наш…

Шчэ мы даснім чароўныя сны —
спачатку я, а потым яны,
нашчадак твой, мой стомлены сын…
А прыйдзе час — і мы паляцім…

3. 04. 2013

Сцяг

За гарою крутой
горад стаў на пастой,
люду ў горадзе — рой,
у людзей свой герой…

На гары той смялей,
хто на белай скале
паміж зорак і хмар
кроўю выкрасаў шнар…

3. 04. 2013

Выбраныя

Да мяне пасылаеш з высокіх яснот
гэты нікчэмны, няздатны народ —
пакалечаны, паламаны,
злы, крыклівы ды апантаны…

Я выціраю ім лапкі,
абуваю на лапкі лапці…
Ні ўдзячнасці, ні прывітання —
ні «з Богам», ні «да сустрэчы»…
Хрыпенне ды скавытанне.
Іх вусны мову калечаць.

І Ты мне іх аддаеш,
каб жылося ім крыху лепш?
Я сама на самюткім дне…
Дух Святы, выцягвай мяне!

На дне нячысты прыцях,
штурхае пад рэбры ўсіх,
і віжуе там гадаўё…
І яно таксама — Тваё.

4.04.2013

Учора — як заўтра

Учора ісці было можна,
але і сёння не позна.
І не адкладвай так болей,
каб не было — на ніколі…

І так ты далёка зойдзеш,
і так сваё месца зоймеш…
Запрашай сабе, каго стрэнеш
сярод свайго пакалення.

Ідзі за тым, хто марудзіць,
ці перад тым, хто заблудзіць,
за тым, хто цябе стварыў,
перад тым, каго ты ствараеш, —
бо ўсіх сам сабе выдумляеш…

Падсвядомасць родзіцца ў сэрцы,
свядомасць сядзіць пры талерцы…
Усе вясновыя катаклізмы
адбіваюцца ў постмадэрнізмы.

Не хавайся ў густым алешніку,
лепей звіні на арэшніку
ўзімку, вясной і летам
перад бязмежным сусветам.

Не падпальвай вогнішча вершамі,
над полымем іх развешвай:
бо вершы — вёрсткія вельмі,
як каткі, залазяць на вербы.

Не зачыняць неба ў вачах,
добра гучаць пры свечках.
Не заця гваюць вершы ў адчай,
у адчай зацягвае рэчка.

Кожны верш, самы горшы,
падарыць табе можа грошык, —
няхай сабе коціцца па вярсце,
нібы пакаці-гарошак…

Няхай сабе дрэмле ў кішэні,
магчыма, твой лёс пераменіць.
Пераменіць твой лёс або не, —
верш анікога не абмане.

18. 04. 2013

Зноў пра дожджык на досвітку

Дожджык прыходзіць дахаты
на досвітку п'янаваты.
Вядзе яго п'яная хмарка, —
і пачынаецца сварка.

Лепш не чапай гэтай хмаркі —
па скуры пойдуць запаркі.
Не гладзь яе супраць поўсці,
хмарка ўмее помсціць.

І з дожджыкам марная спрэчка —
ён бывае злосны, як печка.
Уцякай ты ад іх, а наверсе
пасядзі сабе ды пагрэйся…

18. 04. 2013

Марс і Венера

Такія ўсяленскія дзеі,
і вынік іх вельмі мізэрны:
планета Марс халадзее,
а Венера гарачая вельмі.

Марс маленькім быў, не дарос,
закаціўся на крэйку нябёс,
здалёку холадам бліскае.
А Венера да сонца блізка.

Сонейка свеціць усім —
гарачым, халодным і злым,
гаючымі промнямі лашчыць
і тых, каго нават не бачыць…


Так думаю: а няўжо,
калі стану толькі душой,
буду лётаць з Венеры на Марс,
і забуду вясёлых вас…

24. 04. 2013

АПАВЯДАННІ

ШКОЛА ТАНЦАЎ

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ



Фота «Крыніца»

СЛАЎНАЕ МОРА, СВЯШЧЭННЫ БАЙКАЛ

—Ты на Байкале быў? — спытаў Срабрэц. — На баркасе плаваў?..

Яны пілі гарэлку «Руслан» і запівалі падобным на кока-колу і на колішняе савецкае сітро газаваным напоем «Байкал», таму Срабрэц і спытаў: «Ты на Байкале быў?..»

Перад тым яны сядзелі і гаварылі пра жыццё. Яны й сышліся, каб пасядзець і пагаварыць пра жыццё, але пасля забыліся і напіліся.

Чэрня паспрабаваў успомніць, ці быў ён на Байкале. Па ўспамінах, нейкіх цьмяных, выходзіла, што не быў.

І на баркасе не плаваў. Ён нават не ведаў, што такое баркас. Човен нейкі, але які?

— Не быў…

— Дык запрашаю!

Яны пачыналі ўжо трэцяю пляшку — і Чэрня не здзівіўся.

— Калі?

— Сёння. Чаго цягнуць?

— Цягнуць няма чаго, — згадзіўся Чэрня. — Ката за хвост.

Кот Бонус ляжаў на стале паміж пляшкай з «Русланам» і бутэлькай з «Байкалам», слухаючы размову, якая нарэшце падалася яму цікавай, і кот паглядзеў на гаспадара ўхвальна: «Малайчына! Чаго цягнуць?..»

— Тады грошы патрэбныя, — сказаў Срабрэц. — На самалёт. Цягніком доўга.

Чэрня згодна кіўнуў. Цягніком, канешне, даўгавата. Дзе той Байкал? Ён і за савецкім часам быў не блізка, а цяпер…

— Толькі ты, Талян, скажы, — паспрабаваў ён перад тым, як рушыць на Байкал, вярнуцца да размовы пра жыццё, — я хіба вінаваты? Працую дзень і ноч, дзень і ноч гарбачуся, а яна…

— Не ві-на-ва-ты ты, Ві-цёк, — сціснуў яму галаву і пацалаваў у лоб Срабрэц. — І я не ві-на-ва-ты! Гарбачуся, працую дзень і ноч, а яна… Грошы патрэбныя.

Грошы, сем тысяч даляраў, назбіраныя за дзесяць гадоў жыцця на машыну, ляжалі ў спальні пад матрацам, так што з грашыма праблемы не было. Праблема была з жыццём — і яна не вырашалася. Гаварылі пра яе, гаварылі — і без толку.

Чэрня схадзіў у спальню і выцягнуў з-пад матраца, на якім спаў, грошы. Жонка думала, што ён ніколі не здагадаецца, на чым спіць. Ён бы, можа, і не здагадаўся, не дадумаўся, тым больш, што думаць не было для чаго, прапіваць грошы ён не збіраўся, але аднойчы перавярнуў матрац, бо нешта пад бокам замуліла, а там яны, у старыя жончыны калготкі закручаныя, ляжаць. І ён ніводнага даляра не спёр — да сённяшняга дня, калі яны ў дарогу спатрэбіліся. Спачатку ён хацеў узяць палову, але прыкінуў, якая яна, дарога да Байкала — і ўзяў усе.

Закаркаваўшы пачатую пляшку і сабраўшы закуску, яны замовілі таксоўку.

Калі выходзілі з кватэры, Бонус заматляў хвастом, замяўкаў, закруціўся ў нагах гаспадара.

— На Байкал хоча, — паспрабаваў адчапіцца ад ката Чэрня, але кот не адчапляўся, і яны ўзялі яго з сабой. У Бонуса была свая, сплеценая з лазы хатка, у якую гэтым разам ён сам залез, хоць звычайна, калі трэба было некуды яго везці, усімі лапамі ўпіраўся.

— Омуля лавіць будзе, — зачыніў Бонуса ў хатцы гаспадар. — На Байкале рыба омуль.

Таксіст у адрозненне ад ката на Байкал ехаць не захацеў — і Срабрэц махнуў рукой:

— Тады ў аэрапорт!

Ужо цямнела, трэба было паспець хоць на апошні рэйс.

— Па-мойму, на Байкал ад нас не лятаюць… — паспрабаваў спыніць іх таксіст, убачыўшы, што грошы з іх можна стрэсці, далёка не едучы. — Лятаюць з Масквы.

— Тады ў Маскву! — сказаў Чэрня, але Срабрэц з таксістам не згадзіўся:

— І з Масквы, і ад нас… На Байкал лятаюць адусюль.

Таксіст уключыў лічыльнік.

— Ну, глядзіце… Адусюль дык адусюль, лятаюць дык лятаюць. Толькі плацім наперад.

Чэрня сунуў яму пачак:

— На!..

Пакуль ехалі ў аэрапорт, Чэрня глядзеў, як скакалі на лічыльніку, светлякамі мітусіліся, няўмольна павялічваючыся, лічбы — і нешта яму гэта нагадвала, але што?..

Жыццё?..

Рыжая лярва ў касе аэрапорта прадаць ім тры квіткі да Байкала, два чалавечых і адзін каціны, не захацела, а калі Срабрэц сказаў ёй, што яна рыжая лярва, выклікала міліцыю.

— На Байкал, значыць, сабраліся? — знайшоўшы ў іх амаль сем тысяч даляраў, дапытваўся ў пастарунку малады, але ўжо палыселы капітан. — А гэта адкуль?..

— На Байкал, капітан, — адказаў на першую частку пытання Срабрэц, бо таго, як Чэрня даставаў з-пад матраца грошы, не бачыў, і сказаць, адкуль яны, не мог. — Ты быў на Байкале?

— Ты мне не тыкай! — адсек усялякае панібрацва капітан, з нечаканай тугой падумаўшы, што не: не быў ён на Байкале. Спачатку ў простай школе вучыўся, пасля ў школе міліцыі, а на Байкале не быў.

— Адкуль грошы? — затармасіў ён Чэрню, які ў цёплым пастарунку прыснуў і не хацеў прачынацца: яму сніўся Байкал і баркас на Байкале. А, можа, гэта быў і не баркас, хто яго ведае, але Чэрня думаў у сне, што гэта баркас — і баркас яму сніўся. Далёкі баркас з белым ветразем. — І дзе вы ката ўзялі, начорта вам кот на Байкале?

Навошта ім кот, Срабрэц не ведаў. Забыўся, што омуля лавіць. А Чэрня не забыўся: бачыў Бонуса на баркасе, чорны кот здалёк відneўся на тле белага ветразя. Адзін кот бачыўся, болей на баркасе не было нікога, і Чэрня не мог уцяміць, дзе яны, ён і Срабрэц, падзеліся?..

У камеры Срабрэц паспрабаваў заспяваць «Слаўнае мора свяшчэнны Байкал…», і Чэрня заспяваць паспрабаваў, але песня не пайшла — і яны заснулі.

— Грошы адкуль? — зноў прычапіўся з раніцы капітан, і Чэрня ўспомніў, што грошы гэтыя ён зарабіў, працуючы на маторным заводзе нарміроўшчыкам.

Капітан не паверыў, упёрыўся ў вочы:

— Сем тысяч на заводзе?..

— Дык за дзесяць год…

— І што: на заводах яшчэ ёсць нарміроўшчыкі?

— Ёсць… — разгублена не зразумеў яго Чэрня. — Як гэта нарміроўшчыкаў можа не быць?..

— А так! — пляснуў па стале капітан. — Таго, чаго няма, значна больш за тое, што ёсць.

Сказаў нешта такое… Філасоф нейкі гэты капітан…

— Дзе яны пяцьсот даляраў падзелі? — падазрона пыталася ў капітана Марына, Чэрніна жонка, якая была медсястрой і палюбоўніцай галоўнага ўрача шпіталю, у якім была медсястрой, і таму ў ноч, калі муж забраў грошы і на Байкал сабраўся, дзяжурыла. — Не маглі ж яны прапіць пяцьсот даляраў? — налягала яна на капітана, і той ужо шкадаваў, што не паслухаў яе мужа, які, пад раніцу працверазеўшы, прасіў выпісаць любы штраф, толькі не выклікаць жонку, бо мала тады не будзе і яму, і капітану, але ж трэба было пераканацца, што грошы гэтыя мужыкі не ўкралі. — Я прэзідэнту на вас напішу! Нават ката не папаілі, замучылі, злодзеі, звяры!

Чэрня вінавата глядзеў на капітана: «Я ж прасіў цябе, я ж табе казаў…» — а Срабрэц радаваўся, што, дзякуй Богу, Чэрня, а не ён ажаніўся з Марынай, іх колішняй аднакласніцай, але ж потым ажаніўся і ён, хоць і не з Марынай і нават не з аднакласніцай, але якая розніца, калі ажаніўся — лепш бы яшчэ тады, дваццаць гадоў таму, на Байкал паехаў.

Капітан дастаў сподак з падрапанай шафы і наліў Бонусу вады… Яны глядзелі, як кот сасмягла, захлёбваючыся, лыктаў, і Чэрня са Срабрацом усё менш разумелі, куды гэта яны ўчора сабраліся, а капітан, дыктуючы Марыне расліску: «Я, грамадзянка такая… грошы ў суме…» — прыкідваў, што яму рабіць пасля дзяжурства, да Марыны… таксама, дарэчы, Марына… адскочыць, ці ехаць адразу дахаты, і раптам падумаў, ката пагладзіўшы, што ў сподку вада, мусібыць, гэткая самая, як і ў Байкале.

28.02.2010, Мінск

ШКОЛА ТАНЦАЎ

Галіна Язэпаўна памерла ў цягніку Мінск–Мурманск. У чацвёртым вагоне, у трэцім купэ на ніжнім дзявятым месцы.

Ёй у Мурманск не трэба было. Не было да каго. Проста яна любіла ездзіць у цягніках — і пад канец свайго зямнога шляху вырашыла выбрацца ў апошнюю вандроўку. У самую далёкую, у якую можна выбрацца з Мінску без перасадак. Галіна Язэпаўна не любіла перасадак, бо заўсёды губляла на іх ці валізы, ці дакументы, ці грошы.

Перад гэтым гадоў пяць яна моцна хварэла, амаль не магла рухацца і рабіла вось што. Купляла да першай станцыі, Маладзечна ці Барысава, самы танны квіток, заходзіла ў вагон, як толькі абвяшчалася пасадка, даставала мяшэчак з ядой: яйкі, соль, памідор з гурком — раскладвала ўсё на сурвэтцы і замаўляла гарбату. Праваднікі звычайна пачыналі лаяцца: «Яшчэ цягнік не рушыў! Якая гарбата!» — але кожны раз Галіна Язэпаўна кожнага з іх неяк угаворвала, сядала і ела, з асалодай частуючыся вагоннай гарбатай. У тонкай шклянцы, у бліскучым — пад срэбра — падшклянніку. Вось дзеля гэтага рытуала яна і квіток купляла, і ў цягнік сядала. Калі да адыходу цягніка заставаліся хвіліны, і праваднікі пачыналі зачыняць дзверы, яна сыходзіла на перон і доўга глядзела ўслед апошняму вагону.

У яе не было нікога ні ў Барысаве, ні ў Маладзечне. Нідзе ў яе нікога не было. Апроч, можа быць, мяне. Хоць сказаць, што я ў яе быў, можна хіба з нацяжкай. Так, завітваў іншым разам, дапамагаў ёй да цягніка дайсці, чакаў, пакуль яна вып'е сваю вагонную гарбату — і праводзіў дадому. Праз гэта яе новы сусед, адстаўны палкоўнік, які пасяліўся праз сцяну, напісаў у міліцыю, што я хачу грамадзянку Г. Я. Бельвядэрскую нейкім чынам звесці са свету і ўсяліцца ў яе кватэру.

— Бельвядэрская… — грацыёзна падавала ў свае семдзесят гадоў руку для пацалунку Галіна Язэпаўна, і ўсім здавалася прозвішча гэтае аднекуль знаёмым, знакамітым, кожны недзе яго чуў, хоць і даўно. А Галіна Язэпаўна, як яна казала, сама сабе яго прыдумала, калі была акторкай і мела такога наменклатурнага палюбоўніка, які ўпісаў гэтае прыдуманае ёй прозвішча ў яе сапраўдны пашпарт. За гэта яна кахала таго наменклатуршчыка даўжэй, чым іншых, нават нарадзіла ад яго дзіця, якое памерла ў радзільні, і больш Галіна Язэпаўна нарадзіць не магла. Дзіця тое, дзяўчынка, пражыло ўсяго некалькі гадзін, але Галіна Язэпаўна паспела даць свайму дзіцяці імя — і пасля ўспамінала: «Гэта было тады, калі Бог даў мне і Бог забраў у мяне маю радасць, маё шчасце, маё жыццё, маю Кардэлію…» Галіна Язэпаўна ў той час, калі ў яе нарадзілася і памерла дзіця, марыла сыграць ролю дачкі караля Ліра ў драме Шэкспіра, але мара тая памерла таксама. Увогуле ў жыцці Галіны Язэпаўны было шмат смерцяў — і калі б не радасць ад паездак у цягніках, ад яды ў купэ і вагоннай гарбаты, дык яна б і не ведала, што ў гэтым жыцці ёсць такога, каб яго любіць. Не любіць жа ёй жыццё за тое, што пад канец яго да яе прысуседзіўся адстаўны палкоўнік. «Раней я, — спрабаваў жартаваць палкоўнік, — прысуседзіцца не мог. А цяпер магу, дык чаму не прысуседзіцца?..»

Яна яго, палкоўніка, не трывала. І ўсяляк тое паказвала. А ён да яе заляцаўся. І таксама ўсяляк тое паказваў. Заходзіў, газеты прыносіў, абвёўшы нешта ў іх чырвоным фламастарам. «Прачытайце, тут цікава…» Што можа быць у газетах цікавага? Галіна Язэпаўна драла іх — і яе котка ў тое ашмоцце свае лайнешкі заграбала, а палкоўнік газеты насіў і насіў.

Вось котку Фурцу (названую так, бо міністрам савецкай культуры, а значыць, і начальніцай над усімі тэатрамі была ў той час жанчына з прозвішчам Фурцава) Галіна Язэпаўна любіла. Але і котка Фурца памерла, а пасля памерла і Фурцава, якая была міністрам.

Ад чаго я весялюся?
Я на Фурцавай жанюся!
Буду мацаць цыкі я
Самыя марксіцкія!

— праспяваў прыпеўку, прыйшоўшы да Галіны Язэпаўны з газетамі і хатняй вішнёўкай, адстаўны палкоўнік, і яна вішнёўку выпіла, бо любіла вішнёўку, а палкоўніка, хоць той і прыпеўку праспяваў, пратурыла, бо не любіла.

Адбылося ўсё гэта пры мне. Прычым, я застаўся ў кватэры, а палкоўнік — не, дык ён і напісаў у міліцыю, што я збіраюся ягоную суседку звесці са свету, спойваючы яе самаробнымі, небяспечнымі для жыцця напоямі.

«Гадзюган!» — сказала пра адстаўнога палкоўніка Галіна Язэпаўна і наліла вады на ганак. Палкоўнік уставаў раней за ўсіх у доме, дзе яны жылі, і выходзіў у двор прысядаць. Трымаць форму, бо раптам з Галінай Язэпаўнай ажаніцца выпадзе. Была зіма, палкоўнік паслізнуўся на лёдзе, зламаў, грымнуўшыся з ганку, нагу ў сцягне — і насіць газеты Галіне Язэпаўне не мог. Ужо не кажучы пра тое, каб з ёй ажаніцца. А тым больш — пражыць мядовы месяц у цягніку. Яна кажа, што пражыла некалі свой месяц мядовы ў цягніку, наўмысна дзеля гэтага выйшаўшы замуж. Але не кажа, за каго…

Я ў цягніку з Галінай Язэпаўнай і пазнаёміўся, калі ехаў з Мінска ў Талін. Быў некалі такі фірменны цягнік, «Чайка» называўся. Мяне здзівіла жанчына, якая, як толькі ўвайшла ў вагон, расклала яду на сурвэтцы і запатрабавала гарбаты.

— Хочаце?.. — працягнула яна мне пабітае, усмятку зваранае яйка, з якога выцякаў жаўток, які запляміў ёй спадніцу. Я падаў ёй насоўку, яна выцерла пляму і схавала насоўку ў сумачку, як сваю.

— Пральную машыну купіла, але ж не падключаць машыну, каб насоўку папраць. Рукамі памыю. Прыдзіце — аддам.

І яна выйшла з вагона. Гэта мяне здзівіла яшчэ больш, чым тое, што яна, толькі-толькі ўвайшоўшы ў вагон, пасцяліла сурвэтку і пачала есці.

Я прыйшоў да яе, вярнуўшыся з Таліна — яна напісала адрас.

— Мне было тры гады, калі памерла маці, і трынаццаць, калі мяне знайшоў у чужых, зусім чужых людзей бацька. Той дзень, калі ён знайшоў і павёз мяне дахаты, быў самым шчаслівым днём у маім жыцці. У вас жывая маці? І бацька ёсць?.. Тады вы ўявіць сабе не можаце, што значыць быць круглай сіратой — і раптам займець бацьку. Мы селі ў цягнік, бацька адразу спытаў: ты галодная? Канечне, я была галодная, як сірата можа быць сытай? Вы не сірата, вы гэтага не ведаеце. Калі б вы былі сіратой, вы б маглі палюбіць мяне, як маці.

Я не мог палюбіць яе, як маці. У мяне была маці, якую я любіў.

— Тады, як сястру. Старэйшую…

І сястра ў мяне была… У адрозненне ад Галіны Язэпаўны, якая не мела нікога, я меў усіх: бацьку, маці, сястру, брата — і ў мяне не толькі бабуля з дзедам, а нават прадзед быў яшчэ жывы...

— Бацька разаслаў сурвэтку, паклаў на яе гуркі, яйкі, памідоры, было лета, сонца бліскала на срэбным падшклянніку, у якім праваднік прынёс тонкую, якая таксама бліскала, шклянку гарбаты — такой смачнай, якой не смакавала я раней ніколі: вы не заўважалі, што гарбата ў цягніках нейкага асаблівага смаку, нават калі праваднік запарвае самы звычайны, крамны пакецік…

Я не заўважаў. Я шмат чаго не заўважаў да таго часу, пакуль не пазнаёміўся з Галінай Язэпаўнай, якая таксама шмат чаго не заўважала, але зусім не тое, чаго не заўважаў я.

— Скажы, дзяўчынка, гэта твой бацька на героя падобны? — спытаў вайсковец, генерал ці хто там, я не разбіраюся, які ехаў у суседнім купэ і зайшоў да нас выпіць. — Пашчасціла табе такога бацьку мець, я б таксама хацеў мець такога.

Яшчэ б не!..

Бацька пазней, калі я ўжо вырасла, прызнаўся, што дамовіўся з тым вайскоўцам за выпіўку, каб той прыйшоў і так сказаў, але якая розніца, схітраваў бацька ці не, калі ён і праўда здаваўся мне героем. Знайсці мяне ў прасторы ад Магадана да Мінска было не лягчэй, чым іголку ў сене, а ён знайшоў, пасадзіў у цягнік, адразу накарміў і павёз дахаты.

Яшчэ пазней мой бацька прызнаўся ў тым, што забіў маю маці. З пісталета ў патыліцу. Вы падумалі, што застаў яе з палюбоўнікам? Дык вось не. Гэта яна застала яго з палюбоўнікам. Ён раззлаваўся, што яна падлавіла яго — і забіў. Пасля дзесяць гадоў ён сядзеў, а я жыла сіратою.

Гэта змяніла мой лёс. Гэта ўсё нутро маё змяніла.

З таго часу бацька перастаў для мяне быць героем. Але тое, чым і як ён мяне, знайшоўшы, адразу пачаставаў, на ўсё жыццё ў мяне запала, стала маім святам. Я святкую яго так, як святкавала з бацькам. Гэта можна рабіць у любы дзень, у які куды-небудзь адпраўляецца які-небудзь цягнік. А які-небудзь цягнік адпраўляецца куды-небудзь штодня, толькі далёка я ўжо не магу ездзіць, дый блізка цяжкавата… А так бы ў мяне кожны дзень магло быць свята. Хоць свята не адчуваеш, калі яго спраўляеш. Гэта клопат — спраўляць свята. Свята павінна быць бесклапотным. Як у нас з вамі, бо вы не адчуваеце да мяне клопату ні як да маці, ні як да сястры, ні як…

Яна не дагаварыла, як да каго яшчэ, але я зразумеў.

Я адчуваў да яе клопат. Не як да маці ці сястры, або яшчэ да каго, пра што яна не дагаварыла, але адчуваў. Бо яна нечакана стала дарагім для мяне чалавекам. Не праз дзівацтвы яе, не праз вагонную гарбату, не… Ні праз што. Так — ні праз што — кахаюць, але ж я не мог яе кахаць?

Ці мог?..

Аднойчы мы былі ў тэатры, глядзелі «Караля Ліра». Яна хадзіла толькі на спектаклі па гэтай драме Шэкспіра — больш ні на якія. Калі на сцэне з'явілася Кардэлія, Галіна Язэпаўна падалася да мяне і сціснула руку. Яна не адрывала позірку ад сцэны, уся была там, дзе наймалодшая дачка Ліра так любіла бацьку, так любіла, а ён так пакрыўдзіў яе, так пакрыўдзіў, — але як яна сціснула, як сціснула мне руку, якая хваля прайшла ад пальцаў да пляча, да сэрца, па мне ўсім — якая хваля!..

Свята не адчуваеш, калі яго спраўляеш. Гэта клопат — спраўляць свята. Свята павінна быць бесклапотным

Пасля гэтага я часцяком думаў: што між намі магло быць, калі б мы спаткаліся, не разведзеныя ў часе? І чым часцей пра гэта думалася, тым больш здавалася, што час з намі абышоўся несправядліва. Як кароль Лір з Кардэліяй.

— Ведаеце, я сёння падумала, што магла б пакахаць гэтага палкоўніка, нават пражыць з ім жыццё — вось у якім я сёння стане, і вы мне патрэбныя, каб я перастала так думаць, — патэлефанавала яна мне за дзень да таго, як паехала ў Мурманск, але я не прыйшоў да яе, раптам пачуўшы, як чапляецца за падсохлы язычок яе голас у ссушаным горле — і падумаўшы: старая.

— Вам здаецца, што я старая? — спытала Галіна Язэпаўна яшчэ тады, калі я застаўся, а яна пратурыла палкоўніка, і шчыра ўсклікнуў: «Ну што вы!..» — бо па выглядзе яна не здавалася мне старой, зусім не здавалася, а вось па голасе — за два дні да смерці — здалася, і я не прыйшоў яе суцяшаць, шкадаваць, затрымліваць, адпусціў яе ў дарогу, у якой яна памерла.

Рана ці позна маладосць становіцца бязлітаснай да старасці, рана ці позна…

Пра смерць Галіны Язэпаўны я дазнаўся ад палкоўніка, які патэлефанаваў мне і сказаў, што, збіраючыся ў Мурманск, яна жалілася на мяне — і прапанавала яму, палкоўніку, паехаць з ёй. Ён спытаў: «А да каго мы паедзем? Хто ў вас ёсць і што вам трэба ў Мурманску?» — і калі Галіна Язэпаўна адказала, што нікога ў яе ў Мурманску няма і нічога ёй там не трэба, ён упершыню заўважыў, што яна дзіўнаватая. Настолькі дзіўнаватая, што з ёй нельга ажаніцца — не для палкоўніка такая жонка.

На хаўтурах палкоўнік казаў, што суседка ягоная была незвычайная жанчына, ён усялякіх бачыў, але такіх не сустракаў — і, кажучы гэта, плакаў. Дзіўна было бачыць, як слёзы цякуць з вачэй чалавека, пра якога ты пастанавіў, што ён пень дубовы — і не можа плакаць.

— Калі я зламаў нагу, я доўга не падымаўся, бо надта балела. А Галіна Язэпаўна прыйшла мяне праведаць і ўбачыла на шафе патэфон. Стары, ад вайны яшчэ, і яна спытала: «Вы таньчыце?» Я не танцаваў ніколі, а яна зняла, на зэдаль ускочыўшы, патэфон з шафы: «Запрашаю ў школу танцаў!..» Нібы ў мяне нічога не зламанае, не баліць… І я забыўся, што яшчэ паўгадзіны таму ўстаць не мог, што ўвогуле не танцаваў ніколі — і мы танцавалі. Доўга… Потым яна пайшла, я зачыніў дзверы — і ўпаў, як толькі дзверы зачыніў, як толькі яна пайшла. Яна цуды ўмела рабіць, разумееце? І я ўцяміць не магу, як яна памерла, калі ўмела цуды рабіць? Магла б жыць… А то вунь пустая кватэра засталася — у яе ж нікога. Можна было з маёй аб'яднаць, столькі прасторы для школы танцаў…

Палкоўнік выглядаў нібы не палкоўнікам.

На дзевяць дзён я пайшоў на могілкі. Набліжаючыся, пачуў музыку: аргенцінскае танга. На грудку Галіны Язэпаўны стаяў патэфон. Круцілася кружэлка — і палкоўнік таньчыў каля магілы.

— Перастаў разумець, як жыць? Дзеля чаго?.. — казаў ён мне, калі мы там жа, на могілках паміналі нябожчыцу. Сяду з раніцы перад акном і гляджу на вуліцу. А з вуліцы глядзяць на мяне. І ўсё… Трэба рабіць нешта. Давайце з'ездзім куды-небудзь на якім-небудзь цягніку. Раскладземся ў купэ — яйкі, гуркі… Вось так… Адразу замовім гарбату… Што яна ў гэтым знаходзіла? Трэба ўцяміць. Тады, можа, і астатняе зразумею. Паедзем? Абяцаеце?..

Я паабяцаў, але не паехаў. Куды і навошта было мне з ім ехаць?..

З часам я, мусібыць, пачаў бы забывацца на Галіну Язэпаўну. І пра тое, што яна жыла, і пра тое, што памерла. Жыццё круцілася хутчэй за кружэлку. Але забыцца на памерлую акторку не давалі мне лісты палкоўніка, якія прыходзілі спачатку зблізку, а пасля з краёў усё больш далёкіх.

«…я прадаў кватэру, плюс пенсія — да скону павінна было хапіць, каб у цягніках пасажырам ездзіць, але адзін кемлівы праваднік, калі я распавёў яму, што да чаго, спытаў: а чаму тады не праваднікоМ? Усё тое самае: яйкі, гуркі, гарбата — ды яшчэ й зарплата. Я ўладкаваўся праваднікоМ — і адразу ўсё прапала: не тая гарбата! Ну вось тая самая — і не тая!..»

«…я спытаў яе — пасля таго вечара, калі мяне яна выгнала, а з вамі засталася, памятаеце? — ну што ўва мне не так, што кепска? Чаму вы мяне не трываеце?.. І яна сказала: «Кепска, што вы палкоўнік, які хоча быць палкоўнікам. Разумееце? Вы ўжо палкоўнік — і яшчэ хочаце ім быць…» Я сказаў, што пад пенсію хацеў стаць генералам, тады пенсія большая, дык яна засмяялася: «А гэта яшчэ горш».

«…і паступова, паціху да мяне пачало даходзіць… карацей, без толку я ўсё ездзіў, гарбату піў — дык стоп-кран аднойчы сарваў, выскачыў з вагона і нагу зламаў, тую самую ў тым жа месцы… Ну вось чаму ў тым жа месцы тую самую?.. Мяне прывезлі ў шпіталь, загіпсавалі, а ў палаце па радыё тое самае танга. І медсястра ў палаце. Я паспрабаваў падняцца, запрасіць сястру, танцаваў жа я гэтае танга з гэтай самай паламанай нагой, але і кроку не зрабіў — другая нага падвярнулася. Вось скажыце: чаму з ёй — мог, а з медсястрой — не? Чаму я ўвогуле так жыццё апошнімі гадамі жыву, як бы з ёй гэтыя гады жыў, калі б яна не памерла. Я ведаў, як жыць, і меў лёс палкоўніка і лічыў, што гэта сур'ёзна. А яна давяла мне, што гэта смешна, і цяпер я не маю лёсу ніякага — і жыву невядома як. Ці гэта і ёсць лёс?.. Можа быць. Але ён мяне не дагоніць, не стрэліць у патыліцу».

У канверт быў укладзены фотаздымак: маладыя ў купэ вагона. Ён у вайсковай форме, яна ў фаце. Сядзяць за вагонным столікам, засцеленым дзвюма сурвэткамі.

Я не тое што не пазнаў, нават не падумаў, што гэта яны. Не падобная на Галіну Язэпаўну была нявеста. А ў вайскоўца падабенства з палкоўнікам было… Я перавярнуў фотаздамак — на звароце тым самым почыркам, што і ў лісце, было напісана: «Мядовы месяц».

Праз месяц я знайшоў у сваёй паштовай скрыні газету. Яна называлася «Крымінальны кур'ер». Не ведаю, хто тую газету мог мне ўкінуць, але… Але крымінальны рэпартаж на апошняй старонцы: «Палкоўнік застрэліўся на магіле актрысы», — быў абведзены чырвоным фламастарам.

Бомж, які начаваў на могілках, распавёў журналісту, як яно было. Палкоўнік прыйшоў уночы з патэфонам, завёў кружэлку, пачаў танцаваць, дастаў пісталет, лёг на грудок і, вывернуўшы руку, стрэліў сабе ў патыліцу. Танга скончылася, але кружэлка нейкі час яшчэ круцілася.

Я не ведаю, чаму так, а не інакш пражылі жыццё гэтыя людзі — і чакаю лістоў ад палкоўніка. Галіна Язэпаўна мне ніколі не пісала.

Верасень 2011, Мінск

ВЕРШЫ

УСМЕШКІ

Віслава ШЫМБОРСКА

Надмагілле

Вось магіла забытай, як знакі прыпынку,
старасвецкай паэткі, што ў родным
суглінку
атрымала апошні прытулак, хоць труп
не належаў да польскіх пісьменніцкіх груп.
Напамінам аб вечным яе адпачынку —
гэты вершык, дзядоўнік і совы ўначы…
О прахожы, свой мозг электронны ўключы
і аб лёсе Шымборскай падумай хвілінку.

Каларатура

Стаіць пад штучнай араўкарыяй
з птушынай італійскай арыяй,
танюткай срэбнай павуцінкаю
у оперных нябёсах цінькае.

Рэлігія высокіх Рэ
ў музычны рай жыўцом бярэ,
смяецца ў вочы салаўю:
«у горле флейты сола ўю!»
Як гаспадыня — любых котак,
частуеш нас вяршкамі нотак,
гарэза ля дыезу!

Ды гора! Гіне твая цнота
ў абдымках чорнага фагота:
падкраўся, цяжкі і картавы,
ніжэйшы аж на тры актавы.
Ратуйся, бо пагубіць зараз
basso profondo, мэнэ, тэкел, фарэс!

Загінуць у басовым пекле,
адкуль альты й сапрана збеглі,
дзе на паўгуку глухне нота,
дзе хрып, і храп, і кашаль з рота,
дзе толькі вуснамі на дне
ты будзеш варушыць?! О не!

Хай з дапамогай рыфмы голас
сам выцягне сябе за волас!
Імгненна перавёўшы подых,
ідзі, як па нябёсных сходах,
на крылах радасці й пяшчоты
ляці да найвышэйшай ноты —
і ў душы музыку нясі
ўсім, хто забыць не мае сі…

Клашар

У Парыжы, у ранішнім аж да змяркання
Парыжы,
у Парыжы, як
у Парыжы, які
(о, святая наіўнасць паэтаў, дапамажы
мне!)
у садзе, пры велізарным каменным саборы
(не збудаваным, о не —
зайграным на лютні),
заснуў, нібы ў саркафагу, бедны самотнік,
свецкі манах, гарадскі пустэльнік, клашар.

Нават калі нешта меў, то ўсё страціў,
а што страціў, не прагне вярнуць.
Не атрымаў заробку яшчэ за гальскія
войны,
але даўно зміраўся, не прэтэндуе.
Не заплацілі з пятнаццатага стагоддзя,
хоць быў натуршчыкам, левым
разбойнікам,
а сёння ўжо й не чакае, усім дараваў.

Зарабляе на пляшку чырвонага,
навакольных сабакаў удзень стрыгучы.
Спіць, нібы вынаходнікі сноў,
барадою ловячы сонца ўначы.

Раскамеміўся шраг шэрых хімераў
(кажаногі, крылапы, папугачы,
летуняты, раптухі, галаваступы,
разна-стоены рух у гатычным allegro
vivace)

і глядзяць на яго зацікаўлена,
як на нікога з нас,



Віслава ШЫМБОРСКА (2 ліпеня 1923 — 1 лютага 2012) — польская паэтка, эсэістка, літаратурны крытык і перакладчыца французскай літаратуры.

З 1931-га жыла ў Кракаве, дзе скончыла школу. Вывучала польскую літаратуру і сацыялогію ў Ягелонскім універсітэце. Да 1966-га была сябрам Польскай Аб'яднанай Рабочай партыі (PZPR), але ў 1980-х далучылася да апазіцыйнай арганізацыі «Салідарнасць» і працавала ў польскім самавыданні «Arka» і ў часопісе «Культура», які выдаваўся ў Парыжы.

У 1996 годзе Віслава Шымборска была ўзнагароджана Нобелеўскай прэміяй «за творчасць, якая іранічна-дасканала раскрывае гістарычную і біялагічную сувязь у фрагментах чалавечай рэчаіснасці».

растаропны Пётра
і пільны Міхал,
кемная Ева,
Барбара, Клара.

Памылка

Зазваніў тэлефон між карцінаў у залі,
у мастацкім музеі ўначы загалёкаў;
каб тут спаў хто, ускочылі б і адказалі,
ды навокал — бяссонныя вочы пракрокаў,
каралі й каралевы пад месяцам бледным,
і даўно ўсё адно ім, нябожчыкам бедным.
Пазірае з-пад веера жонка банкіра:
што за дзіўная рэч на паліцы каміна?
Нахіліла галоўку, ды неяк няшчыра;
нібы слухае ўважна, ды неяк карцінна.
Муж (у велічным строі) і дама (без строю)
разабрацца, хто звоніць, не маюць
настрою.
У прыдворнага блазна ў вачах —
чорны гумар:
зараз кат патлумачыць ім, чый гэта
нумар.
Але ў ката ўвушшу — цішыні вечны звон.
(Слухаць вечнасць — таксама нялёгкая
праца.)
А дзівак, што ўначы накруціў тэлефон,
памыліўся. Бо права жывых — памыляцца.

Цыбуля

Іншая рэч — цыбуля.
Яна не мае сярэдзіны.
Так ужо ў ейнай прыродзе
цыбулістычнай заведзена.
На паверхні — цыбуля,
і ў глыбіні — цыбуліна.
Аж заплакала вока,
гэтым цудам расчулена.

У нас — ледзь прыкрыты скурай
боль і драпежнасці лішак,
з нашых вантробаў — хваробаў
анатамічны разрэз.
А ў цыбулі — цыбуля,
без непатрэбных кішак,
голая, нібы праўда,
вечна, паўсюль і спрэс.

Цыбуля была і будзе
найлепшым на свеце творам.
У вялікай цыбуліне —
сховў для цыбулі малой:
за першым — другі і трэці,
чацвёрты і пяты слой.
Як нота, што стала фугай.
Як рэха, што стала хорам.

Цыбуліна — штука духоўная:
сабе нарошчвае, нібы
у гонар сваёй дасканаласці,
новыя й новыя німбы.
А ў нас — нервы, жылы, косткі,
тлушчы ды іншыя сальнасці.
І нам, бедакам, недаступны
ідыятызм ідэальнасці.

Стары спявак

«Ён сёння спявае так: трала-тра-ла.
А я спяваў вось як: трала-тра-ла.
Чуеце розніцу?
І замест таго, каб стаць тут, ён стаіць
тут
і глядзіць не туды, а туды,
хоць адтуль, а ніяк не адтуль,
выбягала, не так як цяпер:
пампа-рампа-пам,
а зусім папросту: пампа-рапма-пам,
незабыўная Тсутсык-Бамбаньеры,
вось толькі
хто яе памятае…»

Усмешкі

Свет болей верыць зроку, а не слыху.
Дзяржаўны муж павінен усміхацца,
бо ўсмешлівы герой не служыць ліху.
Хай цісне страх, няпэўнасць і адказнасць,
ты мусіш паказаць — такая праца —
ім трыццацідвухзубую прыязнасць!

У залі перамоў ці ў будуары
ты маеш кожнай цягліцай на твары
здавацца жвавым, выглядаць шчаслівым.
Расцягваюцца вусны ў прывітанні —
і вырашаюць многія пытанні,
тым болей — перад фотааб'ектывам.

Стаматалогія (ці зубаслоўе)
на службе дыпламатыі і міру:
разцы братэрства, іклы добрай волі
ашчэрваюцца чыстаю любоўю.
Так добра ў свеце не было ніколі,
каб чалавецтва сумавала шчыра.

Я чула ад асвечаных людзей,
што царствам шчасця стане ўся планета,
ды слухала іх словы з недаверам.
Дзяржаўны муж смяяцца б мог радзей —
так, толькі часам. Бо вясна. Бо лета.
Бо ўсмешка не зрабілася ашчэрам.
Бо сутнасць чалавека ў нашым смутку.
І я па ёй сумую пацішутку.

Сон старой чарапахі

Сніць чарапаха салатнае лісце,
а між салаты — жывы імператар,
як у далёкім-далёкім калісці,
нібы сенсацыя, здарыўся раптам.

Так, імператар, што праўда, не цэлы:
чорныя туфлі, зіхоткія спражкі,
лыткі… А колер панчох — такі белы,
што чарапасе ўявіць нават цяжка.

Ногі між Енай і Аўстэрліцам,
сцёгны ў тумане, не бачна адтуль іх.
Маеце поўнае права ўсумніцца
ў лытках і туфлях, і спражках на туфлях.

Хто па фрагментах адтворыць адзінства,
скажа па боце — ягоны ці не?
А ў чарапахі шмат згадак з дзяцінства,
што з іх прыпомніцца ў сне?

Ці імператар? Ці не? На сумленні
у чарапахі сноў такіх шмат:
выйшаў з нябыту — ад пят да каленяў,
знік — ад каленяў да пят.

Першае каханне

Хтосьці сказаў пра каханне:
самае важнае — першае.
Рамантычны, канечне, выпадак,
ды не мой.

Штосьці між намі было — і сплыло,
здарылася — і не.

Не дрыжаць мае рукі, калі знаходжу
дробныя памяткі, стосік лістоў,
перавязаных шнурком —
ужо лепей бы стужачкай.

Наша спатканне, адзінае, праз гады —
размова двух крэслаў
каля халоднага століка.

Іншыя закаханасці
дагэтуль глыбока дыхаюць ува мне.
А гэтаму нестае дыхання —
нават для ўздыху.

Але менавіта такое, як ёсць, яно
можа, чаго ўсе тыя пакуль не могуць:
чым болей забытае,
зніклае нават са сноў, тым бліжэй
знаёміць мяне са смерцю.

Зычлівасць сляпых

Паэт чытае вершы сляпым.
Ён не думаў, што гэта так цяжка.
Ягоны голас дрыжыць.
І рукі дрыжаць.

Ён адчувае, што кожны сказ
выпрабоўвацца будзе змрокам,
будзе змушаны сам даваць сабе рады —
без колераў, без святла.

Небяспечны іспыт
для зораў з ягоных вершаў,
для світанкаў, вясёлак, аблокаў, неону
і месяца,
для рыбіны, што дагэтуль так срэбна
знікала ў хвалях,
а ястраб — так ціха ў высокім небе.

Ён чытае, — бо позна ўжо не чытаць, —
як хлопец у жоўтай куртцы ідзе
па зялёным лузе,
як рухаюцца нумары на спінах
у футбалістаў,
як можна злічыць усе чырвоныя дахі
ў даліне
і ўбачыць на хвілю ў дзвярах аголеную
незнаёмку.

Ён бы хацеў прамаўчаць, — хоць гэта
і немагчыма! —
пра ўсіх святых, што высока,
на катэдральным саборы,
пра той развітальны жэст, праз акно
вагона,
тое шкельца ў мікраскопе,
той праменьчык на пярсцёнку,
тыя экраны і люстры, і твары ў альбоме.

Ды шмат, шмат спагады, зычлівасці,
велікадушнасці маюць сляпыя.
Усміхаюцца, слухаюць, пляскаюць у далоні.

Нехта нават падыйдзе з кніжкай,
разгорнутай дагары,
і папросіць нябачны яму аўтограф.

Эла ў небе

Малілася Богу,
малілася слёзна.
«Зрабі мяне белай
шчаслівай дзяўчынай.
Калі ж для такіх пераменаў запозна,
то, Божа, зірні на маю вагу,
вазьмі хоць палову, Гос-па-дзе!»
А Бог адказвае: «Не магу».
Толькі руку ёй на сэрца кладзе,
кудзеры гладзіць, глядзіць горла ёй.
А потым кажа: «Як будзеш сыходзіць,
прыходзь да мяне, буду рады сваёй
чорнай салодкагалосай калодзе».

Вермеер

Пакуль намаляваная жанчына
у цішы і спакою Rijksmuseum'у
штодзень пераліваe з гарлача
у місу малако, — ні мы, ні Свет
яшчэ не заслужылі
канца свету.

Пераклаў з польскай Андрэй Хадановіч

АПАВЯДАННЕ

НЭНДЗА

Уладзімір КУКУНЯ

Падрастаў я худым, хваравітым і бязбацькавічам. Звычайнае дзіця пасляваеннай бясхлебіцы. Падшыванцы нашае вуліцы дражнілі мяне Нэндзаю. Я адклікаўся на гэтую мянушку, без ахвоты згаджаўся з ёю. Сябрукі ж мае глядзеліся каржакаватымі мацакамі. А з мяне вытыркалася, пэўна, нешта асклізла-здыхлясухотнае.

Напрыканцы лета дактары выявілі ў мяне чарговую хваробу, і на гэты раз сапраўды ў лёгкіх, чым увосмерць налякалі маці.

Мама мая працавала наборшчыцай у раённай друкарні, удосталь дыхала свінцом, і марылася ёй завезці мяне на «юга». Але грошы, самі разумееце… адкуль у сірот грошы? Маці парупілася і знайшла выйсце.

У нашай вобласці, праўда, вёрст за 200 ад мястэчка, адкрылі школу-санаторый для хворых на сухоты. Маці выцерабіла пуцёўку, і ў нядзельку раненька мы выправіліся ў шлях. Людзі побач з намі дапіналіся на кірмаш і з кірмашу нештачкі прадаць, купіць, вымяняць, разжыцца на кус хлеба. Мама ў дарозе дасціпна гаманіла, апавядала пра маю немач. Яе зацікаўлена слухалі, спачувалі і адразу пачыналі скардзіцца на дактароў, базарныя цэны, клялі панства-начальства.

Церабіліся мы спачатку цягніком, потым вялізным тупарылым, крытым цыратаю нямецкім самаходам і яшчэ крышку пешкі. Зморания, дапялі да школы-санаторыя. Мама адлучылася ўладкаваць дакументы, а я ўздрымнуў на лаўцы пад вішняю. Потым у паўсне мяне завялі ў пакой і паклалі ў ложак. Маці наказала не ленавацца пісаць ёй, пакінула стос канвертаў з падпісаным адрасам, пацалавала ў абстрыжаную макаўку і падалася, задумёна-сцішаная, дамоў. У панядзелак яе чакала толькі праца.

Я праспаў астатак дня, вячэру і ноч.

— Уставай, Нэндза! — худы, сінятвары малец, мо на гады два старэйшы, церабіў мяне за плячук. — Сняданак праспіш.

З роднага мястэчка я прыехаў у санаторый адзін. Але і тут мяне дражнілі Нэндзаю. І гэта сярод сухотнікаў. Гляджу я на фоткі тых часоў і дзіву даюся. Ну, белатвары, ну, худы, ну, абголены «пад Катоўскага». На пысе адно рот і вочы. Дык пагалоў такія былі. І на табе — адзін я толькі Нэндза!

Усё наша войска, пад паўсотню рэкрутаў-гаўрыкаў, атабарыліся і былі залічаны на казённы харч у былой панскай рэзідэнцыі. Жылі ў магнацкіх памяшканнях з груваcткімі грубкамі-галандкамі, высачэзнымі вокнамі і дзвярыма. Класны пакой «туліўся» ў былой залі для баляў. А вось «шпакоўні» з выгадамі не было, і за туалет служыла цагляная пабудова за кветнікам вакол фантана — рыхтык зменшаная копія палаца. Хадзіла тут паgудка, быццам панскую сядзібу ўзводзіў прыгонны самавук-архітэктар. Магнат, што абяцаў палескаму Растрэлі волю пасля пабудовы котлішча, слова свайго не стрымаў, усё яно панскае адроддзе такое на вякі вечныя. Дык у адместку «архітэктар» выштукаваў прыбіральню як дзве кроплі падобную на палац…

Школу-санаторый хаваў у засені ўжо здзічэлы, засмечаны парк. Ліпова-кляновыя алеі вялі да зараслае копанкі-стаўка. Летам у ёй купаліся і лапалі рыбу. З гэтае копанкі і пачаліся мае злыбяды.

У першы ж «мёртвы час» санаторнікі схапіліся на прагаліне ў футбол з мясцовымі бутузамі. Я стаяў узбоч і пацiхеньку назіраў за гульнёю. Без дай прычыны мяч стрымгалоў прасвісцеў паўз мяне і панёсся да сажалкі.

— Гэй, Нэндза! — гукнуў нехта з нашых. — Падай мячык!

Ірвануў я ва ўсенькія капыткі, а мячык падскочыў і… бух у ваду. Імкнуся за ім — шусь па пуп у мулю. Цераблюся, ратуюся, а мяне ўсё глыбей засмоктвае. Лямантую колькі здужаю, а мяне не чуюць, насёрбаўся да ноздраў, пакуль хлопцы прыбеглі: ім не я, а мяч быў патрэбны.

— Нэндза ўтапіўся, Нэндза ўтапіўся! — Крычалі дзеўкі і, пазадзіраўшы спаднічкі, на гвалт імчалі да стаўка.

Нават не чыхнуў я, людцы мае мілыя, напэўна, ад пераляку. Адно, крыху падаўгу дражнілі мяне Тапельцам.

Працавалі ў нашай школе вяскоўцы. Гатавала ежу і прала бялізну цётка Марфа, што жыла ў суседстве. Урачом лічылася Ганна Васільеўна, мясцовая медычная сястра. Заняткі вялі настаўнікі з сямігодкі. Нашчадак прыгонных сялян, тубылец Мікола Іванавіч загадваў гаспадаркаю, хадзіў у ухвайцы, нагавіцах-галіфэ і хромавых чабоцях. Высокі, худы, ён курыў самакруткі і пакідаў мажнаватыя «бычкі». Шмат хто з хлопцаў ужо зведаў смак тытуню і пільна сачыў, куды «заўхоз» кіне чынарык. Часам, праўда, Мікалай Іванавіч папыхваў папяросаю з доўгім мунштуком. «Бабамі патыхаюць», — рабілі заўвагу чаляднікі, ды не грэбавалі недапалкам.

Непасрэдна з намі жыла адно Надзея Гнатаўна, маладая зухжанчынка. Адны да яе звярталіся — Загадчыца, другія — Дырэктар. Мы, каб не пераблытаць, звалі яе Загадчык-Дырэктар. Яна часта рупілася ў раён па справах. Тады Мікалай Іванавіч выдаваў цётцы Марцэлі «правізію» і з азартам сачыў за захаваннем няхітрага ладу-парадку. Ніхто з нас сур'ёзна не хварэў — і Ганна Васільеўна-медычка выдавала ў бібліятэцы кніжкі.

— Глядзіце мне, не спаліце, байсручаняты смаркатыя! — папярэджвала і запісвала назву ў сшытак.

Самыя цікавыя творы былі расхоплены ўвобміг, і чытальнікі мяняліся імі, мінаючы бібліятэку. На маю долю прыпалі адно рыцарскія раманы і розная там класіка. Я чытаў усенька запар, нічога не кумекаў, адно радавалі імёны герояў: Рычард-ільвінае-сэрца, Рабека, сястра Керы. Пісаў маці лісты. Хлопцы смяяліся з падпісаных канвертаў, але, ва ўсякім выпадку, іх не кралі.

Тыдні праз два пасля пачатку заняткаў вырашылі правесці вечар адпачынку. Амаль усе рыхтавалі які-небудзь нумар. Надзея Гнатаўна склала праграму канцэрта. Я, як заўсёды, застаўся ні пры чым. Ды нешта жалобна-пакорнае, напэўна, вымалявалася ў маіх, бы ў пабітай сучкі, вачах, і Надзея Гнатаўна, якая ўвогуле не надта заўважала мяне, павагалася крыху ды прапанавала:

— А можа, які-небудзь вершык раскажаш? — і параіла «Парус» Лермантава: «Белеет парус одинокий В тумане неба голубом…» Ведаеш? — спытала. — Вось і цудоўна… — яна нешта запісала ў паперчыну. — Глядзі . Я на цябе спадзяюся.

Упершыню ў жыцці на мяне нехта спадзяваўся. Я з імпэтам добрасумленна прачытаў верш з дзясятак разоў, не менш пераказаў сам сабе ўголас і застаўся задаволены вынікам карпатлівай працы. Ды бліжэй да змяркання ўсчыніўся ў душы сумнеў. Ва ўсіх пакоях ішла актыўная падрыхтоўка. Ад мяне паўсюль адмахваліся і адусюль зганялі, у адзіноце прыткнуўся ў закутку, услухоўваўся ў трывожную цішу. Раптам пачулася: «Ідуць, ідуць».

Зноў пошапам паўтарыў верш, і не раз, і не два.

У класным пакоі сцягнулі парты, паставілі табурэткі.Надзея Гнатаўна завітала ў квяцістай сукенцы. Мікалай Іванавіч — у чорным гарнітуры, але ў гімнасцёрцы. Медычка Ганна Васільеўна, кухарка цётка Марфа, настаўнікі сядзелі паперадзе ў святочных строях, расчырванелыя. На вечар запрасілі вясковых музыкаў з гармонікам і бубнам.

Хлопчыкі і дзяўчаткі спявалі, таньчылі, рэзалі «гапака» і выбівалі «яблычка». Надышла і мая чарга…

Я ўпершыню апрануў бялюткую кашулю, пашытую і вышытую «крыжыкам» мамаю. Пантофлі наглянцаваў сам, плюючы на збітыя наскі і расціраючы аблавушкаю. Парадныя штаны мне палапіла і адпрасавала цётка Марфута. Выйшаў на сцэну і ўзнёсла пачаў: «Белеет парус одинокий… — слухалі ўважліва. Наступныя радкі «играют волны, ветер свищет… — прачытаў скуголячы, як шчаня, і ўспацеў увобміг, як мыш — па залі рассыпаўся смех. Я не разумеў, з чаго смяюцца, і збіўся канчаткова: «Над ним струя светлей лазури, под ним луч солнца золотой…»

Зала ўзвыла і грымнула Перуном з залатога неба. Нічога не цямлю, чытаю апошнія радкі, кланяюся, як мяне вучыла Надзея. Узрываюся плачам, імчу ў дзверы, але перапыняе Гнатаўна, усміхаецца, гладзіць вожык маіх валасоў:

— Усё добра, дурненькі. Ото бяды, збіўся крыху.

Я няўклюдна прыціснуўся да гаваркое сукенкі, адчуў цёплае, мяккае цела — і мне стала лёгка і разам журботна на душы.

Без мяне гудзелі танцы і гульні. Потым усе разбрыліся хто куды. Заснуць не змог, соўгаўся па цьмяных закутках палаца і апынуўся ля пакоя Надзеі Гнатаўны. Мне хацелася папрасіць у яе прабачэння, падзякаваць за чуласць сэрца і ласку рукі. З-пад дзвярэй выплывала пасмачка святла. Я сядзеў на кукішках ля яе і чакаў, слухаў галасы ўзрадаваных людзей і шчыра ім зайздросціў. Раптам палоска знікла, данёсся шоргат і пошап.

Выбег на вуліцу, прымастакоўся на лавачцы. Ад халадэчы схапілі дрыжыкі і зуб на зуб не трапляў. На ганак выцерабіўся Мікалай Іванавіч у гімнасцёрцы і галіфэ, вывудзіў з кішэні карабок папярос, пакамячыў адну, выкінуў, сплюнуў, пашкроб у кішэні глыбей, скруціў, прыпаліў лапацугу, зірнуў у зорнае неба і пацягнуўся ў ноч. Агеньчык у акне Надзеі Гнатаўны пагас.

З першымі промнямі новага дня пачаліся кпіны.

— Ну, ты даеш, Нэндза! Над ним струя… — іржалі сытым табуном хлопцы. Дзяўчаты пырскалі ў кулачкі. На ўроках, калі мяне выклікалі, стаяў рогат. Скончылася тым, што настаўніца адпускала мяне з заняткаў, якія працягвала без мяне. У канцы змены на вечары я зноў чытаў «Парус». А на пытанне цікаўных: «Струю пусціш, Нэндза?» — горда маўчаў.

Нарэшце прыехала маці. Мы вярнуліся дамоў. Урачы выявілі, што лёгкія ў мяне — здаровыя.

Вырас я нармальным дзядзькам. Ды бывае, калі наведваю родную хату, не-не, дый гукне нехта ў спіну:

— Нэндза, прывітанне! Бач, на якое боўдзіла выцерабіўся!..

Але тых знаёмых з кожнай восенню становіцца ўсё меней і меней.

Пераклад з расійскай Аляксея Філатава



Фота www.bk-brest.by

Уладзімір КУКУНЯ ў Берасці больш вядомы як спартыўны функцыянер, звязаны са стральбою з лука. Гадаванец Уладзіміра Кукуні — Барыс Ісачанка — заваяваў на «Алімпіядзе 1980» у Маскве срэбраны медаль.

Але мала хто ведае, што паралельна са спартыўнай працай ён доўгія гады займаўся літаратурнай творчасцю: пісаў апавяданні і аповесці. Таксама перакладаў замежных аўтараў. Нядаўна выйшла ягоная кніга прозы «Віражы белага грака». Змешчаныя ў ёй творы дзівосна спалучаюць жорсткі рэалізм звычайнасці з трапяткімі адносінамі да чалавека, успрымаюць свет і людства такімі, якімі яны ёсць.

Праз магічны крышталь любові…

— Усё добра, дурненькі. Ото бяды, збіўся крыху. Я няўклюдна прыціснуўся да гаваркое сукенкі, адчуў цёплае, мяккае цела — і мне стала лёгка і разам журботна на душы



Фота www.lit-bel.org

Аляксей ФІЛАТАЎ з дзяцінства займаўся спортам, працаваў доўгія гады на спорт, а сёння шукае і знаходзіць былых паплечнікаў па дарагому душы занятку, якія, як і ён, збочылі на пісьменніцкую сцежку. Так ён адкрыў майстроў спорту, трэнераў Васіля Барболіна, Алеся Анцікяна. А сёння вось і Уладзіміра Кукуню.

АБРАЗКІ

ВАСІЛЬКІ

Зянон ПАЗЬНЯК

Рамук

Некалі пад Трабамі пры дарозе стаяў стары дом. І жыў там на хутары Рамук Мацкойць. Наш сваяк, дзядзька Адварды, што быў арганістым у Сурвілішках, часта па дарозе да яго заязджаў яшчэ з маладых гадоў (гэта значыць ад часу І-й Сусветнай вайны). То вады каню, то проста пагаварыць…

Потым, у 15-м, прыйшлі немцы. Вакол шмат пагарэлі, але Рамук застаўся і не галадаў, грэцкі блін меў. У 19-м з'явіліся бальшавікі. Зрабавалі і Рамука. Але калі неяк Адварды зазірнуў да яго ранкам, то грэцкі блін на стале быў.

Вясной таго ж году Пілсудскі прывёў палякаў. Тыя бальшавікоў крыху папаролі, але Рамук таго нават не бачыў і жыў сабе, як раней. Потым зноў прыйшлі бальшавікі, зрабавалі Рамука, а за бальшавікамі — зноў вярнуліся палякі. Цяпер ужо надоўга. Але Рамук неяк не разжыўся, не разбудаваўся.

У 1939-м прыехалі бальшавікі. Пачалі хапаць і вывозіць людзей. Адзін раз Адварды заехаў, Рамук грэцкі блін есць і кажа:

— Пане Адварды, кажуць, што ўсіх вывезуць і будуць тут камуну рабіць. І, кажуць, жонак абагульваць збіраюцца.

Потым прыйшлі немцы. Рамука не турбавалі, праўда, падаткі і нарыхтоўкі плацілі ўжо немцам, і адну дачку ў Нямеччыну вывезлі.

У 1944-м вярнуліся саветы, аблажылі ўсіх падаткамі, кожнае дрэва і кожнае свінчо. Неяк Адварды заехаў, а Рамук яблыні ў садзе пілуе. Зайшлі ў хату. Рамук грэцкі блін есць і кажа:

— Ціснуць, халера, з тых яблыняў не наясіся, а плаці. Няма ходу, пане Адварды, людзі пілуюць, і я спілаваў.

Потым, у 1949-м, пачаліся «калгозы», абагульванне, згон з хутароў, вываз людзей. Рамук ацалеў, бо, баючыся, каб не вывезлі, усё аддаў у «калгоз». Засталася хата, хлеў, «соткі» каля хаты, карова, свінчо ды куры.

У пачатку 50-х, незадоўга да смерці, Адварды, ідучы пехам у Трабы з качарэжкай, зайшоў да таго Рамука.

Жонка якраз ставіла на стол патэльню з грэцкім блінам. Стары Рамук і кажа:

— Пане Адварды, дык што цяпер на свеце чуваць? Можа, якая змена будзе?

Тут Адварды, абапершыся рукамі на качарэжку, якую трымаў між каленяў, адказвае:

— Нібы не чуваць. Але табе, Рамук, што? Сто разоў была тая змена, а ты як еў грэцкі блін, дык і цяпер ясі. Ці табе гэта абходзіць?

— Я так пану скажу: чалавек не скаціна, каб сваім кідацца, але прыглядацца мусіць. Таму і ем, што прыглядаюся. Вунь гэты Альбін Зыгманцюк, на саломе спаў, гарэлку піў. Пайшоў да белых, думаў, каго абдзярэ, дык разбагацее. Цяпер дзе ён, проша пана? О! Ніхто не ведае, бо забралі.

— Ад гультаёў ды галоты і ўся брыдота, — кажа Адварды. — Ну, пара збірацца.

І так пагаварыўшы, ішоў сабе далей.

1 студзеня 2013 г.

Фэлька

Неяк адразу пасля вайны паехаў дзядзька Фэлікс у Вільню. Там «пад галяй» спаткаў земляка, старога знаёмца Віцьку Кондуся. Тое ды гэтае, разгаварыліся, па Вільні ходзяць, у крамы зазіраюць, то пілу, то касу, то кантовую бабку трэба. Зайшлі ў сталовую перакусіць і заадно самагонкі выпіць, якой Фэлька прывёз.

А тут трэба нагадаць, што за Сталінам за самагонку — турма. Але крамную гарэлку і савецкае фруктовае віно (цяперашняе «чарніла») можна было браць на разліў у любой краме, дзе тое прадавалася, і тут жа каля прылаўка выпіць. Словам, піць можна было ўсюды, але толькі савецкае пойла. Праўда, тады п'янства яшчэ не было, і людзі сталінскімі льготамі не надта і карысталіся.

Тым часам нашыя дзядзькі ў сталовай узялі нейкія там савецкія катлеты, Фэлька — бутэльку на стол, разліў па паўшклянкі і задумаўся. А потым узяў і гэтак шырока перажагнаўся дый кажа:

— Ну, з Богам, п'ём, Віцька, за здароўе! — Выпілі і ядуць сабе. Аж тут за суседнім сталом аказаўся нейкі савецкі лейтэнант (Фэлька яго адразу прыкмеціў) і гэтак «по-русски вкрадчиво говорит»:

— Скажите, вот вы перекрестились. Это зачем, чтобы водка слаще стала или как?

Фэлька жуе і гэтак самавіта на ўсю сталовую гудзіць:

— Ну, павінен жа чалавек нечым адрознівацца ад свінні, — і далей жуе.

Віцька аж папярхнуўся ад страху. А Фэлька зноў налівае па паўшкаліка і кажа:

— Ну, з Богам, Віцька, каб не апошнюю.

На лейтэнанта — нуль увагі. Выпіўшы, Фэлька лезе ў торбу, дастае закручаны ў палатно кавалак сала і пачынае наразаць:

— Во, пакаштуйма яшчэ сала. Сваё, свойскае, сам калоў, сам саліў. З кменам, браце, — кажа Фэлька і махае нажом.

Дзядзькі ядуць, а лейтэнант глядзіць. Але неяк звяў, спахмурнеў і выйшаў. Нешта яго як бы спаралізавала. Можа, не зразумеў гаворкі (мова — вялікая сіла).

От так часам бывала пры Сталіне ў нас на Віленшчыне. Фэлька пад страхой яшчэ вінтоўку трымаў. Дык чаго яму баяцца?

14 чэрвеня 2013 г.

Васількі


Гісторыя гэтая пачыналася ў канцы пяцідзясятых. Быў такі Віцька Каралевіч. Добра ў валейбол гуляў і на роварах ганяў, як вецер. Віцька ўвогуле быў харошы хлапец. Яго хвалілі і ведалі. Скончыўшы школу, працаваў шафёрам у саўгасе. Калі хто чаго папросіць зрабіць, з'ездзіць куды, на станцыю падкінуць ці яшчэ што, — Віцька ніколі не адмаўляў, да людзей ставіўся з павагай і любіў пагаварыць са старэйшымі мястэчкоўцамі на розныя тэмы ды іх паслухаць.

З выгляду быў высокі, моцнай косці, сабе на ўме і крыху з гумарам. Гарэлкі не ўжываў. Так, трохі, хіба дзеля смеласці, калі танцы ў клубе. Тады з Вулькай так польку выстукваў, што падлога дрыжэла, а Вулька, расчырванелая ўся, толькі вухкала: «Ух! Ух! У-у-ух!»

Вулька была вясёлая. У клубе толькі і чуўся яе звонкі смех. Дзяўчаты Вульку таксама любілі і каля яе гуртаваліся. Словам, Вулька запальвала ўсіх сваёй энергіяй.

Пасля школы Вулька пакруглела і вырабілася ў такую дзеўку, што о-ё-ёй. Думала паступіць у педагагічны інстытут, але не прайшла па конкурсе, вярнулася і пайшла працаваць рахункаводам у саўгасе. Вульку запрашалі на працу ў клуб, але бацькі сказалі: «Няма чаго на тыя капейкі лезці».

Якраз была ўборка. Камбайны працавалі без перапынку, і Віцька вазіў збожжа. Дні былі гарачыя. Аднойчы Віцька падвозіў Вульку ў суседнюю брыгаду. Абодва трэсліся па палявой дарозе ў душнай кабіне. Віцька раз-пораз кідаў погляды на круглыя, як рэпа, калені Вулькі, глядзеў на яе — крэпкую, расчырванелую, вясёлую — і адчуваў, што пачынае дурэць.



За Сталінам за самагонку — турма. Але крамную гарэлку і савецкае фруктовае віно (цяперашняе «чарніла») можна было браць на разліў у любой краме, дзе тое прадавалася, і тут жа каля прылаўка выпіць. Словам, піць можна было ўсюды, але толькі савецкае пойла

Віцька спыніў машыну, выскачыў і кажа:

— Вулька, Вулька, хадзі, во, нешта пакажу. — Вывеў Вульку і, нічога не кажучы, паваліў у жыта.

— Ты што? Дурны! Дурны! — залямантавала Вулька. Дзяўчына круцілася, падрапала Віцьку твар, нават укусіла яго за руку, аж кроў пайшла. Словам, выкачалі з паўгектара, а Вулька не паддавалася. Віцька стаміўся, нават імпэт прапаў. Тут Вулька раптам сагнула ногі амаль пад бараду і як штурхне Віцьку, дык той і адваліўся. А Вулька ўсхапілася, адляцела да дарогі і крычыць:

— Дурны, дурны, дурны! — І хвігу яму, хвігу: — Во табе! Во табе, во табе! Дурань! Прыдурак! Баран! Казёл! Бацьку скажу! — завярнулася, залезла ў кабіну і сядзіць сабе, валасы папраўляе, гузікі на сукенцы лічыць.

А Віцька стаіць у жыце, рот разявіўшы. Ён ужо і сам адчуў сябе дурнем, лепш бы ўцякла тая Вулька. Шчыра кажучы, яна яму вельмі падабалася, даўно прыглядаўся і сур'ёзныя думкі выношваў. І што на яго найшло — усё сапсаваў. Канец.

Моўчкі залез у кабіну і завёў матор. Каб жа толькі матор! Завялася Вулька.

— Ніколі не думала, што ты такі дурны, Віцька. На цябе паглядзіш — дык здаецца, во, мужчына ўжо сяр'ёзны. А ты — хто? Мача яму ў галаву стукнула — ён і палез. Во кавалер! Во харашун! Ты во прыедзеш, у маткі спытай, як трэба з дзеўкамі абыходзіцца. Цябе, відаць, нічаму не вучылі, дык у цябе розум, як у пеўня.

— Змоўкні, Вулька, — агрызнуўся Віцька, — я цябе не абзываў.

— Не абзываў?! Ты хацеў мяне згвалціць!

І Вулька раптам як залемантуе… Плача, і слёзы, як боб, коцяцца.

Тут Віцька збянтэжыўся не на жарты. Яго павінны былі забіраць у войска ў лістападзе. Усё пайшло наперакасяк, і Вулькі не будзе. Не будзе ўжо. Гэта пэўна.

— Вулька, — хрыпла прамовіў Віцька, — Вулька, даруй. Ты мне да душы, Вулька, павер, але я здурэў. Даруй.

Вулька маўчала, усхліпваючы раз-пораз. Слоўны запас Віцькі скончыўся, і ён маўчаў, не ведаючы, што казаць і што рабіць.

— Вулька, — нарэшце зноў азваўся Віцька, — хочаш, я перад табой на калені стану?

І Вулька перастала плакаць.

— Яшчэ чаго! Як гэта — хлапец і будзе перад дзяўчынай на каленях стаяць?! Перад Богам стань. Мне тваіх кленчаў не трэба.

— І перад Богам стану. Я шчыра, Вулька, вер мне.

Даехалі да брыгады. Вулька выйшла, бразнуўшы дзвярыма, і пакрочыла, не азіраючыся.

А Віцька Вульцы падабаўся яшчэ са школы. От за такога, здаецца, і замуж пайшла б. Толькі ці ж ёй Віцьку пра гэта казаць? І тут на табе — усё абвалілася. І што з такім гарод гарадзіць!

Можа, і разышліся б назаўсёды Віцькавыя і Вульчыныя дарожкі, калі б не нечаканыя падзеі.

Калі Вулька позна вечарам вярнулася дахаты, у доме была злавесная цішыня. Бацька сядзеў пануры і глядзеў у падлогу. Маці хадзіла па хаце.

— Вулька, — выстраліла яна, — што ты сёння з Віцькам у жыце рабіла?

Ад нечаканасці Вулька аж ёкнула, але не адчуваючы за сабой віны, кажа:

— Віцька дабіраўся, але я не далася.

— Паскудніца ты, — закрычала маці, — ужо мястэчка гудзе! Хто табе паверыць, нават калі і не далася?! Чаго ты з ім там скруцілася, каб цябе халера ўжо скруціла, як ты нас зганьбіла.

— Мама, памаўчы, бо цяжка. Віцька добры хлапец, толькі дурнота на яго найшла. Я ж кажу, што не далася. Але калі ўжо людзі ведаюць… Што рабіць? Можа, паеду куды ў свет?

— Ну, дурноту трэба выганяць, — прабурчэў бацька, падняўся і выйшаў. Відаць было праз вакно, што ён сеў на ровар і паехаў.

— Костусь, вярніся! Костусь! — ведаючы яго характар, вылецела ўслед жонка.

Але дзе там! Костусь Пашкоўскі быў чалавек самавіты і разважлівы, але калі яго часам даводзілі да немагчымасці, то адзіным яго аргументам было імкненне даць па мухаедах. Не цярпеў і не згінаўся. Тут яшчэ трэба ўлічыць, што Вулька (самая малодшая пасля трох сыноў) была яго любіміцай, «бацькавай дачушкай». І Вулька без бацькі, было, ні кроку. Глядзіць на бацьку, як на абраз, што бацька скажа, тое і праўда. І з дзяцінства за ім, як хвасток: «Тата, татачка, а запражы коніка», «а вазьмі мяне з сабой», «а чаму пшчолкі не замярзаюць?», «а касіць мяне навучы». Костусь і пра пшчолкі расказваў, і з сабой усюды браў, і касіць навучыў. Вулька вырасла крэпкай, кроў з малаком. Як пачнуць з бацькам касіць, то на пяты яму наступае, толькі паспявай.

Віцька жыў адзін з маці. Бацька загінуў на вайне, а старэйшы брат быў у войску. Сястра выйшла замуж і жыла ў Лідзе. Якраз селі з маці вячэраць, як заходзіць Костусь Пашкоўскі.

— О, і Міхаліха тут. Вельмі добра, — сказаў Костусь.

Віцька ўсё зразумеў: Вулька расказала. Хлапец сцяўся, але ўсвядоміў: настае рашаючы момант. Альбо пан — альбо прапаў.

— Пані Міхаліха хай мне выбачыць, — пачаў Костусь, — але пры матцы хачу пагаварыць з Віцькам, — і, не чакаючы адказу Міхаліхі, — да Віцькі: — Што ты рабіў з Вулькай сёння ў жыце?! Ты чалавек ці ты жывёла, Віцька?!

Віцька ўстаў і кажа:

— Мама, дзядзька Костусь, выслухайце мяне спакойна. Я вінаваты, але між намі нічога не было. Дзядзька Костусь, можаце мяне забіць, але вам першаму кажу шчыра, што люблю Вульку, і яна пра тое не ведае. Але сёння я знішчыў усё…

Віцьку аж самому спадабалася, як ён добра гаворыць, аж тут матка:

— Чакай, дык што ты там знішчыў? Што нарабіў?

— Вульку хацеў, гэта, во, ну сілай значыцца…

— Вульку? Сілай? А мой ты сыночак, гэтую дзеўку сілай і рота не возьмець. Лепш было б па запаведзях. Ты б хоць з маткай параіўся.

Далейшай ганьбы Віцька ўжо вытрымаць не мог. Ён насупіўся — і да дзвярэй.

— Не рабеце з мяне дурня, бо я не дурань. Нічога з Вулькай не сталася. Во пайду і буду гаварыць з ёй. — Сказаў — і за парог.

Віцька завярнуў за клуню і сядзеў там у зарасніках палыну да поўначы, уздыхаючы і думаючы пра нескладнае сваё жыццё.

Костусь з Міхаліхай яшчэ доўга гаварылі і да нечага як бы дамовіліся. Уся бяда, што мястэчка ўжо рагатала і гуло. Аказваецца, што калі Віцька з Вулькай там качаўся, па дарозе на роварах ехаў Броніс Місюк, дзядзька слепаваты, барадаты і языкаты, як і ўсе Місюкі ў мястэчку.


Працяг на стар. 21 (13) ▸

▸ КРАЙ

ГІСТОРЫЯ ВЁСКІ ПАДДУБ'Е

Алесь МАКРАЦОЎ

Чалавек, куды б яго цягам жыцця ні закінуў лёс, заўсёды звязаны нябачнай пупавінай з галоўным на зямлі месцам — месцам нараджэння. Для мяне ім была і застаецца вёска Паддуб'е, што знаходзіцца ў паўночна-ўсходняй частцы Быхаўскага раёна. Яна назаўсёды прапісаная ў сэрцах, душах і пашпартах тых, каго нарадзіла і выгадавала.



На вялікі жаль, ніякіх звестак пра афіцыйнае гістарычнае існаванне на Быхаўшчыне паселішча з такой назвай у нядаўна выдадзеным энцыклапедычным даведніку «Гарады і вёскі Беларусі» я не знайшоў. Таму вырашыў падзяліцца сваімі ведамі і звесткамі, атрыманымі з розных крыніцаў.

Вёска Паддуб'е Грудзінаўскага сельсавета Быхаўскага раёна па ўспамінах старажылаў была заснаваная ў 1924–1925 гадах перасяленцамі з бліжэйшых вёсак Рыжкаўкі і Перакладавіч. Пераважна сем'ямі маладых, беззямельных і малазямельных сялянаў, якія аддзяліліся ад бацькоў. Пасяленне было створанае на землях так званага дзяржаўнага запаснога фонда. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі землі, разам з навакольнымі, належалі петраградскай памешчыцы-графіні. Існавала вёска як два асобныя пасёлкі: уласна Паддуб'е (населены выхадцамі з Рыжкаўкі) і Вясёлы (населены выхадцамі з Перакладавіч). Знаходзіліся пасёлкі недалёка адзін ад аднаго. Мелі яны разрэджаную забудову, былі, па сутнасці, хутарскога тыпу.

Прымусовая калектывізацыя прыватных гаспадарак жыхароў абодвух пасёлкаў прайшла ў 1934 годзе. Тады тут пачаў існаваць калгас імя Н. А. Крупскай. Старшынём яго непрацяглы час быў мой дзед Дзмітрый Арцёмавіч Макрацоў. Затым увесь перадваенны час калгас узначальваў іншы, партыйны старшыня Сцяпан Яфімавіч Кандраценка.

З калектывізацыяй па ўсіх навакольных паселішчах прайшла хваля раскулачвання і высялення «ворагаў народа». Так, многія сем'і працалюбных гаспадароў былі высланыя савецкай уладай далёка на ўсход, у Сібір. У вёсцы Рыжкаўка адбыўся «жаночы бунт». Узброены супраціў прымусовай калектывізацыі аказалі некалькі жыхароў вёскі Давыдавічы…

У час Вялікай Айчыннай вайны Паддуб'е з ліпеня 1941 года па 26 чэрвеня 1944-га было акупаванае. Большасць мужчынаў у пачатку вайны мабілізавалі ў Чырвоную Армію. Перад з'яўленнем немцаў у калгас з раёна прыехаў упаўнаважаны, які сабраў сход, заклікаў браць вілы і сякеры, забіваць паўсюдна фашыстаў і… хутка з'ехаў. Вяскоўцы пасля бачылі, як з боку вёскі Красніца самалёт скідваў парашутыстаў. На Пятро 12 ліпеня 1941 года сяляне здалёк назіралі, як па шляху (з боку Красніцы) на Рыжкаўку, дзе чуліся моцныя страляніна і выбухі, паўзлі варожыя танкі. Праз дзень, пасля абстрэлу вёскі савецкай танкеткай запальнымі кулямі, у Паддуб'і згарэла некалькі хат.

Калгас спыніў сваё існаванне. Немцы пастралялі й забралі калгасных свіней. Вяскоўцы разабралі коней ды інвентар. Падзялілі зямлю, пачалі абрабляць яе аднаасобна. Акупацыйнай уладай у вёсцы для падтрымкі парадку былі прымусова прызначаныя староста і паліцэйскія.

17 ліпеня 1942 года за сувязь з партызанамі карнікі знішчылі суседнюю Красніцу: спалілі разам з жыхарамі. Палілі і іншыя вёскі. Каб пазбегнуць такога ж лёсу, насельнікі Паддуб'я арганізавалі дзяжурства, па чарзе назіралі за ваколіцай. Калі ж узнікалі пагрозы, то хаваліся ў суседнім лесе.

У верасні 1943 года з усходу з нарастаючай сілай пачала даносіцца кананада. Але фронт не дайшоў да Паддуб'я, надоўга спыніўся перад знішчанай карнікамі Красніцай. Тутэйшыя людзі апынуліся ў прыфрантавой зоне. Семярых вяскоўцаў, якія наведаліся па прыхаваныя прадукты — Цімафея Сіўцова, Аксінню Сіўцову, Адар'ю Лаўрэнаву з грудным сынам, Лізу Казлову з малалетнім сынам, дзяўчынку гадоў чатырнаццаці з Перакладавічаў — акупанты залічылі да партызанаў і расстралялі… Напярэдадні Пакровы людзі вярнуліся ў свае хаты, але не паспелі ўладкавацца.

Акупанты на Пакровы выгналі іх з вёскі і перамясцілі далей на Захад (за Днепр у свой тыл). Зрабілі бежанцамі, а тых вяскоўцаў, якія без дазволу засталіся дома, пры затрыманні расстрэльвалі. Працаздольных у бежанстве прымушалі капаць акопы, валіць лес, выконваць іншую працу. Вясной 1944 года значная частка бежанцаў, пераважна моладзь, была вывезеная акупантамі для прымусовай працы ў Аўстрыю.

Пасля вызвалення родных мясцінаў ацалелыя вяскоўцы вярталіся ў сваё Паддуб'е. Мост цераз Днепр каля Быхава быў знішчаны. Але на яго апоры высока над вадой вайскоўцы паклалі вузкія кладкі. Па ім, рызыкуючы апынуцца ў рацэ, згаладалыя знясіленыя людзі перабіраліся на ўсходні бераг.

Больш чым трэць хатаў у Паддуб'і былі спаленыя. Годных для службы мужчын і юнакоў неўзабаве прызвалі ў войска. Саветамі ў вёсцы зноўку быў створаны калгас імя Н. К. Крупскай. Коней у ім не было. Каб узараць зямлю, даводзілася запрагацца людзям: жанчыны станавіліся парамі адна за адной, ды разам цягнулі плуг… Насення ў калгасе таксама не было. Выдзеленае дзяржавай зерне даводзілася насіць за дзясяткі кіламетраў з Быхава альбо Магілёва на сабе (дарослыя па 20–25 кг, моладзь па 15–18 кг). Зімой тых жа калгаснікаў ганялі за 10–25 км на лесанарыхтоўкі.

Карміліся вяскоўцы тады ўсім, што толькі можна было з'есці. Паколькі ж не было посуду, то ежу гатавалі ў снарадных гільзах і салдацкіх касках. Людзі, якія пазбавіліся сваіх хатаў, жылі ў пакінутых немцамі бліндажах, збудаваных зямлянках…

Пасля дэмабілізацыі з войска і вяртання дадому тутэйшых мужчын, у Паддуб'і пачалі адбудоўваць хаты. Калгасны двор пабудавалі паблізу вёскі. Там былі стайня, кароўнік, цялятнік, свінарнік, склады і іншыя гаспадарчыя пабудовы.

Існавала тады вёска ва ўмовах савецкага прыгоннага права: зараблялі вяскоўцы ў калгасе не грошы, а працадні. Сялянам не выдавалі пашпартоў, ніхто з калгаснікаў не мог атрымаць гэты дакумент без дазволу мясцовых начальнікаў. Паводле словаў маёй маці Ніны Севасцьянаўны Макрацовай (1926–2009 гады), якая добра вучылася ў даваеннай школе і імкнулася пасля вайны ўладкавацца на вучобу ці працу ў горадзе, на ўсе свае звароты да тагачаснага старшыні сельсавета з просьбай выдаць ёй неабходныя для атрымання пашпарта даведкі, пасля здзеклівага пытання: «А ў калгасе хто будзе працаваць?» — заўсёды атрымлівала адмову. Крыўда на таго сельсаветчыка, які фактычна сапсаваў ёй жыццё, заставалася ў сэрцы маці да апошніх дзён зямнога быцця.

Мінулая вайна пакінула ў наваколлі многа калючага дроту. Сяляне выкарыстоўвалі яго для агароджвання сваіх прысядзібных участкаў. Большасць вяскоўых надзелаў ахоўвалася такім плотам. Пазней абрыўкі і абломкі саржавелага дроту ранілі босыя ногі дзятвы, траўмавалі неабачлівых дарослых, прабівалі колы веласіпедаў. Іржавы калючы дрот зрабіўся неад'емнай рысай тагачаснай вёскі. Прыхаваныя травою фрагменты злоснай агароджы можна і сёння пабачыць на ўскраіне Паддуб'я…

Нягледзячы на цяжкі побыт, паводле ўспамінаў старых вяскоўцаў, жылі яны пасля вайны дружна: былі спагадлівымі, пры магчымасці збіраліся разам. Моладзь у хатах ладзіла вечарыны. Былі свае вастрасловы і жартаўнікі, танцавалі пад гармонік, з задавальненнем спявалі, жаніліся і выходзілі замуж.

У пачатку пяцідзясятых гадоў вёска была радыёфікаваная. Электрыфікацыя ж паселішча, па ўспамінах аднавяскоўцаў, праводзілася ў 1963 годзе.

Да заканчэння існавання СССР мясцовыя жыхары адчувалі вострую нястачу сенажаці і пашы для сваёй жывёлы. Сялянам суседняй Грудзінаўкі нярэдка даводзілася пасвіць асабістых кароваў (не адзін статак) на палянках і дзялянках у лесе. Колькасць двароў і насельніцтва ў Грудзінаўцы пастаянна павялічвалася. Адна з грудзінаўскіх вуліц выцягнулася на поўдзень амаль да Паддуб'я. Гэта прывяло да таго, што яго афіцыйна ўключылі ў склад Грудзінаўкі. Пра што, як ні дзіўна, большасць жыхароў Паддуб'я даведалася значна пазней, калі мясцовыя вуліцы атрымалі назвы Вербнай і Паддубнай. Праз колькі гадоў са стратай статуса асобнага населенага пункта Паддуб'е нечакана пазбавілася і свайго прыродна-гістарычнага сімвала: навальнічная бура, якая з вялікаю сілай пранеслася тут летам 1984 года, зламала старасвецкі дуб…

Пасля чарнобыльскай катастрофы Паддуб'е апынулася ў забруджанай радыяцыяй зоне. Зноў працяглы час вяскоўцам давялося жыць у няпэўнасці і страху. Аселыя ў гарадах дзеці, за рэдкім выключэннем, перасталі прывозіць да старых на лета ўнукаў. Грудзінаўскую школу-інтэрнат закрылі. Мясцовых школьнікаў сталі ўлетку вывозіць на аздараўленне ў замежжа. Збор ягад і грыбоў у лесе забараняўся. З'явіліся іншыя абмежаванні. Аднак толькі адна сям'я вырашыла скарыстацца правам на перасяленне (аб чым пазней шкадавала).

Побыт вяскоўцаў з гадамі вярнуўся ў звыклае рэчышча. Не зважаючы на абставіны, Паддуб'е працягвае сваё самастойнае жыццё. Ад суседняй Грудзінаўкі яго аддзяляюць глыбокая канава, мінуўшчына, сваё бачанне свету. Сёння ў паселішчы засталося 14 жылых двароў. Колькасць жыхароў паступова змяншаецца (большасць жыхароў — пенсіянеры). Толькі двое гаспадароў трымаюць кароў…

Некалі велічныя шчодрыя на дары лясы пераўтвораныя лесарубамі ў здзічэлыя, непрыветныя пусткі. Большасць прасёлкавых дарог і прылеглыя да іх землі зрэзаныя коламі лесанарыхтоўчай тэхнікі.

Побыт вяскоўцаў апошнім часам палепшыла хіба толькі агульная тэлефанізацыя ды прыватная аўталаўка, што перыядычна па зніжаных цэнах завозіць прадукты…

ВАСІЛЬКІ

◂ Працяг.
Пачатак на стар. 20 (12).

Ён угледзеў Віцькаў грузавік на ўзбочцы і Віцькавы прыгоды. Ён, убачыўшы Костуся, тое яму і расказаў. Ад гэтага Місюка ўсё і пайшло.

Паміж Пашкоўскімі і Міхаліхай пачалася, як кажуць, чаўночная дыпламатыя — ад хаты да хаты. Хлопцы ў мястэчку Віцьку падкалвалі: «Ну, як там Вулька?» Але Віцька трымаў удар: «Ды кінце, хлопцы, сляпы Місюк не тыя акуляры надзеў і брэша. Мы з Вулькай выйшлі васількоў назбіраць. Вы што, верыце яго брахні?»

Тады ўжо пра Вульку ніхто не пытаў, а толькі: «Віцька, ну як там васількі? Растуць?»

Бывала, праходзіць Віцька, а хлопцы на гітары іграюць і спяваюць расейскі пераспяваны вагонны шлягер: «Всё васильки, васильки. Много мерцает вас в поле. Помнишь, вечерней порой мы собирали для Оли».

Скончылася гэтае пад'ялдыкванне тым, што спакойны Віцька пабіўся з хлопцамі і некаторым такі добра надаваў па карку (хоць і самому разбілі нос). Тут ужо «васількі» замацаваліся крэпка. Толькі мовіліся завочна. Нават тады, калі Віцька з Вулькай пабраліся (а інакш быць не магло), то калі йшлі дзе, дык іншыя казалі: «Вунё, васількі йдуць». І хату іхнюю называлі «васількова хата». А як дзеці пасыпаліся, дык усе былі «васількі». «Чые ж гэта, — пыталі, — ды васільковыя».

Вяселле зладзілі ў кастрычніку перад войскам. Добра пагулялі, паспявалі, папілі. А Віцька быў такі важны і горды. У рот не ўзяў (па запаведзях, як матка казала), але ўжо танцаваў з Вулькай да ўпаду, і ўсім увесь час было надта «горка» — у Вулькі аж губы спухлі.

Летам Вулька нарадзіла двойню. Віцька (у войску ва Узбекістане) ад радасці так скакаў, што ледзь на губу не трапіў за парушэнне статута. Але водпуск атрымаў, і, пабыўшы, яшчэ дабавіў. Калі дэмабілізаваўся, меў ужо трох сыноў.

— Я, — кажа, — каб цябе тады ў жыцце не пакачаў, то нічога і не было б.

— Гэта таму, што я табе не далася; заслужыць трэба, дык от і выслужыўся, — рагоча Вулька і ўжо чацвертым пухне.

— Будзем гнаць да перамогі! — грыміць Віцька. — Жыве Беларусь! Колькі Бог дасць! Поўны наперад! Дагонім і перагонім Амерыку па надоях малака на кожную фуражную карову! — разышоўся Віцька. — Да здравствуют наши советские женщины! Люблю Вульку! Вульку люблю! — Віцька жартуе, а Вулька рагоча.

Шчасця было ў іх поўны дом. І ўвесь час, і заўсёды. Віцька (як звычайна ў мястэчку) пафарбаваў сваю хату ў жоўты колер, але зрабіў трафарэт і наштампаваў на сценах сініх васількоў. «Васількі, дык васількі, халера на іх» (гэта пра местачкоўцаў). Потым падумаў, і над ганкам блакітнай фарбаў вывеў: «Няма лепш цьвяточка над васілёчка».

Напісаў і пайшоў у хату абдымаць сваю любімую Вульку.

7 студзеня 2013 г.

НАТАТКІ

УСЁ НА СВЕЦЕ — СЛОВЫ

Іван СКРЫДЛЕЎСКІ



Фота аўтара

***

Класік гістарычнай раманістыкі Вальтэр Скот перапісваўся з расійскім паэтам-ваяром Дзянісам Давыдавым. У Эдынбургу, побач з замкам Вальтэра Скота ў Абатсвордзе, жыў пляменнік Дзяніса Давыдава. Праз яго Вальтэр Скот і прасіў Дзяніса Давыдава прысылаць успаміны пра ўдзел у вайне 1812 года. У адказ жа Давыдаў дасылаў шатландцу свае вершы… А аднаго разу праз пасла перадаў у Абатсворд трафейны курдскі кінжал (хвацкі расіянін напрыканцы 20-х гадоў XIX ст. браў удзел у паходзе супраць персаў). У прадмове Дз. Урнова да 8 томнага Збора твораў Вальтэра Скота, выдадзенага ў перакладах па-расійску ў 1990 г. («Правда»), чытаем: «Вальтэру Скоту неадкладна хацелася мець у сябе ў кабінеце кінжал з Расіі».

Па-імперску блізарукім (ці «дальнабачным»?) расійскае літаратуразнаўства было і часткова застаецца, высвечваючы многія «неімперскія» комплексы. Так, нават кінжал няўрымсціцца яму перакаваць з курдскага ў расійскі. І за ягоным бляскам ужо і не заўважаецца таго, што Вальтэр Скот, плануючы напісаць пра эпоху Напалеона, хацеў атрымаць ад легендарнага сведкі вайны з ім — Дзяніса Давыдава — рэальныя нявыдуманыя сведчанні-згадкі, а не рыфмарствы… Зрэшты, і ці «хацелася мець у сябе ў кабінеце кінжал з Расіі» раманісту, які багатую калекцыю зброі трымаў у асобным замкавым пакоі-музеі? І пісьменнік не любіў на яе глядзець, асабліва пасля абвастрэння хваробы з моцнымі болямі, якія мусіў астуджваць морфіем…

***

Да «расавай чысціні» расійскай літаратурнай класікі: праслаўлены Васілій Жукоўскі — «пабочны» сын тульскага памешчыка Буніна і палоннай турчанкі, які атрымаў прозвішча свайго «хроснага» — беларуса-шляхціча.

***

Леў Талстой публічна называў расійскага цара забойцам, катам, прыдуркаватым гусарскім афіцэрам, пустым і нікчэмным чалавекам, які акружыў сябе злачынцамі. «Я і хавацца не стану, — пісаў аўтар «Вайны і міра», — я гучна абвешчу, што прадаю памесці, каб паехаць з Расіі, дзе нельга ведаць хвіліну наперад, што мяне, і сястру, і жонку, і маці не закуюць і не высякуць, я з'еду».

Імператар Аляксандр III на тое адказаў спакойна: «Талстой чакае ад мяне вянка пакутніка — не дачакаецца». У адрозненне ад Леніна, які бэсціў і мёртвага пісьменніка: «Талстой нікчэмны, як прарок, які адкрыў новыя рэцэпты выратавання чалавецтва».

***

Малаграматны мядзведзісты Аляксандр III на дакладзе расійскага міністра адукацыі пакінуў «гістарычную» рэзалюцыю: «Прекращай ты это образование!». Вось бы пачытаць цяперашнія «надпісы»…

***

Прароча-дальнабачны Салтыкоў-Шчадрын: «Гэта яшчэ добра, калі за рубель пачнуць даваць палцінік. Горш, калі за рубель будуць даваць у морду!».

***

«Вольны муляр», віленскі прадпрымальнік Зыгмунд Нагродскі, які пісаў беларускамоўныя вершы і быў сябрам Францішка Багушэвіча ды пазней фундаваў газету «Наша ніва», распавёў свайму сябру (таксама масону) Івану Луцкевічу аб тым, што першае замежнае выданне беларускіх вершаў Францішка Багушэвіча «Дудка беларуская» прынёс яму, Нагродскаму… Язэп Пілсудскі…

***

Максіма Горкага і Янку Купалу зблізіла многае. І не толькі творчае. Вядома, што Іван Луцэвіч да таго, як стаў Янкам Купалам, працаваў на бровары. І Аляксей Пешкаў — да таго, як выявіўся Максімам Горкім, — уладкоўваўся ў Ніжнім Ноўгарадзе ў кантору гарэлачнага завода. Блізасць да «зялёнага» змея ў абодвух была нядоўгай: Луцэвіч пасварыўся з гаспадаром, на Пешкава накінуўся дырэктарскі сабака, якога ён… ударам кулака забіў (пасля чаго будучага пісьменніка выгналі з завода).

Пазней у брашуры Максіма Горкага «О русском крестьянстве» (1922 год) прачытаем прадумнае: «…пры кепскім харчаванні рускага селяніна атрута алкаголя дзейнічае на псіхіку мацней у Расіі, чым у іншых краінах, дзе харчаванне народа багацейшае і разнастайнейшае».

Пасля расійскай рэвалюцыі 1905 года Максім Горкі выправіўся ў Амерыку — далей ад царскай расправы ды з місіяй збору сродкаў для бальшавікоў. І з грамадзянскай жонкай — актрысай Маскоўскага мастацкага тэатра Марыяй Андрэевай. У ЗША іх прымалі з замілаваннем і сардэчнасцю, пакуль у вольны друк не патрапіла інфармацыя аб тым, што пара з Расіі — не абвянчаная. Гаспадыня нью-ёркскага гатэля выставіла іхнія валізы-чамаданы ў хол і выгнала небаракаў на вуліцу. Пяць дзён Максім Горкі безвынікова соўгаўся па гатэлях, жыў у пісьменніцкім інтэрнацэ. Урэшце адна землеўладальніца Прэстані Марцін запрасіла актрысу Андрэеву да сябе ў далёкае памесце Летні Раўчук. З ёй падаўся і Максім Горкі. У тым памесці і быў напісаны расхвалены ў савецкі час апалагетычны раман «Мать», які мусіў чытаць кожны школьнік СССР — не ведаючы пра перапэтыі стварэння кнігі. Ленін жа — фанат гэтага рамана (ды і нявенчанага сужыцця таксама) — надзвычай пацяшаўся, калі дачуўся пра горкаўскія «блуканні па амерыканскіх пакутах»…

А далей было «ацверажэнне». У час, калі пачаў кіраваць наган, Максім Горкі запэўніваў: «Зноў культура? Так, зноў культура. Я не ведаю нічога іншага, што можа выратаваць нашую краіну ад пагібелі».

Свае «несвоечасовыя думкі» Максім Горкі друкаваў у заснаванай ім газеце «Новая жизнь». Першы нумар невыпадкова выйшаў 1 мая 1917-га. Крыніцу фінансавання газеты пісьменнік назваў публічна: ««Новая жизнь» арганізаваная мной на грошы, узятыя ў Э. К. Грубэ, у колькасці 275 тысячаў, з якіх 50 тысячаў ужо выплачаны крэдытору, астатнюю суму я мог бы выплаціць даўно ўжо, калі б ведаў, дзе жыве Э. К. Грубэ»…

Аграмаднейшыя на той час грошы!

Максіма Горкага поядам ядзяць бальшавікі і асабіста Ленін: і за апазіцыйную газету, і за «думкі». А пісьменнік адбіваецца: а вы, маўляў, сваю «Искру» за чый кошт выдавалі?! І друкуе наступнае:

«У пазыцы, зробленай мною на арганізацыю газеты, я не бачу нічога ганебнага і лічу абвінавачванні яе ў прадажнасці — палітычнай подласцю.

Але, да вашага ведама, я скажу, што ў перыяд з 901-га па 917-ы год праз мае рукі прайшлі сотні тысячаў рублёў на справу расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі, з іх мой асабісты заробак налічваў дзясяткі тысячаў, а ўсё астатняе чэрпалася з кішэняў «буржуазіі». «Искра» выдавалася на грошы Савы Марозава, які, вядома, не ў доўг даваў, а — ахвяраваў. Я мог бы назваць добры дзясятак шаноўных людзей — «буржуяў», — якія матэрыяльна дапамагалі росту с.-д. партыі. Гэта выдатна ведае У. І. Ленін і іншыя старыя працаўнікі партыі».

Аб тым, на жаль, не хочуць ведаць і многія цяперашнія «ленінцы»…

Пасля вяртання ў СССР Максім Горкі карыстаўся адносным уплывам «пры дварах» і Леніна, і Сталіна. І, на колькі ставала сілаў (асабліва пры Леніне) дапамагаў блізкім і знаёмым: то апублікавацца, то выцягнуць кагосьці з засценкаў ЧК. У 30-я гады ягоны імпэт атух…

Аднойчы да класіка звярнуўся Андрэй Платонаў з просьбай дапамагчы ў публікацыі свайго выдатнага рамана «Чевенгур». Максім Горкі адказаў таленавітаму калегу «ободряющим» лістом, у якім падрахаваў: «Всё минется, одна правда останется». І аб платонаўскай публікацыі на тым забыў… А вось Аляксандр Твардоўскі — паўтарыўшы тыя горкаўскія (і не толькі ягоныя) словы ў тэлеграме падтрымкі да Васіля Быкава, ішоў далей суцяшэнняў: друкаваў «крамольныя» аповесці…

***

У цяжкія месяцы ваеннага камунізма Сяргей Ясенін здымаў пакой разам з Анатолем Марыенгофам. Самавар распальвалі драўляным абразом Мікалая-Угодніка: не было ні вугля, ні дроў, ні… У пакоі не раставаў абіты з футраў снег, а чарніла (якім пісаць) замярзала.

Сталі спаць на адным ложку. Навальвалі на сябе гару коўдраў і футраў. Па цотных днях Марыенгоф, па няцотных Ясенін першым курчыліся на ледзяной прасціне, саграваючы яе дыханнем і цеплынёй цела.

Неяк адна паэтка папрасіла Ясеніна дапамагчы ўладкавацца на службу. У яе былі ружовыя шчокі, круглыя сцёгны і пышныя плечы… Ясенін паабяцаў паэтцы заробак савецкай машыністкі — і прапанаваў, каб яна прыходзіла да іх у гадзіну начы, распраналася, клалася пад коўдру і, сагрэўшы ложак («пятнаццаціхвілінная праца!»), вылазіла з яго, апраналася ды сыходзіла дамоў. Даў слова, што падчас усёй цырымоніі паэты-мужчыны будуць сядзець да яе спінамі, утаропіўшыся насамі ў рукапісы…

Тры дні, дакладна выконваючы дамову, яны клаліся ў цёплую пасцель. На чацвёрты ж дзень паэтка сыйшла, абурана заявіўшы, што больш не будзе працягваць сваю службу.

— Што такое? — здзівіліся паэты. — Мы ж выконвалі ўмовы…

— Менавіта! Я ж не наймалася грэць прасціны святым!

Вось табе і імажыністы!.. Ці — бальшавіцкая зіма?

***

Пабла Неруда, вядомы паэт з прарадзімы бульбы — Чылі, лаўрэат і міжнароднай Ленінскай прэміі (1953), і Нобелеўскай (1971), пакінуў каскадна-феерычнае эсэ-гімн мове-слову:

«…усё на свеце — словы, яны спяваюць… Я іх люблю… Якая цудоўная ў мяне мова, якую дзівосную гаворку атрымалі мы ў спадчыну ад змрочных канкістадораў… Заваёўнікі насіліся па дзікіх гарах, па ўзнятай на дыбкі Амерыцы ў пошуках бульбы, золата… А варварам яны сходу кідалі з ботаў, з барады, са шлема, з падкоў, кідалі, як каменьчыкі, зіхоткія словы, якія заставаліся ў нас і свяцілі… Мова… Мы прайгралі… Мы засталіся ў выйгрышы… Яны забралі ў нас усё і пакінулі нам усё… Яны пакінулі нам словы…».

Вось так. Нібыта продкі паэта-лаўрэата — «варвары» Амерыкі (ад прадстаўнікоў і дагэтуль неразгаданых мая) — да таго, як іх заваявалі, былі нямымі малпамі! А гішпанскамоўныя ваяры-каланізатары («старэйшыя браты») падарылі ім «залатую мову»…

Як гэта стасуецца з Беларуссю, па якой і да сёння гойсаюць новыя «змрочныя канкістадоры», таксама — у пошуках «бульбы і золата», кідаючы з ботаў сваіх то салодкія пернікі-даляры, то каменні мацюкоў… І ўжо ўвесь народ радуецца новаму здабытку — «языку», і не задумваецца, што некалі меў уласнае багацце: мову, а не бульбу.

АГЛЯД

«ПАДОБНЫМ ДА СЯБЕ ЗАСТАВАЦЦА…»

«ДЗЕЯСЛОЎ», № 67


ЛеГАЛ

Прамінуў яшчэ адзін год чалавечага і літаратурнага жыцця. Як для мяне, шчыра кажучы, нічым асаблівым ён не запомніўся. Маю на ўвазе, найперш, літаратуру.

Часопісы, кнігі — выдадзенае і прачытанае. Былі, канечне, асобныя азарэнні і ў паэзіі і ў прозе, але не да такой ступені, каб адрываць публіку ад экранаў і манітораў. Увесь калялітаратурны «накіп» цяпер перамясціўся на сайты і ў сацыяльныя сеткі. Там — і тэрміновая перапіска, і безразважнае каментаванне, і гарачая палеміка, і бясконцыя спрэчкі, і самыя што ні на ёсць двубоі і кланавыя разборкі… Каб я гэтым надта пераймаўся, то разумныя мяне залічылі б да дурняў, а калі б зусім не звяртаў увагі, то, мабыць, выглядаў бы насамрэч дурнем, будучы дзейнай асобай у сучасных літаратурных варунках. Таму, як кажуць, я ў курсе, але па-за кантэкстам…

Праўда, ёсць тэмы, якія вымагаюць псіхалагічнай мужнасці і павагі ад абодвух «спрэчных» бакоў. Я кажу пра набалелую для нас праблему дзяржаўнай суверэннасці і нацыянальнай ідэнтычнасці. Дык вось, Пётра Садоўскі друкуе, як па мне, адэкватны, глыбокі, досведны, у меру канструктыўны, хоць і не пазбаўлены эмацыйнасці адказ шчырага беларуса тым (В. Акудовічу, А. Бахарэвічу, У. Мацкевічу…), хто з нейкай прычыны — змушана ці свядома — змірыўся з нацыянальным беларускім змізарненнем і паглынаннем яго карпарацыйна-глабальным працэсам у недалёкай перспектыве… Тэкст, можа, занадта аб'ёмны нават для такой, амаль акадэмічнай, аргументаванай палемікі. Я люблю і паважаю П. Садоўскага і, відома, у пераважнай большасці прыведзеных ім аргументацый знаходжуся на ягоным баку, і ў той жа час, столькі гадоў ведаючы Валянціна Акудовіча, восем з якіх прасядзеў з ім плячо ў плячо ў пракураным пакоі колішняй «Крыніцы», да гэтай пары здзіўляюся яго ўпартай прысутнасці там, дзе, па ўласных словах Валянціна Васільевіча, яго няма і быць як бы не павінна… Для мяне ён «уходящая натура», якая не мае адпаведнай сілы, каб разам з сабою зрушыць і нас з нашага існага месца. Мы застаёмся тут такімі, якімі мы ёсць, паколькі быць іншымі і ў іншай сутнасці нам не дадзена. Аднак і не прыслухоўвацца да той магчымай небяспекі паступовага нацыянальнага «знікнення» («перастварэння» альбо «перараджэння»), якую такім ці іншым завуаляваным чынам трактуе В. Акудовіч, я таксама не раіў бы. Бо той, хто прыслухоўваецца да думкі іншых і аналізуе іх інтэлект, мае нашмат больш шанцаў быць і застацца.

Раю пачытаць, а жадаючым, выказацца ў працяг вострай палемікі…



Далей — да літаратурна-мастацкага зместу чарговага нумара «Дзеяслова». Пачнём з паэзіі. Друкуецца нізка вершаў Рыгора Барадуліна. Пры ўсім сваім сённяшнім наканаванні Рыгор Іванавіч застаецца не толькі жывым, як шмат хто з вядомых яго равеснікаў, але яшчэ і жыватворчым. У розналаднай і калейдаскапічнай вершаванай падборцы досыць адмысловай паэзіі самай высокай пробы, іскрамётна-імгненных яе ўзораў, што ўспыхваюць на захадзе чалавечага дня, нібы тыя сполахі-зарніцы, люструючы пад небам яркія азарэнні нашай зямной долі.

Нялёгкае гэта мастацтва —
Падобным да сябе заставацца…

Зрэшты, сёння ў нас ёсць дзве беларускія мовы — дзяржаўная і барадулінская — мова зносін і мова душы. Адчуйце розніцу!

Вершы Юркі Голуба густаметафарычныя, блізкародныя і пазнавальныя па рытме, стылю і эмацыйным запале. Пры вялікай іх колькасці, шчыра кажучы, яны трохі стамляюць. Таму чытаць іх трэба дазіравана, а не зборнікамі ці нават аб'ёмнымі падборкамі. Яго творы нанізаны, як пацеркі на не звязаную нітку, з якой могуць саслізнуць і з грукатам раскаціцца… Іх стрымлівае толькі творчая воля паэта. Як у той «Мімалётнай згадцы пра дождж на хутары»:

Праз небасхілы шпарыў дождж.
Закасваў ходам калашыны.
Стаялі ў пырсках басанож
Чарэшні, вішні і машыны.
………………………………..
Нататнік свой сабе падоўж.
Дапамажы ласкава, Божа,
Як дапамог аднойчы дождж,
Бо хто нам болей дапаможа?

У Вольгі Гронскай своеасаблівая «віртуальная» паэзія раптоўна спуджанай душы, нібыта чытач заспеў яе за гэтым творчым працэсам. І слова-сэнсы ў яе вершах, мажліва, з гэтай прычыны вычуваюцца датклівымі і вінавата-разняволенымі, быццам выпадкова выпаўшыя ў рэальны свет з выслізнуўшага з рук планшэта… Таўталагічна кажучы, вершы В. Гронскай спадабаліся мне сваім своеасаблівым непадабенствам да іншых.

І вось ты руйнуеш сваю Бастылію,
ператвараешся ў ведзьму…
Навокал неба і ціш.
Ты завеш спадарожны вецер,
распростваеш рукі-крылы,
адштурхоўваешся
і
ляціш.

Прабачаюся, але мая жонка, падзівіўшыся на фотаздымак Алеся Камоцкага, што пададзены да яго часопіснай публікацыі, сказала: «Не верыцца, што Алесь дажыўся да сівізны…» Аднак, пачытаўшы яго творы, я зразумеў, што вядомы бард і паэт насамрэч даволі густа аброс жыццём… Мудрасць і досвед, вынесеныя з пражытага ім часу, ён пазначае ў сваіх вершах запамінальнымі душэўнымі метамі. Бард цалкам прыстасаваўся да неад'емнай прысутнасці філасофа ў сваім светаіснаванні.

Там, дзе калісьці было каханне,
Мой шлях працягу знайсці
не змог,
У неадольны палон пытанняў
Жыццё вяртала з любых дарог.

Вершы Вольгі Чайкоўскай аздобленыя тэхнакратычным сілкаваннем, ім бракуе ўнутранай музыкі і патаемнага шарму. Зрэшты, яе паэтыка палягае не ў пошуках, а ў пожадзе адкрыццяў. Выклік «Эўрыка!» мог бы быць яе своеасаблівым дэвізам ці эпіграфам. Словам, займальная творчасць. Чытаць было цікава. І спадзеў быў на нешта такое:

Не будаваць ілюзій.
Не калыхаць паветра.
Мінімум маскараду.
Максімум забыцця.

Вершаваныя тэксты Уладзі Лянкевіча, як кажуць, «да ведама» альбо «напісаныя на палях» белліта… Талент адчуваецца. Як і своеасаблівасць — больш і менш удалыя — спробы аўтара выйсці за межы вядомых паэтычных форм, стылістыкі і… зместу… Так, адметныя і заўважныя спробы ёсць, аднак, на мой пагляд, само выйсце пакуль не знойдзена… Як любіў казаць у падобных выпадках Міхась Лынькоў: «Дзярзай, юнота!» І тады не спатрэбіцца самаапраўданні тыпу: «гэта не песня а толькі прадмова» .

У рубрыцы «Дэбют» змешчаны вершы Уладзіміра Дрындрожыка. Натура, безумоўна, арыгінальная.

Жыццё ідзе далей, далей, далей…
У глыбіню зацягваюць вершы, —

піша ён. Але толькі тады, калі яны будуць «зацягваць» чытача, а не толькі самога аўтара, яго творчасць не станецца марнай. Паўтараю прапісныя ісціны, ды іншага сказаць не маю. У маладога паэта яшчэ ёсць час для творчых высілкаў, бо адоранасць заўважная.

Друкуюцца таксама вершы Леаніда Галубовіча. Але тут я перадаю крытычнае пяро ў рукі Лянкевіча і Дрындрожыка…

З прозы найбольшую ўвагу чытачоў прыцягвае аповесць Андрэя Федарэнкі «Дзядзька Адольф». Яна здаецца настолькі простай, нібыта напісана ў адзін прысест, без усякіх высілкаў аўтара. Чытаецца таксама адным заходам і займае нечаканымі намёкамі-асацыяцыямі, у якіх чытач міжволі пазнае ці то свае рысы характару і некаторыя ўласныя жыццёвыя ўчынкі, ці то сваіх блізкіх і знаёмых. Менавіта гэта неўзамет чапляе і прывязвае да сюжэтнай лініі. Ды і нядаўні наш час і чалавек у ім (найперш, галоўны герой) выпісаны амаль натуральна, можна нават сказаць — у тон тэксту, фатаграфічна, як на акварэльках яго героя, прататыпам якога з'яўляецца, помны шмат якімі літаратарамі, колішні рэдактар тоўстага літаратурнага часопіса, пісьменік Адольф В. Аповесць створана ў манеры неарэалізму. Асобны падтэкставы націск робіцца на тым, што людзям, каб жыць, не кажучы ўжо, каб жыць шчасліва, трэба любіць і трымацца адзін аднаго. Аднак чаго варты асноўны рэфрэн аповесці, вызначальны для маральнага і духоўнага стану сучаснага чалавека ў грамадстве. Галоўны герой некалькі разоў пытаецца ў свайго пляменніка пра лёс яго малодшага брата, які прапаў у лесе: «— Лёніка знайшлі? — А хто яго шукаў? А так усё добра, вы не хвалюйцеся, дзядзя…»

Глыбокі талент А. Федарэнкі ў нашай літаратуры — пэўны і відавочны, як ні ў кога іншага. Адпаведна і на адсутнасць чытача яму грэх жаліцца.

Калі за тэкстам А. Федарэнкі — шчырым і натуральным — ідзеш, як араты за плугам — роўна і ўпэўнена, то тэксты Віктара Казько — гэта самабытнае стылістычнае ткацтва. (Дарэчы, нават калі тэматычна параўнаць іх «грыбныя» публікацыі — даўні Андрэеў («З кошыкам…») і гэты Віктараў («Ён у мяне адзіны запаветны»), то адразу заўважыш у абодвух адно нязменнае — гэта вялікую пранікнёную любоў да роднай беларускай прыроды і, як выснову з гэтага, захопленасць і спробу разгадкі прыроды самога чалавека. Найбольш уразіла філасофская прыпавесць «Вечны покліч вады». Раю пачытаць, стрымана перападольваючы і пераглядаючы ўсе сімвалічна-ўзорныя карункі змысленага сэнсу нашага сённяшняга зямнога жыцця…

Абразкі Лідзіі Арабей сціслыя і праставатыя, але падчас вельмі глыбокія. На першапачатку я да іх ставіўся як да нейкіх шараговых дзённікавых занатовак, аднак з часам пачаў заўважаць, што за тэкставай і стылістычнай лапідарнасцю хаваецца даволі ёмкі падтэкст. Так, Л. Арабей піша штодзённае жыццё, якое неўзамет сыходзіць з-пад ног… У нязмушанай прастаце яе мініяцюрных запісаў ёсць філасофія яе ўласнага вялікага вопыту жыцця і нацыянальнага лёсу яе народа. Бо, агулам, «жыццё вельмі кароткае, але каб зразумець гэта, трэба дажыць да старасці».

Калі В. Супрунчук шчыра і наўпрост падае нам неадназначную сярмяжнасць беларускага менталітэту, то Павал Касцюкевіч — гулліва-іранічна выстаўляе на паверхню тыя характэрныя рысы сучаснага збеларушанага яўрэйства, якія зазвычай прынята хаваць пад спудам. Чытанне яго сямейнай сагі «План Бабарозы» з рамана «Polissia Is Not Belarus», уласна для мяне, было даволі захапляльным і цікавым (гэтаму спрыялі выбітная мова і, прабачаюся, шабутны жулікаваты стыль). Праўда, як мне падалося, аднастайнасць падобнага стылю і перанасычанасць іроніі трохі спрашчаюць самую ідэю твора (зрэшты, мы знаёмімся толькі з часткай невядомага нам цэлага). П. Касцюкевіч піша: «…у мінскіх мінаках я не бачыў намёку на героя. Нягеглая хада, каструбаватыя жэсты. Шапялявая трасянка, якая, здаецца, толькі для таго і прыдуманая, каб абслугоўваць ніжэйшыя патрэбы свайго носьбіта.» Пазней, праўда, аўтар прызнаецца:«Каторым разам мяне сілком заганялі на тонкі лёд нацыянальнага пытання, аднак выгляду я не падаў…»

Вышэй упомнены Віктар Супрунчук у сваіх аповедах, напісаных у традыцыйнай форме, «выкрывае» прыглушаную глыбока ўнутраную нацыянальную ментальнасць беларусаў: памяркоўнасць, злагаду, абыякавасць да ладу таго грамадскага жыцця, які атачае іх абасобленае запалошна-ўтравелае чалавечае існаванне. Проза і яе тэматыка не новыя для нашай літаратуры, але няблага змайстраваныя датычна стылю і сюжэту.

Змястоўныя эсэ-экскурсы па цэнтры нашай сталіцы напрыканцы XX стагоддзя прапануе чытачам Усевалад Сцебурака. Эмацыянальсць і метафарычнасць тэксту набліжае яго да мастацкай прозы…

Тых, хто хоча ўпэўніцца, што Тарас Шаўчэнка не толькі геніяльны паэт Украіны, але і яго вялікі мастак і празорлівы празаік, раю пачытаць у перакладзе Валеры Стралко ўрывак з аповесці «Мастак» сусветна вядомага Кабзара.

У рубрыцы «Спадчына» выдрукавана абсяжная гутарка на тэмы беларускага літаратурнага і нацыянальнага жыцця, якая не так адкрывае вочы на новы гістарычны досвед з дваццацігадовай аддаленасці ў часе, як пашырае і паглыбляе наш погляд на творчасць і грамадзянскія ідэалы вядомага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча Барыса Сачанкі. Гэты цікавы запіс, зроблены яшчэ ў 1990 годзе, нарэшце выцягнуў з шуфляды і прапанаваў часопісу літаратар і суразмоўца Барыса Іванавіча Зіновій Прыгодзіч.

Да стагадовага юбілею вядомага эміграцыйнага пісьменніка і паэта Масея Сяднёва друкуецца арыгінальны артыкул Алеся Пашкевіча «Той дзень надышоў» (пра духоўны ўніверсум прозы літаратара). Тэкст годны добрай памяці і ўшанавання адметнага таленту нашага суайчынніка.

У крытычным раздзеле часопіса Ірына Шаўлякова-Барзенка разважае пра «авантуры тутэйшасці ў найноўшай беларускай літаратуры». Мяркую, што некаторыя з літаратараў сябе там пазнаюць.

Старэйшына літаратуразнаўчага цэху Эмануіл Іофе скрупулёзна рэцэнзуе знакавую кнігу Тымаці Снайдэра «Крывавыя землі. Еўропа паміж Гітлерам і Сталіным».

Рубрыка «Дзеяпіс» падае пашыраныя анатацыі новых кніг, што пабачылі свет апошнім часам.

Няма сумненняў, што кожны знойдзе ў чарговым нумары «Дзеяслова» чытанне па гусце. Таму, спадарства, на паўны час адліпнем ад клавіятуры і прысохнем да часопісных старонак.

РОЗГАЛАС

СТРАСЦІ ПА ХОЛМСУ

Суд у ЗША адмовіў фонду спадчыны пісьменніка Артура Конан Дойла ва ўладанні правамі на вобразы герояў дэтэктыўных апавяданняў Шэрлака Холмса і доктара Ватсана, паведаміла «Agence France-Presse».

Прадстаўнікі фонда раней неаднаразова патрабавалі адлічэнняў за выкарыстанне вобразаў Холмса і Ватсана на тэрыторыі ЗША на падставе таго, што спадчынніца пісьменніка Джын Конан Дойл у 1981 годзе зарэгістравала правы на апошнія 12 апаведаў пра дэтэктыва з кнігі «Архівы Шэрлака Холмса». За год да гэтага творы Конан Дойла сталі грамадскім здабыткам у адпаведнасці з заканадаўствам Вялікабрытаніі (па заканчэнні 50 гадоў ад смерці аўтара).

Паводле рашэння суда, патрабаванні фонда былі неабгрунтаванымі, бо ў творах, правамі на якія валодала Джын Конан Дойл, выкарыстоўваўся той жа самы вобраз дэтэктыва і яго кампаньёна, што і ў іншых аповедах і раманах пра Холмса. Такім чынам, суд пастанавіў, што аўтарскае права абараняе ў ЗША толькі сюжэтныя дэталі апавяданняў, а не вобразы Холмса і Ватсана.

З позвай у суд супраць фонда спадчыны Конан Дойла звярнуўся юрыст і пісьменнік Леслі Клінгер, ад якога раней спадчыннікі пісьменніка запатрабавалі адлічэнняў за выкарыстанне вобраза Холмса ў яго кнізе.

УКРАІНСКІЯ ПРАЦЯГІ «ЯЎГЕНІЯ АНЕГІНА» І «ЦІХАГА ДОНА»

74-гадовы пісьменнік з Крыма Эдуард Абрамаў напісаў працягі «Яўгенія Анегіна» і «Ціхага Дона».

Па словах аўтара, хоць кнігі і выдаюцца невялікімі накладамі, аднак свайго чытача знаходзяць.

Нагодай для стварэння працягу «Яўгенія Анегіна» паслужыў сон пісьменніка: Абрамаў распавёў, што Пушкін у тым сне падказаў аўтару працягнуць сваё знакамітае тварэнне. У варыянце крымскага літаратара Анегін злучаны з дзекабрыстамі і высылае Таццяне ліст (у якім кажа, што яны не змогуць быць разам).

Трэці том «Ціхага Дона» Э. Абрамаў пабудаваў на задумцы самога Міхаіла Шолахава. Адпаведны артыкул ён знайшоў у нумары газеты «Вести», выдадзеным у 1935 годзе. Акрамя таго, падчас працы над кнігай «суаўтар» меў зносіны з дачкой савецкага класіка Святланай.

Эксперты адзначаюць, што стварэнне працягаў да кніг не з'яўляецца парушэннем аўтарскіх правоў. Па меркаванні крытыкаў, творы Эдуарда Абрамава заслугоўваюць увагі, аднак наўрад ці будуць шырока запатрабаванымі.

ЗВАЛЬНЕННЕ ЗА НАБОКАВА І ЯСЕНІНА

Курбангалі Шарыпаў, старшы памочнік пракурора Стаўрапольскага краю, быў звольнены за каментары наконт кніг Набокава, Ясеніна і шэрагу іншых пісьменнікаў у школах.

Адпаведную інфармацыю распаўсюдзілі расійскія СМІ, а таксама шэраг службоўцаў, у прыватнасці, Аляксандр Хлапонін, паўнамоцны прадстаўнік прэзідэнта РФ у Паўночна-Каўказскай федэральнай акрузе.

Па паведамленні пракуратуры Стаўраполля, К. Шарыпаў сваімі дзеяннямі парушыў адразу два загады генеральнай пракуратуры РФ — «Пра арганізацыю пракурорскага нагляду за выкананнем законаў» і «Пра ўзаемадзеянне органаў пракуратуры са сродкамі масавай інфармацыі». Пракуратура раней таксама апублікавала афіцыйную заяву пра тое, што праверкі кніг, якія нібы падлягаюць вынятку, не праводзілася, таму словы К. Шарыпава з'яўляюцца выключна прыватным меркаваннем.

Заява пра абмежаванне школьнікам доступу да твораў Набокава, Ясеніна і шэрагу іншых аўтараў была агучана К. Шарыпавым 20 лістапада мінулага года. Экс-памочнік пракурора тлумачыў, што некаторыя з кніг, якія ўключаны ў школьную праграму і маюцца ў бібліятэках навучальных устаноў, з'яўляюцца «хуліганскімі», утрымліваюць элементы эротыкі і містыкі.

«ЛАДА НІВА» ЯК ПЕРСАНАЖ

«Лада Ніва» натхніла нямецкага пісьменніка на стварэнне кнігі.

Па меркаванні Йорга Райхле, нямецкага празаіка і журналіста, дызайн легенды савецкага аўтамабільна экспарту, «Лада Ніва», нагадвае абутковую скрынку — машына такая ж лаканічная і вуглаватая. З 1976 года яе экстэр'ер не зведаў зменаў, што здаецца ў наш час фантастыкай, бо канцэпты новых аўто вядомых сусветных брэндаў састарваюцца ўжо праз некалькі месяцаў.

Літаратурны помнік «Ніве» Райхле «ўзвёў» у сваім рамане «Чык» — кніга распавядае пра 14-гадовага расійскага падлетка, які, эміграваўшы разам з бацькамі з Расіі ў Нямеччыну, адпраўляецца на пошукі прыгодаў на блакітнай «Ніве», якую крадзе ў суседа. Сапраўднае яго ў вандроўцы аднакласнік-немец; хлопцаў ніколькі не бянтэжаць ні год выпуску аўто, ні яго нікчэмны выгляд, ні нізкая магутнасць рухавіка (бо калі вабіць воля, усё гэта не мае ніякага значэння).

Па словах крытыкаў, да апісання «Нівы» аўтар падыходзіць з не меншай сур'ёзнасцю, чым пры апісанні жывых персанажаў; аўто — паўнавартасны дзейсны герой кнігі. «Усё ў «Ніве» выглядае так, быццам любы расійскі вясковы каваль без праблем паправіць яе сярпом і молатам», — піша Райхле, аднак адзначае, што галоўная якасць «Нівы» — «нязломная» здольнасць пераадольваць бездараж, уключаючы значныя выбоіны і водныя перашкоды.

СПАДЧЫННІКАЎ ЧЫНГІЗА АЙТМАТАВА ВЫСЯЛІЛІ З ПЕРАДЗЕЛКІНА

Спадчыннікаў Чынгіза Айтматава высялілі з дачы пісьменніка ў Перадзелкіна, паведаміў «Інтэрфакс».

Рашэнне пра высяленне было прынята Віднаўскім гарадскім судом Маскоўскай вобласці.

Сын пісьменніка Санджар Айтматаў і Л. В. Сямёнава займалі памяшканне, якое з'яўляецца ўласнасцю Міжнароднага Літаратурнага фонда. Спадчыннікі Айтматава падалі скаргу і заяўлялі, што маюць намер зрабіць у гэтым доме музей пісьменніка.

Меркавалася, што музей можа адкрыцца да 85-годдзя з дня нараджэння Чынгіза Айтматава, гэта значыць у 2013-м. У доме ў мястэчку пісьменнікаў Айтматаў жыў з 1988 года да смерці ў 2008-м.

У пісьменніцкім мястэчку ў Перадзелкіна таксама калісьці пражывалі Барыс Пастарнак, Леў Касіль, Ісаак Бабель, Ілля Ільф, Яўгеній Пятроў, Андрэй Вазнясенскі, Булат Акуджава, Валянцін Катаеў, Бэла Ахмадуліна, Яўгеній Еўтушэнка і Карней Чукоўскі. У наш час у мястэчку дзейнічаюць дамы-музеі Пастарнака, Чукоўскага і Акуджавы, а таксама галерэя-музей Еўтушэнкі.

ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

ІНСТЫТУТ ПУШКІНА

Для папулярызацыі расійскай мовы ў свеце ствараецца Інстытут Пушкіна. Заахвочваць вывучэнне расійскай мовы ў свеце будзе Міністэрства адукацыі Расіі — з 2014 года яно плануе арганізоўваць адукацыйныя праграмы ў буйных гарадах замежжа пад брэндам Інстытута Пушкіна.

ЧАЧЭНСКАЯ ЛІТАРАТУРА

За апошнія тры гады ў Чачні было выдадзена больш за 70 кніг мясцовых аўтараў агульным накладам каля 250 тысячаў асобнікаў. Такой колькасці кніг чачэнскіх аўтараў і такім вялікім накладам не было выдадзена за ўвесь савецкі перыяд. Да канца года плануецца надрукаваць яшчэ каля 20 кніг чачэнскіх аўтараў. Выдаюцца пераважна маладыя.

ЛІТПРЭМІІ

КНІГА ГОДА БРЫТАНІІ

Лепшай кнігай года па версіі брытанскай прэміі «Specsavers National Book Awards» стаў раман Ніла Дэвіда Джона Геймана «Акіян у канцы дарогі» («The Ocean at the End of the Lane»). Аб гэтым паведамляецца на сайце прэміі.



Раман Н. Геймана перамог у адкрытым інтэрнэт-галасаванні. «Акіян у канцы дарогі», як паведамляецца, істотна адарваўся па колькасці галасоў ад канкурэнтаў — твораў Малалы Юсуфзай, Роберта Харыса, Кейт Аткінсан і аўтара дзіцячых кніг Дэвіда Уолліамса.

Н. Геймана раней прызналі першым у катэгорыі «Лепшая аўдыёкніга года» (аўдыёверсію рамана ён запісаў сам).

Кароткі спіс аўтараў у кожнай з намінацый «Specsavers National Book Awards» штогод адбіраюць 50 экспертаў у галіне кнігавыдавецтва, прадстаўнікоў кнігагандлёвых сетак і літаратурнай крытыкі. Пераможцаў у асобных катэгорыях выбіраюць галасаваннем 750 акадэмікаў прэміі.

У 2012 годзе лепшай кнігай года па версіі «Specsavers National Book Awards» быў названы раман Э. Л. Джэймс «50 адценняў шэрага». «Акіян у канцы дарогі» — апошні раман Геймана, які выйшаў у 2013-м. Гэта гісторыя самотнага «кніжнага» хлопчыка, імя якога чытач так і не даведаецца, але ў якім беспамылкова адгадваюцца рысы самога Ніла Геймана.

ПУЦІН І ЎЗНАГАРОДЫ

Уладзімір Пуцін падпісаў указ пра заснаванне трох прэмій (па 2,5 мільёна рублёў кожная) у галіне літаратуры і мастацтва за творы для дзяцей і юнацтва.

Прэміі прысуджаюцца за «значны ўнёсак у грамадзянска-патрыятычнае, этычнае і культурна-эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення, развіццё айчыннай культуры ў мэтах стымулявання далейшай дзейнасці лаўрэатаў прэміі, стварэння спрыяльных умоў для новых творчых дасягненняў».

ГРАНІНУ — 95!

Вядомы расійскі пісьменнік Данііл Гранін стаў лаўрэатам прэміі «Лепшы замежны раман XXI стагоддзя», якая штогод уручаецца ў Кітаі з 2002 года, за раман «Мой лейтэнант».



Разам з ім былі ўзнагароджаны яшчэ чатыры пісьменнікі з Нямеччыны, Францыі, Італіі і Гватэмалы. Прэмія заснаваная найбуйнейшым кітайскім выдавецтвам «Жэньмінь вэньсюе чубаньшэ» і Кітайскім таварыствам па вывучэнні замежнай літаратуры.

1 студзеня Д. Гранін адзначыў свой 95-гадовы юбілей. Павіншаваць аўтара са святам у Пецярбург прыехаў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін — у новую падораную пісьменніку кватэру на Васільеўскім востраве. Прэзідэнт уручыў Д. Граніну ордэн Аляксандра Неўскага і карціну з зімнім пейзажам, якая ўпрыгожыць кабінет пісьменніка.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by